Аліна Ваўранюк

# БЛІЗКІЯ СЛОВЫ

Падручнік па беларускай мове
для 5 класа
пачатковай школы

**BLIZKIJA SŁOWY**

Podręcznik do nauki języka białoruskiego
dla kl. 5 szkoły podstawowej

**Opracowała**
Alina Wawrzeniuk

**Okładka i zdjęcia**
Adam Pawłowski

**Ilustracje**
vecteezy.com

**Redaktor techniczny**
Adam Pawłowski

Podręcznik dopuszczony do użytku szkolnego przez ministra właściwego do spraw oświaty i wychowania i wpisany do wykazu podręczników przeznaczonych do kształcenia ogólnego dla mniejszości narodowych i etnicznych oraz społeczności posługującej się językiem regionalnym do nauczania języka białoruskiego na poziomie klasy V szkoły podstawowej na podstawie opinii rzeczoznawców

Numer ewidencyjny 1125/2/2022. Rok dopuszczenia 2022.
Podręcznik jest finansowany z budżetu państwa z części, której dysponentem jest minister właściwy do spraw oświaty i wychowania.

ISBN 978-83-964894-0-1

© Copyright by Stowarzyszenie „AB-BA”
Białystok 2022

**STOWARZYSZENIE NA RZECZ DZIECI**
**I MŁODZIEŻY UCZĄCYCH SIĘ JĘZYKA BIAŁORUSKIEGO „AB-BA”**
**15-459 Białystok, ul. Częstochowska 6a lok. 8**
**www.ab-ba.com.pl**

**Wydanie pierwsze**



# БЕРАЖЫ ПАДРУЧНІК.

- Не пэцкай яго, не пішы і не малюй на яго старонках.
- Не бяры бруднымі рукамі.
- Не загінай ражкі.
- Не кладзі ў падручнік аловак ці ручку.
- Адзень на яго вокладку.
- Памятай, па гэтым падручніку будуць вучыцца і іншыя вучні, яны таксама жадаюць мець прыгожы падручнік.

# Як карыстацца зместам?

## ЗМЕСТ

в – вершы

п – песні

г – граматыка

т – тэксты


Тэмы ... 5
в У нас хапае слоў такіх..., Юрась Свірка ... 7
т Таленты ў Краснагрудзе, Мі... ... 8
г Склад і націск ... 10
в ...стрэць можна вучня тако... ... 11
т Рыфмаванкі ... 12
т Заўважаная памылка, Вісарыён Гарбук ... 13
г Правапіс «ў» (нясклад... ... 16
т Змяніць хлопца, Міра... ... 17
в Сяброўства, Вік... ... 19
т Чырвон... буры верасе... ...нач ... 20
п ...ахне чабор, Пятрусь Броўка ... 22

Тэмы ... 23
т Восень, Янка Галубовіч ... 25
т Неслух, Алесь Якімовіч ... 26
г Звонкія і глухія з... ... 28
т Ка... К... ... 29
т Апрацоўка лы... ... 30
в Песні ткуцца, ... 31
т Ткацкія вырабы, Ганна Кандрацюк ... 33
т Адзенне і абутак, Ганна Кандрацюк ... 34
г Цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя зычныя ... 35
в Пяць пальцаў на руцэ, Віктар Швед ... 36
п Лянок ... 38

Тэмы ... 39
т Дзяды – беларускі народны абрад, Алесь Барскі ... 41
в Я на...дзіўся ... 43
в Беласточчы... ... 44
г Падоўжаныя ... 45
т Вывучайце гіс... ... 46
т Па колішніх слядах, Мікола Гайдук ... 48
г Прыстаўныя гукі ... 51

## Тэмы:

1. У нас хапае слоў такіх.
2. Нашы летнія канікулы.
3. Склад і націск.
4. Сустрэць можна вучня такога...
5. Рыфмаванкі.
6. Заўважаная памылка.
7. Правапіс «ў» (нескладовага).
8. Змяніць хлопца.
9. Сяброўства.
10. Верасень.
11. Песня «Пахне чабор».

У нас хапае слоў такіх
Чысцюткіх, ядраных, як ранне.
Яны выказваюць услых
Пяшчоту, ласку і каханне...

У нас хапае рэдкіх слоў,
І палюбі ты іх бязмежна,
Яны ад чысціні снягоў
І ад пялёсткаў беласнежных.

Яны ўвабралі звон крыніц,
Шум лесу і дыханне ночы...
Ад ліўняў і ад навальніц –
Грымяць, іскрацца і шапочуць.

Журыцца ўмеюць і звінець,
Спяваць у шумным карагодзе.
Іх трэба сэрцам разумець
І выслухоўваць у народзе.

**Юрась Свірка**

[!]

1. **Апішы настрой верша.**
2. **Як адносіцца паэт да роднай мовы?**
3. **З чым параўноўвае аўтар верша беларускую мову?**

## Таленты ў Краснагрудзе

«Толькі не зрабіце мне тут музей з пісьмовым сталом і асадкай Чэслава Мілаша», – сказаў паэт-набліст, калі адобрыў праект рэстаўрацыі сямейнага двара ў Краснагрудзе, у якім яшчэ да вайны праводзіў канікулы. А яго словы прыгадаў Мікалай Здрайкоўскі на заканчэнне летніка Аб'яднання АБ-БА. Яны былі добрай ілюстрацыяй галоўнай ідэі сёлетніх майстар-класаў беластоцкай моладзі, якая вывучае беларускую мову: як карыстацца традыцыяй дзеля камфортнай сучаснасці і светлай будучыні.

Вучыцца было ў каго, хаця сёлета летнік з цыкла «Я нарадзіўся тут» праходзіў далекавата ад тэрыторыі, на якой пражываюць беларусы, бо ажно ў Краснагрудзе, ля мяжы з Літвой. Можна было пераканацца як мясцовыя літоўцы дбаюць пра сваё, перш за ўсё пра мову. На іх свяце «Саскрыдзіс», ля возера Галадусь, як і ў больш



утульных умовах: у школе ў Сейнах ці Літоўскім доме культуры ў Пуньску. А ў Асяродку мастацтва, культур і народаў «Пагранічча» – пазнаёміцца з культурным багаццем Сейненскай зямлі, на якой пражывалі апрача палякаў і літоўцаў, рускія-стараверы, яўрэі, ромы. І пабачыць як з дапамогай тых рознакаляровых нітак таленавітыя творцы ткуць прыгожую вясёлкавую аснову, ці то літаратурную, ці музычную, ці фільмавую.

Паколькі ў летніку, якім апекаваліся Аліна Ваўранюк і Тамара Карнілюк, удзельнічалі выключна таленавітыя асобы, дык і сваю пабыўку апісалі з дапамогай мастацтва. Бацькі, якія прыехалі за сваімі дзяцьмі, з нецярпеннем чакалі, каб далучыцца да іх імправізаваных танцаў. Яны маглі таксама паглядзець карціны-калажы з дэталёва прадстаўленымі падзеямі кожнага дня летніка і майстэрскую вышыўку крыжыкам, паслухаць вершы Чэслава Мілаша ў перакладзе Андрэя Хадановіча і песні беларускай рэвалюцыі, на чале са славутымі «Мурамі». Не адна салёная сляза зрасіла бераг возера Галадусь, калі дзеці пад шэфствам Марысі Пякарскай праспявалі песню «Мама» з рэпертуару польскага гурта Дамовы Мелодыі. Дарэчы, адзін з сябраў гэтага трыа, Сташэк Чыжэўскі абводзіў групу па двары ў Краснагрудзе, які цяпер з'яўляецца Цэнтрам сустрэч (розных культур). І расказаў пра вуснае завяшчанне Мілаша, якое так запамяталася Колі Здрайкоўскаму.

«Гэта быў мой найлепшы летнік у жыцці», – коратка і адназначна ацаніў яго іншы ўдзельнік Віця Паўлоўскі.

Тыднёвік «Ніва», № 28, 11.07.2021

[?]

1. Дзе праходзіў летнік апісаны ў тэксце?
2. Што бачылі яго ўдзельнікі?
3. Чаму яны там навучыліся?
4. Дзе ты быў/была летам?
5. Што цікавага ты пабачыў/пабачыла ўлетку?
6. Якія кнігі ты прачытаў/прачытала за час канікулаў?

# Склад і націск

Словы дзелім на **склады**.

**У кожным складзе можа быць толькі адзін галосны гук.**

**У слове столькі складоў, колькі ў ім галосных гукаў.**

*шко-ла, а-лоў-кі, ву-ча-ні-ца, най-пры-га-жэй-шы*

Гукі **й**, **ў** не ўтвараюць складоў, таму яны называюцца нескла-довымі.

**Словы могуць быць** аднаскладовыя (*цень, дождж*), двухскладовыя (*кніж-ка, а-дзін*), трохскладовыя (*ву-чыц-ца, у-ро-кі*) і шматскладовыя (*пад-бя-ро-за-вік, рас-спя-ва-ны-я*).

Калі ў слове два і больш складоў, адзін з іх вымаўляецца мацней, з большай сілай, чым іншыя склады.

**Націск** – гэта вымаўленне аднаго са складоў слова з большай сілай голасу.

Склад пад націскам называем націскным, а ўсе астатнія склады ненаціскныя.

Ад таго, на які склад падае націск, можа мяняцца значэнне слова:

*пла́чу – плачу́, я́му – яму́, па́ра – пара́, му́ка – мука́.*

**1. Запішы словы з падзелам на склады:**

пайсці, настаўнік, васямнаццаць, ехаць, адзін, падляшскі, сшыткі, зазірнуць, апавядальнік, шматпавярховая, высакародны, фатаграфія, матэматычны, папера, жоўценькае, двухсотыя, б'ецца.

**2. Вызначы націск у словах:**

вярба, красавік, вясёлка, адзінаццаць, вінаваты, падручнікамі, драўляны, прыгожыя, гуляйце, пісьмовы, каляндар, настаўніца.

**3. Складзі і запішы сказы са словамі:**

ка́ра, кара́, ка́са, каса́, я́му, яму́.



Сустрэць можна вучня такога,
Што амаль не ўмее нічога,
А кажа: я ўсё разумею,
Не буду вучыцца, бо ўмею.
У кнігу заглянуць не хоча,
Таму што баляць быццам вочы,
Ды хваліцца толькі навокал
Што знае выдатна ўрокі.
Каб ведаць усё на выдатна,
Патрэбна вучыць акуратна,
За кнігу з ахвотаю брацца,
У веды ўсё больш паглыбляцца.
Каб гэтага вучням дабіцца,
Патрэбна вучыцца, вучыцца.
Не думай, мой дружа, ніколі,
Што ты навучыўся даволі,
Ды толькі за кнігі бярыся,
Вучыся, вучыся, вучыся.

**Віктар Швед**

1. **Апішы настрой верша.**
2. **Да чаго заклікае аўтар верша?**
3. **Раскажы пра свае адносіны да вучобы.**

Каб не быць слабым і хмурым,
не цурайся фізкультуры.

Часта мыцца – наша ўмова,
той, хто чысты, – той здаровы.

За сталом у нас заўжды
цішыня ў час яды.

Дзецям з працай трэба знацца,
памагаць бацькам у працы.

Песня з намі не разлучна,
падружыся з песняй гучнай!

Хочаш знаць усё і ўсіх –
сябрам будзь цікавых кніг!

[!]

1. Прачытай усе рыфмаванкі.
2. Да якіх сфер нашага жыцця яны адносяцца?
3. Складзі свае рыфмаванкі пра правілы паводзін у школе.

## Заўважаная памылка

Я рашаў задачы. Засталася адна. Думаў – так сабе, звычайная. Як ні біўся – не паддаецца.

З мукі спяклі хлеб. Па кілаграме буханка. Трэба даведацца, колькі атрымалася буханак, калі прыпёк склаў восьмую частку.

Варта мне было дайсці да слова «прыпёк», як успамінаўся пагорак, дзе я загараў на сонцы, калі да бабулі ў вёску ездзіў у госці.

Эх, каб зноў лета! Забрацца б на той самы пагорак, на самы прыпёк! Бабуля смяялася, што мяне дома ніхто не пазнае, такі чорны зрабіўся ад загару...

Пачуўся тэлефонны званок. Я схапіў трубку.



Санька, гэта ты?! Вось добра, што пазваніў. У цябе задача з прыпёкам атрымалася? Не? І ў мяне – не. Што? Да цябе? Лепш ты прыходзь.

Санька не прымусіў чакаць сябе.

Чытай задачу! – загадаў ён мне.

Ды я сто разоў чытаў.

– Ну, давай я. Значыцца, колькі атрымалася буханак, калі прыпёк... Эх, і люблю я гэты прыпёк... – Санька пракаўкнуў слінкі. – Калі мама пасылае мяне па хлеб, я па дарозе ўсю буханку аб'ем. Такія смачныя гэтыя падгарэлыя скарынкі! А нядаўна, – Санька засмяяўся, – прыехалі госці, я пабег у краму, усяго накупіў, а пра гасцей забыўся. Сеў сабе пад дрэвам і давай скарыначкі абломваць.

– І я іх люблю, – сказаў я. – Асабліва, калі добра падгарэлыя. Усё, што ў кухні падгарае, мне пакідаецца.



– Дык што ж такое прыпёк? – пачаў разважаць Санька. – Мабыць, добра падсмажаныя, падгарэлыя скарынкі... Значыцца згарэлая мука. А калі мука згарэла, уся яе вага ператварылася ў звычайны дым.

– І на адну восьмую частку зменшылася вага мукі, якая ў задачы, – падтрымаў я Саньку. – Усё проста. Хуценька падлічым.

– А ў падручніку ў адказе больш, – сказаў здзіўлены Санька.

– Што ж гэта такое? – спытаўся я.

– Нават, калі вялікі пень згарае, ад яго жменька попелу застаецца! – гарачыўся Санька. – Памятаеш у лагеры наша вогнішча?

Я моўчкі кіўнуў:

– Можа, памылка?

– Відавочна памылка! – ускочыў Санька. – І не проста памылка, а заўважная памылка...

– А што, калі мы напішам у выдавецтва пісьмо? – спытаўся Санька.

– Абавязкова напішам! – усклікнуў я. – Так і пачнём: «Заўважная памылка».

– І нам проста ў школу з самога выдавецтва падзяку прышлюць! – узрадаваўся Санька.

– Вось гэта будзе здорава!

Санька пайшоў дамоў, а я сеў і задумаўся: «А раптам гэта не памылка?»

Дык што – тады?

Вісарыён Гарбук

[?]

1. **Чаму хлопчыкі не маглі рашыць задачу?**
2. **Што займала думкі галоўнага героя?**
3. **Чаму і ў Санькі не атрымалася задача?**
4. **Прыдумай працяг апавядання.**

# Правапіс «ў» (нескладовага)

**Літара ў (нескладовае) пішацца пасля галосных у пачатку, сярэдзіне і ў канцы слова.**

**1. Знайдзі ў тэксце словы з ў (нескладовым). Растлумач іх правапіс.**

**2. Запішы сказы. У пустыя месцы ўпішы у або ў.**

...ладзімір за...сёды многа працава... . Яго пакой бы... ак...ратна прыбраны. ...се рэчы пакіда... на сваіх месцах. Сябро...кі здзі...-ляліся, бо хлапч...к на ...сё знаходзі... час. Чыта... шмат кніг, займа...-ся спортам (г...ля... ... ф...тбол, плава...) і дапамага... іншым в...чням ... нав...цы.

**3. Запішы словы паводле ўзору:**

наліў – наліла
выпіў – ...........
чакаў – ...........
зрабіў – ..........
любіў – ...........
крычаў – .........

сядзела – сядзеў
вучыла – ..............
спявала – .............
наведала – ...........
глядзела – ............
хварэла – ...............

**4. Змяні словы так, каб яны адказвалі на пытанне што рабіў?**

снеданне – .......................................
вяртанне – ........................................
прывітанне – ......................................
спазненне – ..........................................
жаданне – ............................................
спатканне – .........................................
апавяданне – .......................................

# Змяніць хлопца

– Не ведаю, што рабіць з гэтым Радзікам, – прызналася Гражынка, нібы самой, а папраўдзе Граку, які заглядаў з пляча дзяўчынкі на здымак, у які яна ўзіралася.

– А каторы гэта? – на здымку быў увесь пяты клас.

– А вось гэты, – паднесла Гражынка здымак бліжэй Граку пад дзюбу.

– Магла б прынесці больш выразны.

На здымку ў першым радзе, на шэрым канцы, сядзеў таўставаценькі мілавідны хлопчык у белым швэдрыку. Іншыя дзеці апрануліся страката, на блузах віднелі разнамоўныя надпісы, часткова Граку незразумелыя. Нават Гражынка была ў моднай блузцы з рэкламай нейкага віду спорту.

– Вам шмат плацяць за рэкламу? – спытаўся Грак. – Выгляда-



еце ўсе як плот на стадыёне, вочы разбягаюцца. Дарам жа так не абвешваюцца людзі... А гэты твой Радзік, бедны, увесь у беленькім. Цяжка не запэцкацца. Ты прыязджаеш са школы, бывае, як папялушка. Мабыць, для здымка так светла-святочна апрануўся гэты хлопчык?

– А вось і не! Ён заўжды такі беленькі. І як нежывы на перапынках стаіць пад сцяной... Такі акуратненькі.

– Што ж ты хочаш з ім рабіць, пытаюся? Можаш толькі прыклад узяць, каб менш мыцця дома было. Я ўсё ў чорным лятаю, а месцамі пэцкаюся. Спадар Шадар хоць вымываецца лапкай, вылізваецца. І мне прыдалося б не толькі прачэсвацца дзюбай, хочацца пакупацца ў чыстым пясочку...

– Вось, як мне гэтага Радзіка разварушыць. І падысці неяк баюся, а ён усё нейкі пераляканы на мяне спазірае...

– І так ужо пяты год разважаеш, як падчапіць аднакласніка?

– Ды не, ён нядаўна прыехаў у мястэчка з бацькамі. Першы год з намі вучыцца. Невядома, чым ён цікавіцца... Нейкі асавелы сядзіць на ўроках...

– Можа, хворы? А можа такі зацюканы? Апрануць у белае чалавека, і не дрыгнеш!.. А можа ён цікавіцца арніталогіяй? Раскажы яму пра мяне, прывядзі дахаты... Разам разварушым хлопца...

– Ён не даязджае, у мястэчку жыве...

– Эх, жыццё! – клацнуў дзюбаком Грак. – Адны трагедыі.

Міра Лукша

1. **Як выглядаў Радзік?**
2. **Чаму, паводле Грака, пяцікласнікі выглядалі як «плот на стадыёне»?**
3. **Ці можна і трэба змяніць гэтага хлопца?**
4. **Як ты любіш апранацца?**
5. **Як разумееш значэнне слова «трагедыя»? Знайдзі гэтае слова ў «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы».**

# Сяброўства

Сеў за партаю Стась Шпак,
Разам з ім Валодзя Вус.
Станіслаў – гэта паляк,
А Валодзя – беларус.

Быццам родныя браты
Парадніліся з сабой.
Іх дэвіз: пакрыўджан ты –
За цябе стаю сцяной...

**Віктар Швед**





[!]

1. Як разумееш словы: «за цябе стаю сцяной»? Да чаго заклікае аўтар верша?
2. Ці ў цябе ёсць сябры?
3. Хто твае сябры?
4. Колькі ім гадоў?
5. Дзе яны жыву ць?
6. Запішы іх імёны і прозвішчы.
7. Які павінен, павінна быць сапраўдны сябар/сяброўка?

# Чырвона-буры верасень прыходзіць...

Чырвона-буры верасень прыходзіць,
і з ім лістота ў парках карагодзіць.
Пунсовых пацалункаў мітусню
Я назіраю, як гульню агню.
Удзячны парк развітваецца з летам,
Ён увабраў цяпло святла і гэтым
Шчаслівы, выстаўляе свой нарад
На публікі захоплены агляд.
Як рознакаляровыя паштоўкі,
Як успаміны, нібы замалёўкі,
Яны прыемныя ў маіх вачах,
і доўга будуць сніцца па начах.
Кругазварот цяпла, святла, усмешак,
Вавёрцы з рук падораны арэшак,
Палітру фарбаў, як дзяцінства сны,
Я захаваю ў сэрцы да вясны.

Сяргей Махнач

[!]

1. Які агульны настрой верша?
2. Раскажы, як выглядае парк або лес у верасні.
3. Палітру якіх фарбаў захаваем да вясны?
4. Раскажы пра свае ўлюбёныя колеры.







Вывучы словы песні

Пятрусь Броўка

# Пахне чабор...

Хіба на вечар той можна забыцца?
...Сонца за борам жар-птушкай садзіцца,
Штосьці спявае пяшчотнае бор,
Пахне чабор, пахне чабор...

Лёгкія крокі на вузкай сцяжынцы.
Дзеўчына ў белай іскрыстай хусцінцы,
Быццам абсыпана промнямі зор.
Пахне чабор, пахне чабор...

Выйсці б насустрач, стаць і прызнацца.
Вось яно – блізкае, яснае шчасце,
Клікнуць хацелася – голас замёр.
Пахне чабор, пахне чабор...

Год адзінаццаць, а можа, дванаццаць
Сэрца баліць, што не здолеў спаткацца.
Сэрца нязменна хвалюе дакор.
Пахне чабор, пахне чабор...

Час той схаваўся за дальняй гарою,
Здасца хвілінай – яна прада мною...
Выйду. Гукаю. Маўклівы прастор.
Пахне чабор, пахне чабор...

## Тэмы:

1. Ідзе восень.
2. Звонкія і глухія зычныя.
3. Кастрычнік.
4. Лён.
5. Ткацкія вырабы.
6. Адзенне і абутак.
7. Цвёрдыя, мяккія
   і зацвярдзелыя зычныя.
8. Пяць пальцаў на руцэ.
9. Песня «Лянок».

# Восень

Адышло, адкрасавалася лета. І неяк нячутна, спадцішка падкралася восень. Спачатку непрыкметна, але з кожным днём усё спарней і гусцей кладуцца кругом яе фарбы-вясёлкі. Шалясціць жоўта-залацістым лісцем бяроз вецер, трапечуцца, бы дрыжаць са страху, агніста-чырвоныя макаўкі асін, зацвілі сінія, як лён, верасы. Зарудзеліся ярка-чырвоныя гронкі рабіны, пунсавеюць, гнуцца да долу галінкі спелай каліны.

Сцелюцца, ападаюць на зямлю аранжавыя, жоўтыя, чырвоныя, белыя пялёсткі апошніх асенніх кветак астраў і вяргінь. У празрыстым паветры плывуць, падсвечаныя блікамі сонца, срабрыстыя павуцінкі. Над рэчкаю і лагчынамі высцілаюцца, паўзуць сівыя табункі туману.

У такія пагодлівыя восеньскія дні ў лесе рэхам адгукаюцца галасы грыбнікоў. Там-сям сустракаюцца яшчэ грузды і махавікі, сыраежкі і масля́кі, зялёнкі і падзялёнкі, ваўнянкі і курачкі. Грыбы гэтай пары самыя чыстыя і ядраныя.

Але вось на небе паплылі да вусцішнасці чорныя, збэрсаныя ветрам хмары. Яны нізка паўзуць над будынкамі, і, здаецца, што неба яшчэ бліжэй падалося да зямлі. Бесперапынку, дзень за днём ідзе касы і халодны дождж. І не бачна яму канца.

На куцай макаўцы ліпы мокне сіратлівая буслянка, вецер рабаціць мутныя лужыны, гоніць па тратуары мокрае пачарнелае лісце.

Пройдзе некаторы час, і закружацца ў танцы лёгкія сняжынкі, а на падшэрхлы дол ляжа бела-бялюткі, як вата, першы снег.

Янка Галубовіч

1. **Знайдзі і прачытай прыкметы асенняга краявіду.**
2. **Якія колеры характэрныя для восені?**
3. **Намалюй восеньскі пейзаж згодна з тэкстам.**

# Неслух (Казка)

На агародзе, за старым плотам, жылі Сланечнік, Кроп і Цыбуля. Памыюцца, бывала, расою, з цёплым сонейкам павітаюцца і пачынаюць адзін аднаму розныя гісторыі расказваць. І пра тое, як сюды, на агарод, трапілі, і пра тое, як з зямлі выраслі, падымаліся.

Прачнуліся аднойчы рана-раненька, і высокі Сланечнік усклікнуў: А ў нас новы сусед!

Прыгледзеліся Кроп і Цыбуля: сапраўды, ляжыць каля плота штосьці кругленькае, зялёнае, паласатае.

Мячык гэта, – расчаравана прамовіла Цыбуля.

– І праўда, – падтрымаў яе Кроп. – Відаць, суседская дзяўчынка забылася.

– Давайце спытаемся, мячык ён ці не, – прапанаваў Сланечнік і, сагнуўшыся ў паклоне, прывітаўся: – Добры дзень, сусед. Як цябе завуць?

– Гарбуз, – нясмела адказаў той.

– Чаго  ты хаваешся? Да нас ідзі, – паклікала Цыбуля.



– Баюся, – ледзь чутна прамовіў Гарбуз.

Ён быў яшчэ малы і таму ўсяго на свеце баяўся: сярдзітай пчалы, і калючага асоту, і нават звычайнага матыля.

– Які ён паласаценькі! – усклікнуў у захапленні Сланечнік.

– Які ён кругленькі! – дадаў Кроп.

– Якое ў яго прыгожае імя! – сказала Цыбуля.

Хваляць Сланечнік, Кроп і Цыбуля новага суседа, не нацешацца ім. А ён слухае ды гонару набіраецца.

Асмялеў і закрычаў:

– Я самы спрытны, я самы дужы! Я на плот магу залезці!

– Навошта на плот лезці? – дзівіцца Сланечнік. – Няўжо табе з намі сумна?

– Разаб'ешся, – папярэджвае Кроп. – Хіба ж не бачыш, што ў плоце слупы струхлелыя?

Гарбуз і слухаць не хоча. Ад гонару як на дражджах расце. Учапіўся хвосцікам за плот і карабкаецца ўверх.

– Куды ты? – крычыць Кроп.

– Злазь хутчэй, – просіць Цыбуля. – Упадзеш. Вунь які ты тоўсты!

Не слухае Гарбуз суседзяў, лезе на плот і хваліцца:

– Я ўсё магу. Я самы дужы, я самы спрытны!..

І тут падняўся моцны вецер, па агародзе памчаўся. Нахіліліся да зямлі Сланечнік, Кроп і Цыбуля, ад ветру схаваліся. Мінуў іх вецер, на плот наляцеў. Не вытрымалі струхлелыя слупы, паваліўся плот, а з ім – Гарбуз на зямлю грукнуўся. Ды так моцна, што адразу на кавалкі разляцеўся.

Алесь Якімовіч

[?]

1. **Прачытай, як расліны сустрэлі Гарбуза.**
2. **Ад чаго Гарбуз набраўся гонару?**
3. **Знайдзі ў тэксце словы, якімі Гарбуз выхваляўся.**
4. **Прачытай, як вецер разбіў Гарбуз.**
5. **Чаму з Гарбузом здарылася няшчасце?**

# Звонкія і глухія зычныя

**1. Прачытай словы: гарбуз, нож, агарод, хлеб, луг, дождж.**

**Звонкія зычныя б, г, д, дж, дз, ж, з, калі стаяць на канцы слова або перад глухімі зычнымі, вымаўляюцца як адпаведныя ім глухія. Гэта аглушэнне звонкіх зычных.**

**2. Запішы словы, устаўляючы адну з літар.**

б – п: скры...ка, гры...кі, ры...ка, слу..., сто..., ду... .
г – х: сме..., лё...ка, гаро..., лу..., трыво..., паро... .
д – т: пло..., мё..., палё..., зага...ка, пара...кі, сле... .
дж – ч: мя..., пе..., дож... .
дз – ц: Вало...ька, дзя...ька, мола...ь, ме...ь.
ж – ш: мы..., даро...ка, гру...ка, хру...ч, ро...кі, ду... .
з – с: ні...ка, вё..., нё..., лё..., гра...ь, про...ьба.

**Глухія зычныя перад звонкімі зычнымі ў сярэдзіне слова вымаўляюцца як звонкія. Гэта азванчэнне зычных.**

**3. Наступныя словы змяні так, каб пасля выдзеленых зычных стаяў галосны гук:**

хле**б** – хле**б**а
ні**з**кі – ..........
сало**д**кі – .........
лы**ж**ка – .......
кла**д**ка – ..........

голу**б** – .............
ка**з**ка – ...............
сце**ж**ка – ...........
ро**д** – ...................
ры**б**ка – ...............

# Кастрычнік

Трэ Кастрычнік лён, аж кастрыца ляціць стаўбом. Спяшаецца ён да замаразкаў кужаль выткаць і вопратку сабе пашыць. Пачулі пра замаразкі павучкі і напалохаліся.

– Ой, што нам рабіць? – пачалі бедаваць. – Змерзнем мы ў замаразкі, загінем без вопраткі.

І пайшлі павучкі да Кастрычніка, каб той навучыў іх ткаць кужаль.

– Добра, навучу, – згадзіўся Кастрычнік і даў кожнаму павучочку льну па снапочку.

– Перш-наперш гэты лянок трэба вымачыць, потым высушыць, затым пацерці... – навучаў ён павучкоў, – далей трэба лянок вытрапаць і вычасаць, кудзелечку скласці і танюсенька спрасці. Нітачкі тыя ў аснову на кросенкі навіць. Нарэшце нітачку ў чаўнок – і тчыце сабе кужалёк!

Падзякавалі павучкі Кастрычніку і ўзяліся за работу. Прадуць павучкі кужалёк, а што далей з ім рабіць, забыліся. Адны кажуць: «Трэба зноўку кужалёк мачыць!» Другія пярэчаць: «Трэба сушыць». Трэція крычаць: «Трэба часаць». А да ладу не могуць дайсці.

Так кожненькі год і спрачаюцца паміж сабою павучкі. Напрадуць нітачак, цягнуць іх па зямлі і не ведаюць, што далей з імі рабіць. І ляціць разам з маленькімі павучкамі над палямі беленькі кужалёк – бабіна лета.

Паглядзіце ў кастрычніку на палі, лугі, лясы... Колькі таго серабрыстага кужалю павучкі напралі!

Клаўдзія Каліна

1. **Як Кастрычнік вучыў павучкоў ткаць кужаль? Знайдзі і прачытай сказы.**
2. **Запішы, што па чарзе павінны рабіць павучкі.**

# Апрацоўка лёну

Валакно лёну служыла асноўнай сыравінай для вырабу тканін. Для атрымання валакна саломку рассцілалі на лузе або на пожні. Пры дажджлівым надвор'і саломка вылежвала 3–4 тыдні, пры сухім – 5–6. Гатовую трасту звязвалі ў кулі, сушылі над вогнішчам, на печы, прачом выбівалі зярняты.

У кастрычніку лён мялі, трапалі, часалі. Атрыманы кужаль пралі і рыхтавалі для ткання: бялілі або фарбавалі. У сакавіку ў хату прыносілі кросны.

Ганна Кандрацюк



# Песні ткуцца

Не на фабрыцы дзесьці,
А ў вясковым закутку
Песні ў колерах ткуцца,
Глянеш – вачэй не адвесці.

Лішняе ноты ніводнай,
Свеціцца ўток каляровы,
Нітка да ніткі – як словы
Ў старой песні народнай.

Колераў голас не ціхі,
І не любяць паўтораў
Аўтары песень-узораў,
Іх выканаўцы – ткачыхі.



Рукі шчыруюць звыкла,
Рукі чароўныя радуюць –
Узлятаюць і падаюць,
Быццам рукі музыкаў.

З думкаю аб караваі
Пояс для свата тчэцца, –
Кожная нітка смяецца,
Кожная нітка спявае.

Ткуцца шырокія, вузкія,
Ткуцца ў палосы і ў кветкі
Ручнікі і сурвэткі,
Дываны і абрусы...

Песня льецца праз кросны,
З хаты выводзіць нібыта –
У зялёнае жыта,
У бярозы ды ў сосны.

Мікола Маляўка

1. Апішы настрой верша.
2. Як разумееш словы: «Песні ў колерах ткуцца»?
3. Да чаго аўтар параўноўвае працэс ткацтва?
4. Назаві ткацкія вырабы з верша. Якія яны?

# Ткацкія вырабы

Сыравінай для ткацтва здаўна служылі лён, воўна, радзей пянька. Усе працэсы, звязаныя з апрацоўкай сыравіны і падрыхтоўкай яе да ткання, выконваліся ўручную, у хатніх умовах. Звычайна гэта была жаночая работа. Кужэльнае палатно ткалі для вырабу адзення. Тканіны для інтэр’ера былі больш разнастайнымі.

Асаблівай прыгажосцю вылучаліся ручнікі, абрусы, макаткі, дэкаратыўныя посцілкі.

Ганна Кандрацюк



ручнік

палавік

сурвэтка

макатка

дыван

абрус

# Адзенне і абутак

Адзенне з’яўляецца адным з найважнейшых складнікаў матэрыяльнай і духоўнай культуры народа і цесна звязана з умовамі яго жыцця.

У беларусаў асноўнай сыравінай для адзення былі валокны лёну, канопляў, скура і воўна жывёл.

На сваіх палосках сяляне вырошчвалі лён, каноплі і апрацоўвалі іх. Увесь працэс апрацоўкі сыравіны ад пачатковых стадый да вырабу гатовых прадметаў адзення праходзіў у хатніх умовах.

Абутак быў найчасцей самаробны.

Ганна Кандрацюк



жаночае адзенне

мужчынскае адзенне







валёнкі

лапці

кажух

# Цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя зычныя

Калісьці вельмі даўно ў сям’і галосных літар не было ніякага парадку. Кожнай галоснай хацелася пастаяць пасля ўсіх зычных. Па сакрэту кажучы, справа была ў тым, што ўсе галосныя лічылі сябе вельмі прыгожымі і надта ж любілі пакрасавацца. І таму яны ўвесь час бегалі, мітусіліся, сутыкаліся і нават набівалі сабе велізарныя гузы. А якая ўжо тут з гузамі прыгажосць!

– Не, трэба навесці парадак! – вырашылі галосныя, калі ў іх не засталося ўжо ніводнага ненабітага лба.

– Давайце мы будзем стаяць толькі пасля цвёрдых зычных, – сказалі **А, О, Ы, У, Э.**

– Добра. А мы – толькі пасля мяккіх, – пагадзіліся **Я, Е, Ё, І, Ю.**

**Пасля цвёрдых зычных А, О, Ы, У, Э.**

**Пасля мяккіх зычных Я, Е, Ё, І, Ю.**

Во, як добра атрымалася. І цяпер галосныя ніколі не перашкаджаюць адна адной і ніколі дарэмна не мітусяцца. Калі **Л,** напрыклад, цвёрды, дык за ім становіцца **А** і атрымліваецца **лапа.** А калі **Л** – мяккі, дык за ім становіцца **І** і атрымліваецца **ліпа**. Проста і хораша. І, галоўнае, ніякіх гузоў!

Аляксандр Тарасевіч

**1. Прачытай словы. Растлумач напісанне мяккага знака:**

Вольга, бацька, пальцы, камень, восьмы, рэдзька, плаваць, гуляць, соль.

**2. Прачытай словы. Назаві зацвярдзелыя зычныя:**

ураджай, жыхары, чэрвень, дажджы, шэпт, чужы, шоўк, цэмент, шэрсць, шаўковы, жыве, джала, ружа, рыжы, крыжы, крычалі, качка.

**3. Складзі сказы са словамі:**

рыс, рысь, кон, конь, мол, моль.

# Пяць пальцаў на руцэ

Пяць пальцаў мае Лена:
Найменшы той – мезены.
Другі – чарговы ў Лены –
Чамусьці безыменны.
А палец Лены трэці –
Сярэднім ён завецца.
Чацвёрты, натуральна,
Заўсёды ўказальны.
Пяты ў чарговым ліку
Завуць яго вялікім.

Віктар Швед

[!]

1. Прачытай назвы пальцаў.
2. Запішы назвы ў сшытку.
3. Растлумач з дапамогай «Фразеалагічнага слоўніка беларускай мовы» што значаць словазлучэнні:
   – божы палец,
   – на мезены палец,
   – палец аб палец не ўдарыць,
   – палец у рот не кладзі,
   – адзін як палец.



Вывучы словы песні

# Лянок

Ох і сеяла Ульяніца лянок,

Ох і сеяла Іванаўна лянок.

Прыпеў: Ох, сэрца лянок, мая радасць ты, лянок

Усё бялюсенькі кужалёк.

Ох палола Ульяніца лянок.

Ох палола Іванаўна лянок.

Прыпеў: Ох, сэрца лянок, мая радасць ты, лянок.

Ох і рвала Ульяніца лянок,

Ох і рвала Іванаўна лянок.

Прыпеў: Ох, сэрца лянок, мая радасць ты, лянок.

А сарваўшы у снапочкі ставіла х 2

Прыпеў: Ох, сэрца лянок, мая радасць ты, лянок.

Ох і слала Ульяніца лянок,

Ох і слала Іванаўна лянок.

Прыпеў: Ох, сэрца лянок, мая радасць ты, лянок.

Ох і прала Ульяніца лянок,

Ох і прала Іванаўна лянок.

Прыпеў: Ох, сэрца лянок, мая радасць ты, лянок.

Ох і ткала Ульяніца лянок.

Ох і ткала Іванаўна лянок.

Прыпеў: Ох, сэрца лянок, мая радасць ты, лянок.

А саткаўшы ды сарочак нашыла, а саткаўшы ды бялёных нашыла.

# Тэмы:

1. Дзяды.
2. Мы – беларусы.
3. Беласточчына.
4. Падоўжаныя зычныя.
5. Вывучайце гісторыю.
6. Па колішніх слядах.
7. Прыстаўныя гукі.
8. Мой родны горад.
9. Стылістычныя сродкі.
10. Беласток.
11. Песня «Родны мой горад».

# Дзяды – беларускі народны абрад

Ушанаванне памяці памерлых характарызавалася ў Беларусі тэрміналагічнай разнароднасцю: Задушны дзень, Задушкі, Памінальны дзень, Памінкі, Свята памерлых, Радуніца, Радаўніца, урэшце Дзяды. Дзяды з'яўляюцца найбольш распаўсюджаным тэрмінам на азначэнне ўрачыстасцей, звязаных з ушанаваннем памерлых.

Карані гэтага абраду, несумненна, звязаныя з паганскай мінуўшчынай. Істота Дзядоў вынікае з культу продкаў, які моцна распаўсюджаны ў традыцыі ўсіх славянскіх народаў.

Свята Дзяды можна падзяліць на царкоўна-могілкавы абрад і абрад сямейны. Царкоўна-могілкавы абрад рэалізуецца з удзелам святара. У ходзе царкоўнага набажэнства святар называе імёны тых памерлых, якія падаюць яму паасобныя прыхаджане. Пасля царкоўнага рытуалу святар альбо некалькі святароў накіроўваюцца на мясцовыя могілкі, дзе духоўныя затрымліваюцца пры кожнай магіле, спяваюць рэлігійныя песні і свецяць магілу. У тэкст гэтых песень уплятаюць імёны тых пакойнікаў, якія ляжаць у дадзеных магілах.



Сямейны рытуал Дзядоў больш свабодны і мае сельскі характар. Асабліва ў мінуўшчыне прытрымліваліся традыцыі. Цэлы рытуал складаўся з урачыстага пачастунку. У многіх раёнах Беларусі пасля пачастунку не прыбіралі стала і ўсё пакідалі на ім да наступнага дня. Вынікала гэта з перакanання, што памерлыя ноччу наведаюць хату і пачастуюцца ежай.

Традыцыя багатага стала ў дзень Дзядоў знайшла адлюстраванне ў беларускіх прыказках:

*Наеўся як на Дзяды,*
*Пацярпі без яды – пачакай на Дзяды,*
*На Дзяды многа яды.*

Беларускае насельніцтва ўсходняй Беласточчыны адзначала і адзначае дзень Дзядоў у розныя поры года: вясною, летам альбо восенню. Залежыць гэта ад традыцый у дадзеным царкоўным прыходзе.

У беларускім фальклоры ўсходняй Беласточчыны выступае многа фактаў, якія сведчаць пра тое, што ў вераваннях, звязаных з памерлымі, засталося вельмі многа паганскіх элементаў, якія перапляліся з хрысціянскімі і стварылі цікавую абрадавую мазаіку.

Дзяды – праява даўняга культу продкаў, які з'яўляецца сведчаннем прыгожага ўшанавання тых, хто пакінуў жыццё. Дзяды гэта свята, якому спадарожнічае задуменне над сэнсам чалавечага жыцця, рэфлексіўная кантэмпляцыя ды ўпарадкаванне магіл.

Мы зыдземся ў дзень Дзядоў адвечных,
Няхай ніхто з нас не астанецца галодны.
Палічым, хто душу зберог, а хто яе скалечыў.
Быць можа, можна і не жыць, але памерці – неабходна.

Алесь Барскі

[?]

1. **Калі святкуюць Дзяды?**
2. **У памяць каго святкуюць гэтае свята?**
3. **Калі і як святкуе памінальны дзень твая сям'я?**

# Я нарадзіўся беларусам



Я нарадзіўся беларусам,
Беларусам буду жыць!
Мову родную клянуся
Шанаваць, цаніць, любіць.

Сваю родную старонку
Я люблю як і бацькоў,
Што вучылі песні звонкай,
Пралівалі мне любоў:

І да мовы, да дубровы,
Да палёў і да лугоў.
І заўсёды да народа,
Што жыве тут ад вякоў.

Я клянуся: не зракуся
Сваё роднае любіць.
Быў і буду беларусам,
Пакуль толькі буду жыць!

**Віктар Швед**

1. Пра якія пачуцці гаворыць аўтар верша?
2. Як аўтар адносіцца да роднай мовы?
3. Да чаго заклікае аўтар верша?
4. Што ты ведаеш аб сваіх продках?
5. Кім былі твае дзяды па нацыянальнасці?
6. Што можаш сказаць пра сябе?

# Беласточчына

Беласточчына, мая зямелька родная,
Жывеш заўсёды ты ў глыбі маіх грудзей.
Нідзе мясціны не сустрэў ніводнае,
Што мне была б хоць крышку даражэй.

Вось родны краявід, палоскі вузкія,
Якія дробніць люд вясковы з году ў год;
Сярод палёў – пасёлкі беларускія,
Дзе ад вякоў жыве мой дарагі народ.

Гляджу, прысела хатка там вясковая,
Дзе крокі першыя ў жыцці сваім рабіў,
Дзе ад бацькоў вучыўся роднай мове я,
Якую ў шуме дзён імклівых не забыў.

На Беласточчыне пражыў я маладосць,
Ды што пражыў – я нарадзіўся тут.
Таму была найдаражэйшаю і ёсць
Мне Беласточчына, мой родны, мілы кут.

Віктар Швед

1. Што пра Беласточчыну думае аўтар верша?
2. Колькі строф у вершы?
3. Прачытай пары слоў, якія рыфмуюцца.
4. Якія словы прыходзяць табе ў галаву, калі чуеш слова Беласточчына?
5. У якой частцы Беласточчыны ты жывеш?
6. У якіх мясцовасцях нарадзіліся твае бацькі?
7. Запішы шэсць сказаў пра мясцовасць, у якой ты жывеш.

# Падоўжаныя зычныя

– Эх, каб наша падарожжа цягнулася ўсё жыццё, – уздыхнуў Кастусь, – Незвычайныя здарэнні, розныя прыгоды...

– Прыгожыя мясціны, – дадала Алеся. – Як весела падарожнічаць і па гарах, і пад вадой, і па ўзлессі, узвышшы, ноччу, восенню... Вы нічога не заўважаеце?

– Сапраўды! У гэтых словах зычныя вымаўляюцца неяк доўга, працягла... Падарож-ж-жа, узлес-с-се... Цікава!

– І што? Усе зычныя могуць быць падоўжанымі?

– Не. Вы ж ведаеце, у кожнага гука свой характар. Адзін бывае толькі мяккі, а другі толькі цвёрды, адзін мае пару па глухасці ці звонкасці, а другі не. Так і тут. Ёсць вялікія аматары быць падоўжанымі, а іншыя ні за што не хочуць падаўжацца.

– Што гэта за аматары?

– А каб даведацца выканайце наступныя практыкаванні.

паводле Аляксандра Тарасевіча

Зычныя гукі **ж, з, дз, л, н, с, ц, ч, ш**, калі яны ў становішчы паміж двума галоснымі, могуць вымаўляцца падоўжана.
На пісьме падоўжанае вымаўленне зычных перадаецца падвойным іх напісаннем: збожжа, палоззе, суддзя, крылле, чытанне, Палессе, жыццё, Беласточчына, Падляшша.

### 1. Знайдзі ў сказах словы з падоўжанымі зычнымі:

**1.** Восенню на ўзлессі ўецца верас – расліна з дробным лісцем і маленькімі ліловымі кветкамі. **2.** У нашым лесе – сапраўднае грыбное багацце. Грыбы, здаецца, самі просяцца ў кошык. На ўзбярэжжы лесу іх таксама шмат. **3.** У зацішшы з паднябесся даносіцца крык жураўлёў. Яны пакідаюць родную Беласточчыну, але ж вернуцца да нас.

### 2. Складзі сказы са словамі:

багацце, каменне, жыццё, гадзіннік, стагоддзе, пяццю, галлё.

# Вывучайце гісторыю

Ішоў я каля школы і пачуў, як адзін хлопчык казаў другому: «Ведаеш, якая адбылася са мной гісторыя?» Да іх падбег аднакласнік і спытаў: «А вы гісторыю вывучылі?» Бачу, зусім пра розныя гісторыі гавораць дзеці. Першая – нейкае здарэнне з асабістага жыцця, другая – навука.

На свеце шмат розных навук. Адны вывучаюць чалавека, другія – жывёл і расліны, трэція – прыродныя з'явы. Ды ёсць навука, без якой немагчыма ўявіць наша жыццё. Гэта – гісторыя. Менавіта яна можа адказаць на шматлікія пытанні: дзе, калі і што было? Хто былі нашы продкі, славутыя і невядомыя? Што адбывалася да таго, як з'явіліся на свет мы з вамі?

Самае вялікае багацце чалавека – памяць. Яна захавала падзеі далёкага мінулага, імёны слаўных сыноў радзімы, песні і звычаі продкаў, назвы рэчаў, якімі сёння ўжо не карыстаюцца.

У кожным горадзе памятаюць былыя назвы вуліц, у кожнай вёсцы – як зваліся ці завуцца лясныя ўрочышчы, асобныя ўзгоркі, палі, лугі. Старажылы заўсёды скажуць, дзе быў вятрак, дзе вадзяны млын, якая рыба вадзілася ў рэчцы, раскажуць легенды, звязаныя з курганамі і валунамі.

Жылі нашы далёкія продкі ў лясных вёсачках, палявалі на дзікіх звяроў і аралі зямлю на невялікіх лапіках, адваяваных ад лесу. Яны пакідалі аб сабе памяць. Гэта рэшткі паселішчаў, хатнія рэчы, упрыгожанні, зброя. Усё названае знаходзяць пры раскопках археолагі, а пасля вывучаюць.

Аб гісторыі продкаў пазнейшага часу, узнікненні гарадоў нам расказваюць летапісы.

Свой маленькі летапіс можа быць у кожнай сям'і. Даведайцеся, кім былі, дзе працавалі, як жылі не толькі вашы дзядулі і бабулі, але і іх бацькі. Гэта вельмі цікава. Такія звесткі могуць перадавацца з пакалення ў пакаленне.

Сяргей Тарасаў









[?]

1. Якая навука цікавіць цябе? Чаму?
2. Хто па прафесіі твае бацькі?
3. Чым займаліся твае бабуля і дзядуля?
4. Запішы шэсць сказаў пра сваю сям'ю.

## Па колішніх слядах

... Сярэдняе Пабужжа і Панароўе не толькі не ўступаюць іншым землям, але залічваюцца да даволі багатых знаходкамі эпохі ўплываў Рымскай імперыі. У Пілінках каля Бельска, напрыклад, знойдзены бронзавае начынне, кавалкі залатых упрыгожанняў і вялікаватыя зліткі золата; у Растолтах каля Юхноўца – бронзавае начынне, аздоблены мастацкім малюнкам шкляны посуд, залатыя і срэбныя упрыгожанні, шкляныя пацеркі і камяні для гульні. Рымскія манеты знойдзены ў вёсцы Галаўкі Новыя каля Беластока, паблізу Візны і Ломжы і ў іншых мясцовасцях. Значыць, завіталі на Пабужжа і Панароўе купцы з таямнічай і дзівоснай Рымскай імперыі, ды тагачасным насельнікам гэтых зямель здаралася пабачыць на ўласныя вочы цуды гэтай краіны і на ўласнай скуры паспрабаваць смак бізуна бязлітаснага наглядчыка за нявольнікамі.

Аднак важней за ўсё было знаёмства нашых продкаў з тымі новымі спосабамі вытворчасці ў сельскай гаспадарцы, рамястве, новымі прыладамі працы і выкарыстаннем новых матэрыялаў, а ў выніку і з новымі грамадскімі адносінамі і ідэямі, якія ішлі з Рымскай імперыі. Карацей кажучы, эпоха рымскіх уплываў (2100–1600 гадоў таму назад) – гэта быў на нашых землях вялікі зрух наперад, да цывілізацыі.

Тады, між іншым, пашыралася і ўдасканалілася выплаўка і апрацоўка жалеза. Плавілі яго або з выступаючых на паверхню зямлі радовішчаў жалезных руд, як, напрыклад, гематыт (пераважна ў Свентакшыскіх гарах, Малапольшчы, на Шлёнску), або з балотнай руды, якая ў вялікай колькасці залягала ў далінах рэк і азёраў, розных багнах і долах на аграмадных прасторах Цэнтральнай і Усходняй Еўропы. Руду плавілі пры дапамозе драўніннага вугалю з дадаткам вапны ў невялічкіх гліняных печах-домніцах. Домніца мела выгляд глінянага коміна, трэць якога знаходзілася ў зямлі, яе вышыня скла-





дала адзін – паўтара метра, а ў папярочніку – каля паўметра. З 200 кг руды і 200 кг вугалю за суткі выплаўлялі ў такой печы каля 20 кг жалеза. Печчу карысталіся толькі адзін раз, бо жалеза асядала камяком («крыцаю») на дне печы, і каб яго дастаць адтуль, неабходна было цалкам разбурыць печ. Дзякуючы гэтаму археолагі цяпер могуць палічыць даволі дакладна, колькі здабывалі жалеза ў той ці іншай мясцовасці. Спачатку здабываннем і апрацоўкай займаліся ў кожным паселішчы. З бегам часу ў родах і плямёнах вылучыліся спецыялісты гэтага цяжкага, але надта важнага рамяства. З цягам часу паўсталі значныя асяродкі гэтай вытворчасці. Мабыць, апрацоўка жалеза якраз і была адной з першых і найважнейшых вытворчых спецыяльнасцей. Пра гэта сведчыць тая вялікая пашана, якой на працягу доўгіх стагоддзяў аж да апошняга часу карысталіся ў славян кавалі і кавальства...

Мікола Гайдук



[?]

1. **Знайдзі на мапе Падляшскага ваяводства вёскі і гарады, пра якія піша Мікола Гайдук.**
2. **Як і з чаго выплаўлялі жалеза?**
3. **Чым яшчэ займаліся людзі ў тыя часы?**
4. **Дзеля чаго нашы продкі выкарыстоўвалі жалеза?**

# Прыстаўныя гукі

## 1. Параўнай словы:

акно – вокны, астравы – востраў, азёры – возера, лоб – ілба, лён – ільняны.

У некаторых словах беларускай мовы выступаюць **прыстаўныя гукі**, напрыклад: **а**ржаны, **і**ржа, **в**ольха.

Прыстаўное **в** вымаўляем і пішам:

- Перад націскным **о** ў пачатку слова і пасля галосных у сярэдзіне слоў: **в**осень, **в**облака, **В**ольга, на**в**окал, на**в**ошта, у**в**огуле.
- Перад **у** карэнным у пачатку слова і пасля галосных у сярэдзіне слоў: **в**учаніца, **в**уха, **в**угаль, за**в**ушніцы, па**в**уцінне.

Прыстаўное **в** не пішацца:

Пры змене націску і пераходзе **о** ў **а**: **в**осень – асенні, **в**облака – аблокі.

У словах іншамоўнага паходжання і ўласных назвах: орган, ордэн, опера, Урал, Омск, Ольштын.

Прыстаўныя **і**, **а** вымаўляем і пішам перад збегам зычных, першым з якіх бывае **л**, **м** або **р**: **і**льняны, **і**мгла, **і**ржышча.

## 2. Дапішы, дзе трэба, прыстаўное в:

...уліца, ...ужака, ...указ, ...улачка, ...узлёт, ...удавец, ...уздым, ...усны.

## 3. Прачытай словы. Растлумач, калі пішацца прыстаўное в:

восень – асенні
вольхі – альховы
вокны – акно

волава – алавяны
водгук – адгукнулася
возера – азярцо

## 4. Складзі і запішы сказы са словамі:

іржавы, ірдзісты, імчыць, вусаты, вусны, востры, навука.

*Прысвячаю Бельску*

Мой родны горад маленькі
Маленькі
Як кропля дажджу
Жыццё кроплі дажджу
Кароткае
Яна расплываецца
Перастае існаваць
Калі ўпадзе на зямлю.
Мой родны горад
Малы
Як кропля дажджу
Але
Не расплывецца ён ніколі
Не знішчыць яго бура
Агонь не спаліць.
Горад мой
Твае вузкія вуліцы
Поўны людзей
Людзей старых
І дзяцей
Як добра
Уліцца
У раку старых людзей і дзяцей
Удыхаць
паветра.
Дрэва без караня
Усыхае
Чалавек без паветра
Уміpae.

**Надзея Артымовіч**

[!]

1. Апішы настрой верша?
2. Якімі словамі паэтка апісвае свой горад?
3. Якія яе адносіны да Бельска-Падляшскага?
4. Як разумееш чатыры апошнія радкі верша?



Аўтар Міраслаў Здрайкоўскі



## Стылістычныя сродкі

Мастак для выяўлення сваіх творчых задум скарыстоўвае пэндзаль і фарбы, кампазітар і музыкант – ноты і музычны інструмент, а паэты і пісьменнікі ў сваім ужытку маюць толькі слова. Мастацкія творы захапляюць, хвалююць і ўражваюць нас, бо, чытаючы іх, мы нібы становімся саўдзельнікамі падзей, быццам чуем і бачым усё, што апісваецца ў творы. Дасягнуць выключнай выразнасці ў вобразнай перадачы падзей і раскрыцці чалавечых характараў майстрам прыгожага пісьменства дапамагаюць вобразныя выяўленчыя сродкі мовы, і найперш мастацкія азначэнні – эпітэты. У якасці эпітэта выступаюць словы, ужытыя ў пераносным значэнні. Яны вылучаюць у прадмеце або з'яве асабліва значныя, істотныя прыкметы і ўласцівасці, на якія абавязкова неабходна звярнуць увагу. Эпітэты дапамагаюць уявіць пэўныя вобразы і малюнкі, яны моцна ўплываюць на наша ўспрыманне.

**Эпітэт** – мастацкае азначэнне, якое вобразна (жыва, наглядна, паэтычна) характарызуе прадмет, з'яву, чалавека.

У якасці эпітэтаў часцей сустракаюцца прыметнікі (паветра *маўклівае*, галасы *журлівыя*, *натомленыя*, мелодыя *мяккая*, *ласкавая*), але бываюць і другія часціны мовы (дзяўчына-*красуня*, ручай-*жэўжык*, *пястун*, які *лагодна* пяе, *сярдзіта* бубніць).

Эпітэты, што сустракаюцца ў творах сучасных паэтаў і пісьменнікаў, істотна адрозніваюцца ад тых, якія ўзніклі ў далёкія часы, – у народных казках, легендах, песнях. Нашы продкі найперш адзначалі ў прадметах або з'явах толькі самае агульнае, што часцей паўтаралася. Так з'явіліся вобразы: поле *шырокае*, ночка *цёмная*, зорка *ясная*, бярозка *белая*, вясна *красная*, лісточак *зялёненькі*, зіма *лютая*, вецер *буйны* і інш.

**Параўнанне** – супастаўленне двух прадметаў або з'яў на аснове іх падабенства.

Параўнанні звычайна пачынаюцца словамі: *як, нібы, як бы, як быццам, падобна да, накшталт, нібыта* і інш.

Параўнанні вылучаюць новыя якасці, рысы, асаблівасці ў звыклым, даўно знаёмым, дапамагаюць больш ярка ўявіць невядомыя рэчы і з'явы, выказаць свае адносіны да іх.

Слова ў мастацкім творы не толькі расказвае, але і паказвае, малюе карціны жыцця, выяўляе пачуцці герояў, перадае іх настрой. Нават у будзённым жыцці мы з вамі гаворым: жыццё *ідзе*, гады *бягуць*, рабіна *гарыць*, вецер *вые*, дрэвы *стогнуць*. Мы ў гэтым выпадку проста пераносім якасці, прыкметы, дзеянні з адной з'явы на другую, падобную да яе.

Гэта **метафары**. Яны вельмі блізкія да параўнанняў. У параўнанні заўсёды відаць, што з чым супастаўляецца. А ў метафары параўнанне нібы схавана, стоена, пра яго мы толькі здагадваемся. Метафара выглядае як скарочанае параўнанне: гады *плывуць* (як вада ў рацэ).

**Метафара** – перанясенне ўласцівасцей адной з'явы на другую, чым-небудзь падобную на яе. Дзеянне, характэрнае чалавеку, перанесена на аснове падабенства на нежывую прыроду (*каменнае* сэрца, *кіпіць* праца, *плыве* жыццё, *дагарае* восень).

Метафара — вельмі лаканічная (кароткая, сціслая) па форме і разам з тым вельмі ёмістая, багатая па сэнсе. Двума-трыма словамі метафара стварае яркі мастацкі вобраз, які адразу знікне, калі паспрабаваць перавесці паэтычны выраз на звычайную мову.

**паводле Людмілы Цітовай**

**1. Падбяры эпітэты, якія б характарызавалі слова «школа».**

**2. Да наступных параўнанняў падбяры адпаведныя словы:**

| | |
|---|---|
| як мыш | ... як маці |
| як сонца | ... як лёд |
| як жалеза | ... як паветра |
| як снег | ... як асёл |
| нібыта ноч | ... быццам золата |

**3. Растлумач наступныя метафары:**

дрэмле цішыня, скупая зямля, лёгкі хлеб, пякучыя словы, свеціцца радасць, насупіцца восень, ідзе зіма, час бяжыць.

## Беласток

Беласток, родны наш Беласток, –
Вырас ты на палосках, у жыце,
Дзе радзімы цвяток-васілёк
Праглядаецца ў неба блакіце.

Сімвалічны твой герб, Беласток,
Ад Арла і крывіцкай Пагоні.
Гэта ў наша мінулае крок,
Спалучае ён нас і сягоння.

Прыгажэеш штогод, Беласток,
Незвычайнай сваёй панарамай.
Тут касцёлы віднеюць здалёк,
Ёсць і цэркаўкі нашы таксама.

Цешыш сэрца і цешыш наш зрок
Ты, малое айчыны сталіца.
Беласток, родны наш Беласток,
Будзем вечна табой ганарыцца.

**Віктар Швед**

[!]

1. Якія пачуцці выражаны ў вершы?
2. Знайдзі ў вершы эпітэты, метафары, параўнанні.
3. Чым можа ганарыцца Беласток?





Вывучы словы песні

Уладзімір Някляеў

# Родны мой горад

Песняй журлівай, крылом жураўліным,
Зорак суніцамі
Першым спатканнем і першым расстаннем
Горад мой сніцца мне

**Прыпеў:**

Родны мой горад, любоў мая,
Казка кахання чароўная.
Ты, калі ласка, чакай мяне
З кожнай дарогі, са шляху расстайнага.

Пад гістарычным і сонечным небам
Днём і парой начной,
Светлы і чысты, як ветразь надзеі,
Горад вясны маёй.

**Прыпеў:**

Родны мой горад, любоў мая...

Закалыхалі начныя праспекты
Клёны з таполямі...
Толькі б чакалі ў горадзе гэтым,
Толькі б нас помнілі.

**Прыпеў:**

Родны мой горад, любоў мая....

# Тэмы:

1. Вусная народная творчасць.
2. Музыкі.
3. Не сіла, а смеласць.
4. Таямніца густога лесу.
5. Амонімы.
6. Легенды.
7. Пра камень у Валілах.
8. Сінонімы.
9. Загадкі.
10. Антонімы.
11. Прыказкі.
12. Песня «Песенька палахлівага Зайца».

# Вусная народная творчасць

За шматлікія стагоддзі сваёй гераічнай гісторыі наш народ стварыў найбагацейшую спадчыну – безліч цудоўных міфаў, легенд, казак, песень, загадак, прыказак, прыкмет і павер'яў. Гэтыя творы вусна (паколькі яшчэ не было пісьменнасці) перадаваліся з пакалення ў пакаленне. Кожны, хто расказваў легенду або казку ці спяваў песню, звычайна нешта змяняў у іх, дадаваў сваё. З цягам часу імя першага аўтара забывалася.

Вусную народную творчасць яшчэ называюць фальклорам, што ў перакладзе з англійскай мовы азначае «народная мудрасць». Сапраўды, фальклорныя творы ўвабралі ў сябе веды і вопыт многіх пакаленняў беларусаў, іх уяўленні пра навакольны свет.

## Народныя казкі

Казкі ўзніклі ў глыбокай старажытнасці.

**Казка** – апавяданне фантастычнага або бытавога зместу з шырокім выкарыстаннем вымыслу. Беларускія народныя казкі надзвычай багатыя і разнастайныя. Сярод іх вылучаюцца тры віды: казкі пра жывёл, чарадзейныя і бытавыя.

У **казках пра жывёл** дзейнічаюць асаблівыя героі – звяры, птушкі, рыбы, іншыя жывыя істоты (ліса, воўк, мядзведзь, шчупак, дзяцел, сабака, кот, певень, баран і г.д.) і нават расліны. Сваімі паводзінамі яны нагадваюць людзей – добрых, працавітых, надзейных, разумных або непрыстойных, жорсткіх, хцівых, разбэшчаных. У казках пра жывёл сцвярджаюцца лепшыя чалавечыя якасці: адданае сяброўства, бескарыслівасць, кемлівасць і адмаўляюцца няўдзячнасць, сквапнасць, баязлівасць, нахабства, лянота і іншыя людскія заганы.

У **бытавых казках** асуджаюцца жорсткасць, прагнасць, хцівасць, здрадніцтва, высмейваюцца скнары, гультаі і абібокі. Героі бытавых

казак – простыя людзі, яны перамагаюць ворагаў сваім розумам, мудрасцю, знаходлівасцю.

**Чарадзейныя казкі** – гэта фантастычныя гісторыі, у якіх прысутнічаюць не толькі незвычайныя героі (багатыры, казачныя асілкі, волаты), але часам і звычайныя людзі, смелыя, кемлівыя, працавітыя, ім дапамагаюць добрыя чараўнікі і сілы прыроды, а таксама цудадзейныя прадметы: кілім-самалёт, жывая вада і інш. Героі казак змагаюцца са злом і несправядлівасцю і заўсёды выходзяць пераможцамі. Ім супрацьстаяць пачварныя істоты, надзеленыя звышнатуральнымі здольнасцямі і магчымасцямі: шматгаловы Змей, Паганы Цмок, Баба-яга, злыя чарадзеі.

Народныя казкі часта пачынаюцца традыцыйнымі рыфмаванымі *зачынамі*: «Даўно гэта было ці нядаўна, так ці не так – цяпер ужо, напэўна, ніхто не ведае», «У якім-тось краю жылі людзі, нібы ў раю, гаравалі, працавалі дый бяды не зналі», «Было яно ці не было, праўда ці няпраўда – паслухаем лепш, што казка кажа». Звычайна казкі маюць і *канцоўку*: «Я там быў, мёд-піва піў, па барадзе цякло, а ў роце не было», «Вам казка, а мне абаранкаў вязка», «Далі мне пірог, я – за парог», «Тут і казцы канец, а хто слухаў – маладзец».

Казкі ствараюцца і ў наш час. Імі захапляюцца не толькі нашы суайчыннікі, але і чытачы розных краін свету.

паводле Людмілы Цітовай

[?]

1. **Калі ўзніклі народныя казкі?**
2. **Чым характэрныя народныя казкі?**
3. **Якія віды казак ты ведаеш?**
4. **Пра што распавядаюць чарадзейныя казкі?**
5. **Назаві асноўныя асаблівасці бытавых казак.**
6. **Вызначы адметныя асаблівасці казак пра жывёл.**
7. **Прыгадай і раскажы сваю любімую казку.**

# Музыкі

Жылі-былі асёл, сабака, кот і певень. Калі яны пастарэлі, дык гаспадары павыганялі іх з двара. Вось раз уночы сышліся ў лесе гэтыя выгнаннікі. Пазнаёміліся, здружыліся. Пачалі думаць, як на свеце ім жыць, чым займацца. Самы разважлівы з іх, асёл, і кажа:

– А давайце спрабуем быць музыкамі.

Усім спадабалася такая думка, бо кожны з іх лічыў сябе артыстам у справе музыкі. І сапраўды ж: певень, як вядома, спявак з уроды, кот таксама, а сабака не толькі гаўкае, але і выць умее. Ну і асёл з голасам, іначай ён і думкі такой не падаваў бы. Выстраіліся прыяцелі і пайшлі: асёл наперадзе, сабака за аслом, кот за сабакам, а певень за катом. Ідуць яны, аж бачаць – далёка ў лесе хата стаіць. Спыніўся асёл.

– Давайце заспяваем! – кажа ён. – Сядайце на мяне!

Разагнаўся сабака, ускочыў на спіну аслу, кот сеў на сабаку, а певень на ката, ды як гаркнулі ўсе разам, ды на свой лад, дык аж лес задрыжэў. Звяры папалохаліся і пахаваліся хто куды.

– Добра выйшла! – пахваліў асёл.

Падышлі яны да самай хаты.

– Пачынай! – камандуе асёл.

Як грымнулі музыкі, дык аж хата затрэслася. А ў той хаце жылі бандыты. Папужаліся яны і кінуліся наўцёкі. Адчыніў асёл дзверы, і ўся капэла ўвайшла ў хату. А там яды і рознага дабра не злічыць. Наеліся, напіліся артысты і пачалі нанач ладзіцца.

– Як я заўсёды на сметніку сплю, дык і сёння я лягу на сметніку, – кажа асёл.

– А я прывык спаць каля дзвярэй, дык і тут каля дзвярэй лягу, – азваўся сабака.

– А мне месца заўсёды на прыпечку, і сёння займу я прыпечак, – падае голас кот.







– А я прымайструюся на жэрдачцы пад страхой: такі ўжо звычай завялі мае дзяды, – кажа пеўнік.

Размясціліся сябры і паснулі.

А бандыты гэтым часам у лесе стаіліся ды разважаюць, хто ж гэта перапалохаў іх і што сталася з іхняю хатаю. Пасылаюць аднаго бандыта.

– Ідзі, – кажуць, – праведай, што там робіцца.

Падыходзіць бандыт да сваёй хаты. Ціха, нічога не чуваць. Заходзіць у хату – цёмна, нічога не відаць. Дастаў ён з печы смалячок, ідзе да прыпечка, каб агонь запаліць. Аж бачыць – два вугольчыкі блішчаць. Хацеў выгарнуць, а кот кіпцюрамі як драпане па руцэ! У таго кроў пайшла. Кінуўся бандыт з хаты, а каля парога сабака як рване яго за сцягняк! А тут і пеўнік як зляціць з жэрдачкі ды як дзеўбане бандыта па галаве! Бандыт кулём за плот коціцца, а там асёл як штурхане яго нагою! Бандыт разоў тры перакуліўся ды кінуўся бегчы ў лес! Прыбягае і расказвае:

– Быў у нашай хаце – бяда! Нейкая сіла заняла яе! Хацеў на прыпечку вугольчыкі раздзьмухаць, аж нехта шась мяне нажом па руцэ. Кінуўся ўцякаць, а мяне хтось каля парога па назе шабляй. А другі, як д’ябал, з-пад страхі вырваўся ды кап’ём мне ў голаў. Цераз плот пераскочыў, а там хтось даўбешкай як стукнуў мне, разоў тры перакуліўся я... Прапала наша хата! Уцякайма!

Паўцякалі з гэтага лесу бандыты, і іх палавілі. А спевакі асталяваліся ў той хаце, жывуць-пажываюць і бяды-ліха не знаюць.

Апрацоўка Якуба Коласа

[?]

1. **Назаві герояў казкі. Чым адметны кожны з персанажаў?**
2. **Чаму сябры вырашылі стаць музыкамі?**
3. **Як удалося героям ажыццявіць сваю мару?**
4. **Як трымалі сябе разбойнікі?**
5. **Да якога віду народных казак можна аднесці гэты твор?**

# Не сіла, а смеласць

Жыла ў адной вёсцы дзяўчына Марыля. Маленькая ўдалася ростам, дык усе яе не Марыляй звалі, а Марылькай. І сілу яна мела, як у таго камара.

Жартуюць з яе сяброўкі: «На цябе, кажуць, хлопец як дзьмухне, дык ты і паляціш, як пух!»

Ды затое была Марылька такая смелая, што і хлопец другі не дакажа. Бывала, убачыць, што большы крыўдзіць меншага, – як ястраб налятае на крыўдзіцеля, і той адступае перад ёю.

Пачалі аднаго разу сяброўкі жартаваць з Марылькі:

– Ды ты не такая і смелая, як думаеш. Схадзі вось уночы на могілкі, тады паверым.

– І схаджу! – адказвае Марылька.

– Нябось, убачыш там пень, дык душа ў пяткі схаваецца...

– А вось жа на злосць вам пайду! – кажа Марылька.

Настала ноч. Марылька пакінула сябровак на вуліцы, а сама пабегла на могілкі.

Бяжыць і не азіраецца. Каля могілак супынілася ды пайшла ціха. А каб не было страшна, заспявала песню. Ходзіць так па могілках ды спявае, – няхай чуюць сяброўкі, што яна тут!

Здарылася якраз, што ў тую ноч зладзеі абакралі аднаго багатага гаспадара і везлі яго дабро каля могілак у свой лес. Пачулі яны песню, напужаліся, кінулі воз ды пабеглі хавацца, хто куды.

Падышла Марылька да воза, – паклікала — ніхто не адгукаецца. Агледзела воз, а там усялякага дабра поўна. Здагадалася яна, што гэта зладзейская работа, бо ад зладзеяў у іх аколіцы шмат хто бяду меў. Ніхто не ведаў, адкуль яны прыходзяць і куды крадзенае возяць.

Села Марылька на воз ды пагнала каня ў вёску.

Убачылі зладзеі, што тут усяго толькі адна малая дзяўчынка, кінуліся за ёю, але так і не дагналі.





Вярнула смелая Марылька гаспадару каня і ўсё дабро. Зарадаваўся гаспадар і даў ён за гэта вялікія грошы. Купіла яна сабе новую сукенку, чаравікі, прыхарашылася так, што ўсе сяброўкі зайздросцяць ёй.

А зладзеі ніяк не могуць сабе дараваць, што такая малая дзяўчынка паразганяла іх, як зайцоў. Ды і накрадзенага дабра шкада ім стала. Вось і надумаліся яны завабіць смялячку ў свой лес і адпомсціць ёй.

Прыехаў да Марылькі праз колькі дзён адзін з тых зладзеяў у сваты. Марылька кажа яму:

— Ты чалавек мне незнаёмы, я раней хачу паглядзець, дзе ты жывеш і як жывеш.

Злодзей, вядома, і рад: сама трапіць у іх рукі! Расказаў ён ёй, дзе яго шукаць, і паехаў.

Сабралася Марылька ў розведы да жаніха. Маці пачала яе адгаворваць, не пускаць. Ды дзе там — нічога не парадзіш з такою ўпартаю дачкою!

Запрэгла яна сваю кабылку, села і паехала.

Даехала да лесу, бачыць — збоку паваротка, а каля яе на кусце заламана галінка. Яна і звярнула на гэтую паваротку.

Праехала крыху, а там новая паваротка і зноў галінка заламана.

Ехала яна так, ехала, даехала да нейкага балотца. А за ім пайшоў лес такі густы, што і носа не ўбіць. І ніякай дарожкі нідзе няма. Прывязала яна да бярэзіны кабылку, а сама пайшла ў гушчар. Пралезла і ўбачыла прасвет, а на ім хатку. Падкралася да хаткі, глядзіць праз акенца, аж там зладзеі дзеляць накрадзенае дабро. Лаюцца, крычаць, ледзь не з нажамі адзін на аднаго кідаюцца. Прыгледзелася Марылька і пазнала сярод іх таго, хто да яе ў сваты прыязджаў… Стаіць ён, размахвае вялізным нажом, разнімае другіх. «Відаць, гэта сам атаман разбойнікаў», — думае Марылька.

Завярнулася яна ды пайшла хутчэй да кабылкі.

Плішчылася яна, плішчылася праз гушчэчу, усё адзенне на сабе парвала і заблудзілася. Туды-сюды кідаецца — няма кабылкі! Рап-

там перагарадзілі ёй дарогу два ваўкі… Стаяць ды зубамі ляскаюць. «Ну, — думае Марылька, — з'елі яны маю кабылку». Узяла яе злосць на ваўкоў, схапіла яна патарчаку і з крыкам кінулася на іх. Спалохаліся ваўкі смелай дзяўчыны, падцялі хвасты ды падаліся ў гушчар.

Прабіраецца Марылька далей. Вось ужо і сонейка зайшло, птушкі сціхлі, толькі пугач крычыць сваё «пу-гу!» ды сава падлятае да яе на сваіх мяккіх крылах, чуць не на галаву садзіцца. А як адляціць ды пачне выгукваць ды плакаць, бы малое дзіця, дык аж пошчак ідзе па лесе.

Выбралася гэтак Марылька на нейкую дарожку, бачыць — едзе на яе кабылцы якісьці чалавек. Прыгледзелася, аж гэта іх сусед, стары Ахрэм. Хадзіў ён па лесе з сякераю, шукаў якой патрэбнай дзеравякі ды натрапіў на прывязаную кабылку. Пагукаў — няма гаспадара. «Мабыць, яе зладзеі ўкралі ды схавалі тут», — падумаў Ахрэм. Адвязаў ён кабылку, сеў у драбінкі ды і падаўся дахаты.

Пачуў Ахрэм голас, азірнуўся: гоніцца за ім нейкая ні то русалка, ні то ведзьма: косы распушчаны, адзенне на кавалкі пашматана… Давай ён кабылку паганяць, ад бяды ўцякаць.

А русалка ўсё бяжыць за ім і нават па імені кліча…

Бачыць Ахрэм, што не ўцячы яму на кабылцы ад гэтай мары. Саскочыў ён з воза, схапіў сваю сякеру ды так паджгаў, што толькі пяты замільгалі.

Прыехала Марылька дахаты і расказала ўсім, дзе зладзеі жывуць. Сабраліся хлопцы, зрабілі ў лесе аблаву і палавілі іх.

Зажылі з таго часу людзі ў той аколіцы ціха ды мірна.

Праўду кажуць: бярэ не сіла, а смеласць.

Апрацоўка Алеся Якімовіча

1. Раскажы, як выглядала Марылька?
2. Што можаш сказаць пра характар дзяўчыны?
3. Якую небяспеку яна пераадолела?
4. Да якога віду народных казак можна аднесці гэты твор?

# Таямніца Густога лесу, або З чаго ўсё пачалося

Даўным-даўно, стагоддзі таму, існавала адно запаветнае месца – Густы лес. Ён быў такім велізарным, што ахопліваў межы сямі краін. У гэтым лесе жылі чароўныя істоты, якія рэдка трапляліся на вочы чалавеку: чарадзеі, эльфы, тролі, лясныя феі, грыбныя гномы, лесавікі. Часам яны жылі мірна, часам сварыліся. А раз у сто гадоў жыхары Густога лесу збіраліся ўсе разам на таямнічае свята і рабілі падарункі не адно аднаму,.. а людзям. Менавіта людзям, таму што ў іх жыцці так мала чараўніцтва. Праўда, людзі часцей за ўсё не ведалі пра тыя падарункі. Яны лічылі, што ім проста пашанцавала.

І вось у адно свята насельнікі гушчару распалілі вогнішча да неба, селі вакол яго і спыталі старую, як сам лес, чарадзейку:

– Што мы падорым людзям на гэты раз?

Старая чарадзейка задуменна паглядзела на агонь. Толькі яна магла разгледзець у ім схаваныя знакі.

– Я бачу ружу, – нарэшце сказала яна. – І не адну, а цэлых сем. Сем цудоўных ружаў! Мы падорым іх маленькім дзяўчатам. Хтосьці з іх атрымае кветку адразу, хтосьці знойдзе яе, толькі калі вырасце. Але жыццё кожнай зменіцца ад гэтай знаходкі.

Пунсовую ружу знойдзе самая цікаўная. З-за гэтай цікаўнасці ёй давядзецца шмат чаго вынесці, але шчасце не абміне яе.

Жоўтую ружу знойдзе самая кемлівая. Нават там, дзе ніколі не свеціць сонца, яна зможа адшукаць і выратаваць дарагога чалавека.

Белую ружу знойдзе самая адданая. Дзеля сваёй сям'і яна выправіцца ў небяспечнае падарожжа. Але злыя чары адступяць перад ёй.

Кармінавую ружу знойдзе самая добрая. І дабрыня вернецца ёй стакроць. Яна здабудзе дом і сяброў там, дзе менш за ўсё чакала.

Блакітную ружу знойдзе самая сціплая. За ціхі нораў яна атрымае скарбы, пра якія толькі магла марыць.

Залатую ружу знойдзе самая моцная духам. Яна захоча вызваліць аднаго чалавека, а вызваліць цэлае каралеўства.

Чорную ружу знойдзе самая адважная. Яна не спалохаецца ворага і нават самой смерці.

Жыхары Густога лесу схілілі галовы перад старой мудрай чарадзейкай. І той жа ноччу цудоўныя кветкі пусцілі карані ў розных краінах з усіх бакоў свету. Ружы чакалі сустрэчы з тымі, для каго былі прызначаныя.

Але пра лясное свята і пра тое, адкуль узяліся сем чароўных ружаў, ведаем толькі мы з вамі. Астатнія чулі адно старыя казкі пра прыгоды дзяўчат з кветкавымі імёнамі. І калі вы яшчэ не чыталі гэтыя казкі, самы час пачаць.

Надзея Ясмінская



[?]

1. **Раскажы, што ведаеш пра Густы лес.**
2. **Якія ружы і каму давала старая чарадзейка?**
3. **Як ружы мянялі жыццё кожнай з дзяўчат?**
4. **Выканай малюнак да выбранай часткі казкі.**
5. **Калі хочаш пазнаць гісторыю кожнай дзяўчыны і ружы, прачытай кніжку Надзеі Ясмінскай «Сем ружаў», «Галіяфы» 2015.**

# Амонімы

**1. Прачытай сказы і адкажы, што абазначаюць выдзеленыя словы:**

Побач **гасцінца** дзяўчынка пабачыла лісу з **лісічкамі**.
Кожны раз госці прыносілі дзецям невялікі **гасцінец**.
Амаль заўсёды я вяртаўся з лесу з кошыкам поўным **лісічак**.
Ніна на сняданак звычайна **піла** малако.
Сталёвая **піла** добра працавала ў яго руках.

Словы, якія аднолькава пішуцца, але абазначаюць розныя прадметы ці з'явы, называюцца **амонімамі**.

Напрыклад: бабка (бабуля), бабка (страва з бульбы), бабка (грыб); месяц (часу) і месяц (на небе); гасцінец (дарога) і гасцінец (падарунак); аўсянка (крупы) і аўсянка (птушка).

Амонімы трэба адрозніваць ад мнагазначных слоў.
Амонімы адносяцца да розных прадметаў.
Мнагазначныя словы абазначаюць падобныя чым-небудзь прадметы і з'явы: крыло (птушкі) і крыло (самалёта) – падобныя формай і размяшчэннем.

**2. Знайдзі ў сказах амонімы і параўнай іх значэнні:**

Хлопец горка заплакаў / Мы з захапленнем слухалі канцэрт маладой японскай скрыпачкі / У вялікім пакоі цьмяна гарэлі люстра і настольная лямпа / Каля нашай хаты ў Градалях рос вялікі ясень / Панадворак зарос падарожнікам / Ён часта разглядае сябе ў люстры / Сумна ў хаце, дзе не спяваюць, дзе не чуваць ніякай музыкі / За нашай школай была снежная горка / Нашы падарожнікі апынуліся ў Малінніках / На гэтых раслінах не бывае рос / Тамара грала на скрыпачцы.

**3. Складзі сказы са словамі:**

край (на свеце), край (стала), касá (прычоска), кáса (у краме), мукá (прадукт), мýка (намаганні, цяжкасці).

# Легенды

Легенды гэта фантастычныя апавяданні, заснаваныя на гістарычных падзеях і ўслаўленні народных герояў.

У легендах элементы фантастыкі: неверагодныя здарэнні, незвычайныя героі – асілкі і волаты – і іх дзівосныя ўчынкі і прыгоды. Легенды дапамагаюць нам пазнаваць жыццё, яны распавядаюць пра мінулае: стварэнне сусвету і зямлі, паходжанне людзей, розных жывёл і птушак, узнікненне паселішчаў, рэчак і азёраў, паходжанне імёнаў і прозвішчаў. У легендах, як і ў казках, амаль заўжды існуе барацьба паміж дабром і злом, сутыкненне герояў з незвычайнымі варожымі сіламі.

Легенды дапамагаюць глыбей пазнаць мінулае, гісторыю роднага краю і сваёй зямлі.

паводле Людмілы Цітовай



[?]

1. **Чым характэрныя легенды?**
2. **Якія ты ведаеш легенды?**
3. **Перакажы змест вядомай табе легенды.**

# Пра камень у Валілах

Было гэта даўным-даўно, калі людзей тут яшчэ зусім не было. Вакол цягнуліся непраходныя пушчы-лясы ды вілася сярод іх вось гэтая рэчачка. У балотнай твані сядзеў д'ябал. Бачыце, калісьці нячысты толькі ў такіх месцах і вадзіўся. Гэта цяпер адно стаў ён па гарадах шляцца. Сядзеў ён так ды з нуды корпаўся ў балоце, ажно бачыць: берагам рэчкі ідзе чалавек. Здалёку, відаць, небарака вандраваў: схуднелы ды абдзёрты ўвесь. Убачыў рэчку, прысеў на купіну, а свае змораныя ногі ў ваду апусціў ды пабоўтвае імі, каб хутчэй стому з іх сагнаць. А д'ябла ад злосці аж чорт носіць: «Бач ты, маўляў, мала таго, што па маім беразе валочыцца, то яшчэ і мяне сваім боўтаннем непакоіць уздумаў! Чаго добрага – возьме і назаўсёды тут жыць астанецца. Ну, тут-то я цябе і звяду са свету».

Выкалупаў нячысты з багны каменьчык, бы зярнятка бобу са струка, папляваў на яго, перакінуў разы са тры з адной сваёй калматай лапы ў другую, і тут уваччу маленькі камушок у аграмадны валун абярнуўся. Пачаў размахвацца д'ябал з усяе моцы, але ж як на тое ўзяў ды паслізнуўся ў топелі, і глыба замест чалавека бухнула на скрай лугу. Убачыў вандроўнік, чым тут пахне, – лахі пад пахі ды ходу з гэтых мясцін. А валун так і астаўся ляжаць тут. Ад таго, што чорт уваліў тут валун, і пачалася назва – Валілы.

З кнігі «Белая Русь. Гісторыя Беларусі
ў легендах і паданнях».

[?]

1. Ад чаго павялася назва Валілы?
2. Адкуль з'явіўся валун?
3. Хто замяніў каменьчык у аграмадны валун?
4. Чаму д'ябал кінуў каменьчык?
5. Дзе жыў д'ябал?





# Сінонімы

Словы, што пішуцца і вымаўляюцца па-рознаму, але маюць аднолькавае або вельмі блізкае значэнне, называюцца **сінонімамі**.

(халодная, сцюдзёная; лапата, рыдлёўка; хата, дом; ісці, крочыць)

**1. Адшукай словы сінонімы. Падзялі іх на групы і прачытай.**

крычаць, зразумець, знайсці, гукаць, калыхаць,
знаходзіцца, гушкаць, прысутнічаць, абурацца,
люляць, асэнсаваць, гневацца,
здолець, быць, злавацца, змагчы,
адшукаць, усвядоміць

**2. Падбяры сінонімы да словазлучэнняў:**

ідзе восень, ...
свежы след, ...
цяжкая задача, ...
лютая зіма, ...
старажытны горад, ...

дужы чалавек, ...
ідзе хлопец, ...
сярдзіты сабака, ...
смелая дзяўчынка, ...
сардэчныя словы, ...

**3. Прачытай словы. Назаві словы-сінонімы:**

адуванчык, васілёк, дзьмухавец
халодная, сцюдзёная, стройная
загад, каманда, камандаванне, распараджэнне
ліпавы, ліпкі, клейкі
ступаць, крочыць, плесціся
пад’есці, пакаштаваць, паласавацца
дом, будынак, кватэра, хата
шаша, дарога, сцежка, гасцінец, вуліца

# Загадкі

Загадкі – адзін з найбольш любімых народам (асабліва дзецьмі) фальклорных жанраў. Загадкі ўзніклі ў глыбокай старажытнасці. Старадаўнія людзі пакінулі нам выдатныя ўзоры вобразных і трапных характарыстык прыродных з'яў, прадметаў, рэчаў.

Загадка перадае змест праз мастацкі вобраз, поўны нечаканых параўнанняў, збліжэнняў і паваротаў.

**Загадка** – вобразнае апісанне ўтоенага прадмета ці з'явы, якое патрабуе разгадкі.

Чалавек складаў загадкі найперш пра тое, з чым сутыкаўся ў жыцці. Нашы продкі верылі, што расліны і жывёлы разумеюць чалавечую мову. Палюючы на звяроў або ловячы рыбу, збіраючы грыбы, ягады, арэхі, зёлкі, карані, людзі пільна прыглядаліся да прыроды, бо ад яе залежала іх жыццё. Яны параўноўвалі таямнічае, загадкавае, невытлумачальнае з тым, што назіралі кожны дзень. Напрыклад, неба параўноўвалася з полем, зоркі – з велізарным статкам, што рассыпаўся па шырокім полі, а месяц з пастухом.

У загадках вядомая людзям рэч паўстае ў нечаканым, незвычайным вобразе. Загадкі ствараюцца на аснове параўнання падобных з'яў і прадметаў.

Даўней самыя вопытныя і паважаныя людзі спецыяльна вучылі моладзь разгадваць загадкі, каб развіць разумовыя здольнасці, кемлівасць, фантазію, назіральнасць, трэніраваць памяць, прывучаць да развагі, аналізу.

З цягам часу адгадванне загадак стала проста забавай. Таго, хто лёгка адгадвае загадкі, лічаць знаходлівым, разумным.

У загадках вельмі часта з'явы прыроды надзелены якасцямі жывых істот: «Без рук, а малюе, без зубоў, а кусае» (мароз).

Некаторыя загадкі нагадваюць задачы:

«Дзве маці, дзве дачкі ды бабулька з унучкай. Колькі ўсіх?».

«Ляцелі два зграі гусей. Першы статак гаворыць:

– Дайце нам адну гуску, тады ў нас будзе пароўну.

А другі статак адказвае:

– Дайце нам адну гуску, тады ў нас будзе ў два разы больш.

Колькі было гусей у кожным статку?».

Адгадайце.

паводле Людмілы Цітовай

**1. Адгадай загадкі:**

*Хоць бяскрылы, а лятае,*
*Безгалосы – свішча,*
*Хоць бязрукі, а бывае*
*Грушы ў садзе абівае,*

*Нават часам вырывае*
*Дрэвы з карнявішчам,*
*А як зморыцца – упадзе,*
*І няма яго нідзе.*

**Ніл Гілевіч**

*Маленькае, залаценькае,*
*усё поле асвеціць.*

*З высокай дарогі глядзіць*
*бычок крутарогі.*

*У вадзе нараджаецца,*
*а вады баіцца.*

*Што за дрэва ў свеце ёсць,*
*Што дупло яго наскрозь,*
*А ў дупло забраўся пісар,*
*Вечна піша і маўчыць,*
*Ростам гэткі ж, як і дрэва, –*
*Толькі нос з дупла тырчыць.*

**Ніл Гілевіч**

*Брат сястру пабачыць рад,*
*Але строгі ў іх расклад:*
*Прачынаецца сястра –*
*Брату спаць ісці пара.*

**Васіль Вітка**

*Адзін лье, другі п’е,*
*а трэці расце.*

*На двары гарою,*
*а ў хаце – вадою.*

**2. Паспрабуй скласці адну-дзве загадкі. Запішы іх у сшытак.**

# Антонімы

Словы з процілеглым значэннем
называюцца **антонімы**.

(гарачы – халодны, чысты – брудны, плакаць – смяяцца)

### 1. Падбяры антонімы да выдзеленых слоў::

**свежы хлеб** – ... хлеб
**цвёрдыя крэслы** – ... крэслы
**лёгкі мароз** – ... мароз
**горкая вестка** – ... вестка
**стары чалавек** – ... чалавек

**свежы агурок** – ... агурок
**высокае дрэва** – ... дрэва
**глыбокае возера** – ... возера
**горкі смак** – ... смак
**стары дом** – ... дом

### 2. Да наступных слоў падбяры словы з процілеглым значэннем:

чысціня, вечар, мяккі, шырокі, змокнуць, стаіць, маўчаць, згубіць, сустрэча, цёмна, купіць, вясёлы, зайсці, доўга, пустая, чужы, правы.

### 3. Да слоў з левага слупка падбяры словы з супрацьлеглым значэннем з правага:

| | |
|---|---|
| поўдзень | поўнач, усход |
| мір | адвага, вайна |
| кіслы | салодкі, гарачы |
| закрыць | адарваць, адкрыць |
| доўгі | кароткі, смачны |
| родны | чужы, блізкі |

### 4. Да слоў з першага слупка падбяры сінонімы з другога і антонімы з трэцяга.

| | | |
|---|---|---|
| вядомы | кепскі | цвёрды |
| дужы | невялікі | павольны |
| дрэнны | моцны | рослы |
| мяккі | пушысты | добры |
| малы | шпаркі | невядомы |
| хуткі | знакаміты | слабы |

# Прыказкі

У прыказках нашы прашчуры занатавалі свае мудрыя запаветы, свой вопыт паводзін у грамадстве, жыццёвыя ўрокі. У іх акрэслены тыя маральныя законы і правілы, якімі чалавеку неабходна кіравацца заўжды: «Не руш чужога і не бойся нікога», «Абібокам жыць – толькі неба капціць».

**Прыказкі** – трапныя народныя выслоўі, часам з павучальным зместам, якія даюць ацэнку чалавечым паводзінам, учынкам, якасцям.

Прыказкі часцей складаюцца з дзвюх частак – паведамлення і вываду:

«Не зведаўшы броду, не лезь у воду»,
«Хто не шануе чужога, той і свайго не мае»,
«Не той багаты, хто мае, а той, хто дае».

Прыказкі маюць пераносны сэнс (падтэкст).
У прыказках усслаўляюцца высокія маральныя якасці чалавека:

«Шануй людзей, то і яны табе паспагадаюць»,
«Шчыраму сэрцу і чужая болька баліць».

Часам высмейваюцца розныя заганы чалавечага характару, выкрываюцца людскія недахопы:

«Сам не гам, і другому не дам»,
«На яду мастак, а на работу так-сяк»,
«На мане далёка не заедзеш».

Найбольш трапныя і шырокавядомыя прыказкі называюць афарызмамі:

«За багацце розуму не купіш»,
«Ад пустога звону карысці нікому».

Прыказкі і афарызмы робяць нашу мову вобразнай, яркай, выразнай і адметнай, да таго ж часам падкажуць вернае выйсце ў няпростых жыццёвых сітуацыях:



Новых сяброў нажывай, але старых не забывай.
Калі ўлез у дугу, не кажы: не магу.
Час не конь, не падгоніш, не прыпыніш.
Калі топішся, за саломінку схопішся.
Не чапай ліха, хай сядзіць ціха.
Да пары жбан ваду носіць.
З вялікага грому малы дождж.
Не можаш дапамагчы, то лепш памаўчы.
Не той друг, што мёдам мажа, а той, што праўду кажа.
Згода будуе, нязгода руйнуе.

паводле Людмілы Цітовай

**1. Якія жыццёвыя парады даюць прыказкі?**

Вывучы словы песні

Леанід Дранько-Майсюк

# Песенька палахлівага Зайца

Я прызнаюся, скажу
(Слухаць будзеце калі вы!) –
Перад кожным я дрыжу,
Бо я Заяц палахлівы.

Я дрыжу перад ваўком,
Перад лісам і сабакам,
Паляўнічым, лесніком;
Перад кожным гукам, гакам...

Прыпеў: Вочы бедныя мае,
Вушы бедныя мае
Страх спакою не дае
Ў крыві не тоне;
Вочы бедныя мае,
Вушы бедныя мае
Лапы бедныя мае,
Дзень і ноч напагатове!

Ад раптоўнае бяды,
Што раптоўная заўсёды,
Я скачу абы-куды
Праз кусты ці агароды ...

Так, глытаючы слязу,
І скачу па Беларусі, -
Дзе капусткі пагрызу,
Дзе травою пераб'юся.

Прыпеў: Вочы бедныя мае...

І на долю – не ды не –
Я пажалюся такую...
Вы паслухалі мяне?
Ну, то дзякуй, – вам скажу я.

Прыпеў: Вочы бедныя мае...

# Тэмы:

1. Цацкі.
2. Адушаўлёныя і не адушаўлёныя, агульныя і ўласныя назоўнікі.
3. Каляды.
4. Коледа!
5. Міфы.
6. Пра багоў.
7. Род і лік назоўнікаў.
8. Пра міфічных істот.
9. Як у казцы.
10. Песня «Літвін».

# Цацкі

Грак перажываў: будзе ў хаце ёлка. Сапраўдная. Першай не памятаў – тата прынёс з гарышча штучны стракач, паначаплялі на яго каляровых шарыкаў ды банцікаў – ёлка была сучасная, як у модных часопісах. Гэта была маміна задума, каб не марнаваць жывых елачак. Жывая елачка адразу пасля Каляд памрэ, казала, высахне і ніколі не стане вялікай ялінай у лесе. Ды ў горадзе паявіліся елкі ў гаршках, з карэннем, якія можна, адсвяткаваўшы, пасадзіць у агародзе, і будуць яны расці на славу. Тата прывёз не вельмі вялікую елку з Беластока – прадавалі іх пад цэнтральным магазінам, разам з ссечанымі дрэўцамі, сярод якіх траплялiся і такія – аж пад столь. А жывая елачка была меншая за Гражынку.

Але ж апранаць яе лёгка будзе, – суцешыў Грак Гражынку. – І зноў тыя банцікі ды шарыкі? А хоць цукеркі павесіце?.. І пернічкі...

Бабуля пакараскалася на гарышча і знесла адтуль вялікую кужэльную торбу – мяшок. Мяшок быў сапраўды вялікі-вялікі, але, відаць, лёгкі – бабуля не стамілася. Ціхенька паставіла ношу на падлогу. Тут цацкі на тваю ёлачку, – сказала з усмешкай Гражынцы.



Грак узяўся развязваць дзюбай тугую завязку, памагаючы сабе лапкамі. У мяшку штосьці хрумсцела, шалясцела, пазвоньвала.

– Ці ўсё гэта змесціцца на такую ёлачку?

Прыйшлося памагаць бабулі – Грак заблытаў вяроўку ў сапраўдны гордзіеў вузел.

У мяшку ляжалі папяровыя ланцужкі, саламяныя лялькі ды павучкі, мноства старэнькіх шкляных шарыкаў, Дзедаў Марозаў ды анёлкаў. Былі яны не такія бліскучыя ды вялікія, як сучасныя, але якія адмысловыя! З цьмянага шкла, са штучным сняжком, паліваныя ў кропкі як мухаморыкі, з дзірачкамі-зоркамі ў таямнічым шкляным нутры... Грак першы кінуўся вешаць гэтыя цуды на галінкі.

– І адкуль жа гэта ўсё? – пляснула рукамі Гражынка. – Шнарыла я па гарышчы, столькі гадоў, а не заўважыла мяшка. Чаму мы гэта раней на ёлку не вешалі?

– А ўсяму гэтаму больш за паўстагоддзя! – паківала галавой бабуля. – Нейк саромелася... Старызна такая...

Міра Лукша





[?]

1. **Раскажы, якія цацкі бабуля знесла з гарышча.**
2. **Ці ў тваёй хаце ставяць ёлку на Каляды? Калі? Якую?**
3. **Як яе ўпрыгожваеце?**

# Адушаўлёныя і не адушаўлёныя, агульныя і ўласныя назоўнікі

Назоўнікі абазначаюць назвы жывых істот і нежывых прадметаў; на гэтай аснове яны падзяляюцца на дзве групы:
**адушаўлёныя назоўнікі**, якія абазначаюць людзей, жывёл, насякомых і адказваюць на пытанне **хто**?
(дзяўчынка, зубр, бусел, пчала, камар);
**неадушаўлёныя назоўнікі**, якія абазначаюць назвы раслін, прылад, з'яў прыроды, пачуццяў і інш. і адказваюць на пытанне **што**?
(бяроза, крапіва, аловак, дождж, жах, смех).

**Агульныя назоўнікі** абазначаюць назвы аднародных прадметаў, з'яў, падзей, паняццяў і інш. Яны пішуцца з малой літары.
(вучаніца, крэсла, настаўніца, месяц, горад, возера, сон, ежа, мара, вецер).

**Уласныя назоўнікі** абазначаюць імёны і прозвішчы людзей, клічкі жывёл, назвы кантынентаў, акіянаў, мораў, рэк, азёраў, астравоў, гор, краін, гарадоў, вёсак, літаратурных твораў, газет, часопісаў і інш.
(Ларыса, Карнілюк, Рыжы, Азія, Ціхі акіян, Балтыка, Нарва, Свіцязь, Карпаты, Польшча, Гайнаўка, Кленікі, «Вясёлка», «Ніва», «Часопіс»)

**1. Запішы па шэсць прыкладаў агульных і ўласных назоўнікаў.**

**2. Прачытай. Знайдзі назоўнікі. Акрэслі, якія з іх адушаўлёныя, неадушаўлёныя, уласныя, агульныя.**

Возера Свіцязь – радасна-задуменнае. Вакол берага звонкі салаўіны гай. Не пушча, не лес, а гай. Лясное возера бязлюднае, але не забытае людзьмі. Паўз бераг цягнецца бітая насыпаная сцежка. Бярозы схіліліся над люстрам вады. Дуб раскінуў магутныя пакручастыя галіны. Стракатыя акунькі ў вадзе ходзяць строем.

Свіцязь ніколі не бывае суровае, рэдка калі хвалюецца. Акружанае ляснымі ўзгоркамі, яно і ў ветраныя дні дабрадушна гасціннае. Вада ў Свіцязі мяккая, што луг. Дно пясчанае, праглядаецца на сотню метраў. Нідзе не выкупаешся так, як у Свіцязі. Проста не хочацца на бераг вылазіць.

Свіцязь – гэта брыльянт Навагрудчыны. Яго ўславіў у сваіх творах Адам Міцкевіч.

паводле Уладзіміра Калесніка

# Каляда

У снег глыбокі паўзем на каленях.
Трава пад снегам спіць бяспечна.
Ў галовах кудлатых каляднае сена
і месяц – халодная свечка.

Маці з іконай гутарыць аб долі
дзяцей, што журавамі адляцелі ў вырай,
п'е вуснамі з блакіту боль іх
і падымае крылы іх малітвы шчырай.

Скрыпяць у небе крывыя дзверы,
саламяныя хахлы выходзяць з садоў,
сядаюць з намі за стол павячэраць
        без слоў.

А стол, як стол. У ім моц і мудрасць дуба.
Моргае вокам сотняй пакаленняў
і падае маладым дрэварубам
        хлеб прабачэння.

**Міхась Андрасюк**

[!]

1. **Апішы настрой верша.**
2. **Растлумач, як разумееш гэтыя радкі: трава пад снегам спіць бяспечна, у галовах кудлатых каляднае сена, месяц – халодная свечка, п'е вуснамі з блакіту боль.**
3. **Хто яны, па-твойму, «саламяныя хахлы»?**
4. **Прачытай уважліва апошнюю страфу верша. Як яе разумееш?**

Вывучы словы песні

# Коледа!

Чый то сыночок
садыв садочок?
Коледа!
Садыв садочок
всё з вышэнёчок.
Коледа!
Олін сыночок
садыв садочок.
Коледа!
А в туом садочку
всё хорошое.
Коледа!
Вышні, чэрэшні,
грушкі, яблушкі.
Коледа!
Грушкі, яблушкі
час обтрэсаты.
Коледа!
Молодого Ваню
час в школу даты.
Коледа!
З школы узявшы
до вуойська даты.
Коледа!
З вуойська узявшы
помужоваты.
Коледа!

*Калядка, якую спявалі ў хаце з нованароджаным дзіцем у Градалях*

[?]

1. Ці разумееш усе словы з гэтай калядкі?
2. Чаму гэтую калядку спявалі бацькам нованароджанага дзіцяці?
3. Ці ты бачыў (бачыла) калядні каў?
4. Што носяць з сабой калядні кі?

# Міфы

**Міфы** — старажытныя народныя аповеды пра паходжанне свету, жыццё прыроды і чалавека.

Міфы ствараліся на працягу многіх стагоддзяў. Нашы продкі, назіраючы за прыродай, тлумачылі з'явы навакольнага свету паводле сваіх уяўленняў, здагадак. Насялялі свет незвычайнымі істотамі, волатамі, багамі і духамі, прыдумвалі фантастычныя гісторыі пра з'явы прыроды. Ад дзеда ўнуку пераходзілі гэтыя паданні — вусныя апавяданні пра мінулае.

Адчуваючы сябе часцінкай прыроды, людзі адухаўлялі яе, верылі, што яна можа дапамагаць чалавеку ў яго штодзённых клопатах альбо, наадварот, шкодзіць яго жыццю. Нашы продкі баяліся сваімі размовамі, дзеяннямі, учынкамі ўгнявіць сілы прыроды і таму ўсяляк стараліся ім дагадзіць, улагодзіць.

Яны абагаўлялі птушак (зязюлю, бусла, ластаўку, ворана), жывёл, звяроў і іншых істот (каня, казу, ваўка, мядзведзя, вужа, змяю), пакланяліся кветкам (папараць-кветцы, зязюльчыным слёзкам, брат-



кам), дрэвам (дубу, бярозе, рабіне, каліне, явару, грушы). Свяшчэнным дрэвам і камяням-валунам дзе-нідзе людзі пакланяюцца і да нашага часу.

Вярба, паводле народных паданняў, — тужлівае і самотнае дрэва, якое заўсёды спрыяе людзям, клапоціцца пра іх; рабіна валодае цудадзейнай здольнасцю лячыць людзей ад хвароб, а асіна і елка, наадварот, лічыліся дрэвамі нядобрымі, іх баяліся разводзіць побач з жытлом. Продкі верылі, што зламанае ці пакрыўджанае дрэва можа жорстка і бязлітасна расправіцца з крыўдзіцелем.

Да нашых дзён захавалася павер'е, што вялізныя густыя дрэвы — дуб, ліпа, вяз, бяроза — валодаюць розумам. А ў купальскую ноч дрэвы нібыта пераходзяць з месца на месца, размаўляюць паміж сабой, і чалавек можа падслухаць іх гаворку.

Асаблівай пашанай карысталіся дрэвы, якія раслі ля крыніц, рэчак, азёраў, бо ў такіх мясцінах людзі звярталіся ў сваіх малітвах і да дрэў, і да «жывой» вады.

Паводле Людмілы Цітовай



[?]

1. Калі і як узніклі міфы?
2. Як нашы далёкія продкі адносіліся да розных з'яў прыроды і навакольнага свету?

# Пра багоў

Свет, на думку нашых продкаў, быў населены багамі, добрымі і злымі духамі. У старажытных міфах багі і духі нагадвалі жывых людзей, кожны з іх меў свой характар, адметны выгляд. Людзі ж маглі толькі прасіць у багоў дапамогі ў сваіх справах і клопатах.

Наймагутнейшы і галоўны з багоў, творца жыцця, бог неба і ўсяго свету, меў некалькі імёнаў — Белбог (Бялун), Дыў (Дзіў), **Сварог**, Стры-бог, Святавіт, часам яго яшчэ называлі Родам (ад яго паходзяць словы «радзіма», «народ», «прырода», «продак», «нараджэнне», «ураджай» і г.д.). Паводле міфаў, Сварог перамог цемру і распачаў жыццё на Зямлі.

Пасля Сварога сталі правіць тры яго сыны-Сварожычы — Пярун, Ярыла і Даждбог.

**Даждбог** — бог Сонца, сонечнага цяпла і святла, апекаваўся над сейбітамі, даваў ім моц і здароўе. Ён лічыўся самым міласэрным з багоў, самаахвярным, добрым, шчодрым, спрыяў урадлівасці палёў, дабрабыту людзей. Раней верылі, што кожную раніцу Даждбог выязджаў на калясніцы са свайго палаца, што знаходзіўся на ўсходзе, за дзень аб’язджаў неба і ўвечары вяртаўся, рухаючыся на захад, у свой нябесны дом на адпачынак.

Старэйшы сын Сварога — **Пярун** (Грамабой) — бог грому і маланак, займаўся зброяй і вайсковымі справамі. Ён быў вельмі падобны да Сварога. Нашы прашчуры ўяўлялі яго магутным волатам з сівымі, чорнымі або вогненна-рудымі кучаравымі валасамі і доўгай барадой. Калі ён імчаўся на калясніцы па небе, раздаваліся страшэнныя грымоты. Лічылі, калі ўздыхне Пярун — узнімецца вецер, дзьмухне — усходзіцца навальніца. У руках ён быццам трымаў лук-вясёлку і стрэлы-маланкі, якія шпурляў на зямлю. Ударамі маланак грозны бог мог пакараць любога, на ўсіх ён наводзіў жах. Грамабой супрацьпастаўляўся нячыстай сіле — Яшчару, Ягіне, Змею, д’яблу, чорту,

якіх ён заўсёды імкнуўся знішчыць сваімі стрэламі-маланкамі. Міфы сцвярджаюць, што на месцах бойкі Перуна з нячыстай сілай з'явіліся валуны, якія і зараз на Беларусі называюць ці Князем-каменем, ці Гаспадаром-каменем, ці проста Перуном. Грамабой паліваў зямлю дажджом, змушаў прыроду абуджацца, каб даць новы ўраджай. Пад канец восені ён засынаў, маразы закоўвалі яго ў хмары, і ён усю зіму спачываў на небе. І толькі з прылётам птушак зноў ажываў.

**Ярыла** (Яр) — бог урадлівасці і кахання — нібыта кіраваў на Зямлі стварэннем моцнага і здаровага роду. Ярылу лічылі богам веснавога агню, абуджэння прыроды. Ён расчыняў нябесныя вароты і спускаўся на зямлю, пачынаючы вясну. Ярылаў агонь сягаў глыбока ў нетры, саграваў зямлю, якая нараджала дрэвы і расліны, гадавала ўраджай. Ярыла ўсім істотам даваў моц (ярасць): выразы «ярая сіла», «ярая пчолка», «ярына ў полі» паходзяць ад яго імя. Нашы продкі ўяўлялі Ярылу прыгожым маладым вершнікам на белым кані, у белай вопратцы, часам з чырвонай накідкай на плячах, у вянку з веснавых раслін, з зялёнымі галінкамі ў руцэ. Там, дзе ён ступаў басанож, адразу вырастала густое жыта.

Ярылу дапамагалі багіня веснавога абуджэння і кахання **Лада** (Ляля, Лёля), бог ураджаю і дастатку **Купала** і багіня лета **Цёця** — значна старэйшая за Лялю, мажная, прыгожая, прыбраная жытнёвымі каласамі, са спелымі пладамі ў руках. Ладу-Лялю ўяўлялі высокай прывабнай маладзенькай дзяўчынай, у белай сукенцы, упрыгожанай зялёнай лістотай, з вяночкам палявых красак на галаве. Яна вельмі шчодрая. Маладым дзяўчаткам яна штогод давала вяночкі, якія захоўваліся да наступнай вясны (а хто з дзяўчат выходзіў замуж, гэты вяночак зберагаў усё жыццё).

Шанавалі нашы продкі і бога зімы **Зюзю** — нізенькага дзядка з белымі валасамі і белай як снег барадой, у белай вопратцы. Хадзіў ён басанож, з непакрытай галавой. Зюзя, нібыта, жыў у лесе, толькі часам зазіраў у вёску, каб папярэдзіць пра моцныя маразы, паесці навагодняй куцці — святочнай кашы. Раззлаваўшыся за што-небудзь

на людзей, Зюзя пачынаў моцна марозіць, стукаў сваёй булавой, так што часам трашчалі дрэвы ў лесе, трэскаліся хаты. Каб ён зусім не разваліў жытло і не памарозіў азімае збожжа, продкі стараліся яго задобрыць, запрашалі на калядную вячэру.

Нашы прашчуры пакланяліся нябесным свяцілам, і найперш — сонцу, якое было крыніцай жыцця. Людзі радаваліся сонечнаму святлу і цяплу, услаўлялі сонца ў абрадах, песнях, танцах. Маленькім сонейкам на Зямлі лічыўся агонь, што абаграваў людзей, ахоўваў іх ад драпежнікаў, даваў магчымасць прыгатаваць ежу. Бога агню **Жыжаля** (Зніча) высока шанавалі і разам з тым вельмі асцерагаліся. Яго лічылі апекуном падземнага агню і кавальскага рамяства. У сваёй вогненнай кузні пад зямлёй Жыжаль, непакорны і мужны, каваў зброю, каб скінуць Перуна. Калі магутны волат затрымліваўся ў кузні, зямля перагравалася, пачыналася засуха, гарэлі лясы і тарфянікі.

Надзвычай аўтарытэтным у тыя далёкія часы быў у нашых продкаў **Вялес** (Велес) — бог дабрабыту і мудрасці, апякун жывёлагадоўлі. Лічылі, што Вялес — гэта Месяц на небе, а зорны россып — ягоны статак. З нябесных вышынь Вялес пільна сачыў за жывёлай на зямлі, старанна яе ахоўваў ад драпежных звяроў, хвароб, няшчасных выпадкаў. Пастухі ахвотна прыносілі яму ахвяры. Вялес, спускаючыся з неба, нібыта набываў аблічча быка, часам чалавека-асілка з вялізнымі бычынымі рагамі.

Міфы распавядаюць пра спрадвечную барацьбу светлых і цёмных сіл (дабра і зла) за ўладарства над Сусветам.

паводле Вольгі Цітовай

[?]

1. **Адкуль у розных мясцінах, згодна з легендай, да нашых дзён захавалася шмат камянёў?**
2. **Апішы добрых багоў. Чым яны спрыялі людзям?**

# Род і лік назоўнікаў

**1. Вызначы род назоўнікаў:**

немаўлятка, камп’ютар, валун, папера, пляж, дрэўца,
кветка, здымак, сабака.

**2. Пастаў назоўнікі ў форму множнага ліку.**
**Дапасуй канчатак -ы або -і.**

| | | |
|---|---|---|
| стол – ... | поле – ... | чаравік – ... |
| гняздо – ... | зорка – ... | рука – ... |
| нага – ... | заплечнік – ... | акно – ... |
| нос – ... | лес – ... | вецер – ... |

Ёсць назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў форме адзіночнага ліку.
Да іх адносяцца:
**уласныя:** Гайнаўка, «Ніва»,
**абстрактныя:** старасць, каханне,
**зборныя:** грамадства, лісце, збожжа,
**рэчыўныя:** соль, медзь.

Ёсць таксама назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў форме множнага
ліку. Да іх належаць назвы:
**парных і непадзельных прадметаў:** акуляры, дзверы, нагавіцы,
**рэчываў ці прадуктаў:** крупы, дрожджы, дровы,
**адрэзкаў часу:** канікулы, суткі,
**дзеянняў, гульняў, народных абрадаў:** выбары, хованкі, хрысціны.

**3. Прачытай. Вызначы род назоўнікаў. Запішы назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў адзіночным ліку.**

кефір, мука, лыжка, выдатнік, чысціня, хмара, малако, крэсла,
дом, святло, гліна, вечар, поўдзень, усход, школа, кіно,
сэрца, кацяня, ластаўка

**4. Спішы і падкрэслі назоўнікі, якія выступаюць толькі ў множным ліку.**

дарогі, шпалеры, акуляры, абцугі, нажніцы, нагавіцы, спадніцы,
цацкі, вароты, ліхтары, вакацыі, гульні, адзнакі, санкі, падручнікі,
лапаты, граблі

# Пра міфічных істот

Бліжэй да штодзённага жыцця нашых прашчураў стаялі духі — добрыя і злыя. Людзі лічылі, што фантастычныя істоты насялялі палі, лясы, рэкі, азёры, балоты, яны ўладкоўваліся ў хатах, хлявах, лазнях, абжывалі гарышчы, коміны, туліліся пад печкай.

На полі і на лузе валадарыў **Палявік** (Жыцень, Аўсень). Ён клапаціўся пра добры ўраджай на палях і сенажацях, выганяў з іх шкоднікаў. Палявік звычайна хаваўся на ўзгорку, ля каменя, куста, у канаўцы. Зрабіўшыся страшным ценем, любіў палохаць людзей, са свістам і рыкам гнаўся за чалавекам, заманьваючы яго на санцапёк, і там закалыхваў да непрытомнасці. Узімку Палявік заносіў снегам канавы, каб падарожнік, збіўшыся са шляху, праваліўся ў іх і замерз. Лічылася, што Палявік баіцца макрэчы і надта няўтульна пачуваецца вясной і восенню. Каб падмануць людзей, Палявік нібыта набываў чалавечае аблічча — выглядаў рослым светлавалосым хлопцам.

У лясах гаспадарыў **Лесавік** (Лясун, Пушчавік, Баравік) — вялізны, у рост самых высокіх дрэў у лесе, барадаты стары, у звярыных шкурах на пакрытым поўсцю целе, з белым, як бяроста, тварам. Вушы ў Лесавіка надта вялікія, большыя за галаву, адтапыраныя ў бакі, таму ён часта чапляецца за кустоўе і дрэвы, а потым страшэнна злуецца і шыпіць ад болю. Вочы ў ляснога гаспадара невялікія, свецяцца нават удзень. Рукі доўгія, моцныя, імі ён можа ахапіць зараз значны кавалак лесу, асабліва калі за некім гоніцца. Ногі ў Лесуна тоўстыя, велічэзныя. Абуваецца ён па-свойму: правы лапаць (ці бот) нацягвае на левую нагу, а левы — на правую. Лесавіку прыслужваюць вятры: калі ён куды-небудзь ідзе — наперадзе і ззаду ў яго равуць вятры, якія ўсё змятаюць на шляху гаспадара. Паваленыя дрэвы, высокія гурбы снегу людзі лічылі справай рук Лесавіка. Ён часам спрыяў людзям, выводзіў з лесу тых, хто зблудзіў, паказваў грыбныя і ягадныя мясціны, наганяў у бок паляўнічага звяроў і птушак, выбіраў бортнікам

месца для ўстаноўкі калод з пчоламі. Разам з тым Лесавік часта здзекаваўся з чалавека, прымушаў яго доўга блукаць на адным месцы, мог пакараць за нядбайныя паводзіны ў лесе. Таму людзі стараліся не гнявіць ляснога гаспадара. Яны ведалі, што, каб падмануць Лесуна, варта апрануць вывернутыя світку ці кажух, а каб заблытаць свой шлях, трэба прайсці частку адлегласці задам наперад.

Поўнаўладным гаспадаром чалавечага жытла быў **Дамавік** (Хатнік, Падпечнік, Гаспадар). Яго ўяўлялі сівенькім дзядком, у белай кашулі, падпяразанай дзягай ці лыкам, з доўгімі валасамі, доўгай сівой барадой. Лічылася, што ён жыў у хаце (пад печкай ці пад падлогаю) або ў хляве, тады яго часам называлі Хлеўнікам. У кожнай хаце нібыта быў свой Дамавік, ён лічыўся заўсёды дбайным гаспадаром, ахоўваў дом, маёмасць, падтрымліваў агонь у печы, клапаціўся пра гаспадарку, карміў і песціў жывёлу, назіраў за хатнімі справамі. Пры апякунстве Дамавіка ў хаце ўсё ішло сваім парадкам. Людзі стараліся задобрыць яго, бо калі ён раззлуецца, то будзе шкодзіць — біць посуд, перастаўляць хатнія рэчы, прынясе разлад у сям'ю, неўраджай на ніву. Дамавік часта дазваляў сабе і пажартаваць: скакаў па лавах у хаце, сенцах, стукаў у сцены, казытаў ці шчыпаў уночы соннага. Аднак



Дамавік



Лесавік







ён заўсёды чула ставіўся да гаспадарскай сялібы, папярэджваў сям'ю аб няшчасцях: пачынаў па начах стагнаць, плакаць, завываць, моцна грукаць у дзверы. Разам з тым Дамавік лічыўся надзвычай патрабавальным: за бескарыслівую дапамогу ён вымагаў пашаны і паслухмянасці ад гаспадара і яго сям'і, не любіў, каб у хаце віселі люстэркі, маскі, пратэставаў супраць вясёлых і шумных гульняў, зборышчаў у хаце. Асабліва не падабалася Дамавіку, калі ля парога ляжала кошка ці якая іншая жывая істота, бо яна замінала хадзіць з хаты ў сенцы і назад. Дзейнічаў Дамавік звычайна ўночы: падсушваў збожжа, раздаваў сена жывёле, заплятаў коням грывы, ласкава гладзіў іх. Аднак, каб Дамавіку падабалася жывёла, трэба было выбіраць кароў і коней пэўнай масці, пад колер барады гаспадара. Раніцаю Дамавік палохаў пеўня, штурхаючы яго, каб той своечасова разбудзіў сям'ю. Часам Дамавік, як здавалася нашым продкам, мог нават пераўвасабляцца ў вужа, змяю, жабу, ката ці сабаку.

Духі акружалі чалавека паўсюдна. У рэчках, азёрах або вадаёмах, дзе вада ніколі не прамярзае, гаспадарыў Вадзянік — стары з доўгай барадой, доўгімі валасамі на галаве ў форме кліна, гладкай бліскучай скурай. Усё цела яго пакрывалі ці то валасы, ці то водарасці, паміж пальцаў — перапонкі, рукі і ногі былі надзвычай доўгімі. Вадзянік мог жыць толькі ў вадзе, на сушы ён гінуў, прычым ад яго цела заставаўся толькі шматок ціны ці водарасцей. Калі ж гэты шматок укінуць у ваду, Вадзянік зноў ажыве і будзе назаўсёды ўдзячны выратавальніку. Вадзянік, раз'язджаючы на соме, ірваў рыбацкія сеткі, раскрываў плаціны на млынах, падпільноўваў тых, хто купаўся, каб у любы момант забраць да сябе. Днём Вадзянік звычайна адпачываў на дне, і толькі як сядзе сонца, ён пачынаў сваволіць. Злавіўшы ахвяру, ён доўга мучыў яе, цешыўся з яе адчайных спроб выплыць, пакуль яна, зрэшты знясіленая, не апускалася на дно.

Ваўкалакі нібыта былі зусім ручнымі, як хатняя жывёла, яны ніколі не палявалі на жывёлу ці чалавека і харчаваліся травой, каранямі, ягадамі, лістотай. Яны не гублялі чалавечых пачуццяў, не страчвалі памяці

і свядомасці, захоўвалі здольнасць думаць і перажываць. Яны звычайна вельмі жаласна вылі і стагналі, як хворыя людзі, у напрамку сваёй вёскі. У такім зачараваным стане ваўкалакі жылі ад нямногіх дзён да некалькіх гадоў, іх ніколі не ператваралі на ўсё жыццё.

Беларускія міфы расказваюць пра духаў, часцей варожа настроеных да людзей. Духі «засявалі» палі камянямі, адбіралі ў кароў малако, насылалі хваробы і мор на людзей і жывёлу. Усім вядомая казачная Баба Яга сустракаецца ў многіх міфах. Гэта злая чараўніца, гаспадыня ўсіх ведзьмаў, страшная, чорная, раскудлачаная, заўсёды вымагала чалавечых ахвяраванняў. Дапамагалі ёй аднавокае Ліха, страхалюдны Карачун, усім вядомы яшчэ з ранняга дзяцінства Кашчэй і заўсёдныя спадарожніцы Ягі — ліхаманкі. Гэтых сясцёр-ліхаманак было дванаццаць, вечна галодных, агідных, кашчавых, злосных. Бязлітасныя ліхаманкі шукалі прытулку і спажывы ў чалавечых хатах, прыносілі хваробу. Няшчасны быў той, хто трапляў у іх кіпцюры. Кожная з сясцёр па-свойму даймала чалавека: Трасея — трэсла, Агнея — паліла жарам, наганяла высокую тэмпературу, Гняцея гняла і адбірала спакой і радасць жыцця, Лядзея марозіла і калаціла ад холаду, Ламея ламала ўсе косці, Грудзея ўскоквала ў грудзі, выклікаючы кашаль, Глухея закладвала вушы. Самая страшная — старэйшая сястра Навея. Калі ўжо яна ўваб'ецца ў чалавека — ён не мог разлічваць ні на які паратунак, мусіў пакідаць гэты свет, развітвацца з жыццём.

Міфы з'яўляюцца часткай багатай беларускай культуры. Непасрэдна са старажытных міфаў выраслі казкі, легенды, народныя песні. Міфы і сёння хвалююць пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, якія выкарыстоўваюць міфалагічныя сюжэты і вобразы ў сваіх творах.

паводле Вольгі Цітовай

**1. Якія духі цябе найбольш уразілі? Раскажы пра іх.**
**2. Як прадстаўлены сілы зла ў старажытных міфах? У якіх абліччах яны выступаюць?**

# Як у казцы

*(Скарочана)*

Даўно было — мо тысячу год назад, а мо яшчэ болей, — як сталі жыць, размнажацца і ў славу расці ўдалыя прашчуры нашы — дрыгавічы, крывічы і палачане.

Важны быў гэта народ, і паміж суседзямі меў ён добрую песню і праўдзівае паважанне. З далёкіх заморскіх старон — з зямлі Варшаўскай, з царства Візантыйскага і з другіх знакамітых дзяржаў і каралеўстваў прыязджалі па моры і па сушы багатыя госці з багатымі таварамі — шоўкам, бісерам, янтаром ды іншымі каштоўнымі скарбамі. Заморскія госці ведалі, што народ, да якога ім дарога ляжала, быў сэрца мяккага, рупны гасцінаю і багаццем асаблівым адзначаўся... Бо не зачынялі нашы прашчуры весніц і дзвярэй хат сваіх перад званым ці нязваным госцем падарожным; нават калі выходзілі з сяліб сваіх рыбу ў невады лавіць ці з лукам звера пушнога сачыць, то і тады замкоў не зналі, а яшчэ пакідалі ў хатах пад абрусамі бохан хлеба пшанічнага і дубовыя дзежы сотаў пчаліных — гэта каб госць меў чым з дарогі пажывіцца.

Вера ў нашых продкаў была трохі іншая, як цяпер, бо не аднаго бога мелі, а некалькі, і прозвішчы багі мелі не такія, як цяпер; называліся яны: Сонца, Пярун, Каляда ды і іншыя яшчэ. Алтарнымі слугамі багоў гэтых былі варажбіты-вешчуны — старцы мудрыя і ў справах божых дасведчаныя. Не было, праўда, узнесеных на хвалу божую ні з камення, ні з дрэва святыняў і алтароў, золатам набіваных, — былі толькі запаведныя лясы і гаі цяністыя, дзе складаліся ахвяры багам прамудрым. Просты быў народ, і крывадушнічаць не ўмеў ён у веры сваёй. Ведаў толькі, што найлепей гаварыць з небам, гледзячы ў неба.

А хто хаваецца ад сонца, у таго на душы цёмна.

А чыстае, відаць, сумленне мелі прадзеды нашы.







Заезджыя госці дзівіліся гэткаму, па-іхняму незвычайнаму, парадку ў справах адносін між людзьмі і багамі; не разумелі, як гэта можна замест аднаго мець некалькі багоў і не мець багатых харомаў, збудаваных у гонар і хвалу Бога свайго. Дзівіліся, бо госці заезджыя былі веры іншае і звычаяў гэткіх у сябе не мелі.

Мала-памалу заморскія госці сталі прывозіць са сваімі заморскімі скарбамі і думкі іншыя: прывезлі яны новага Бога, Бога з крыжам. Не хацелі спачатку прымаць новай веры дрыгавічы і крывічы, ды палачане ад іх не адставалі, а пасля з дабраты сваёй і рупнасці гасціннай прынялі, падумаўшы, да сваіх старых багоў і новага Бога; адно толькі варажбіты-вешчуны, старцы мудрыя і ў законах веры дасведчаныя, старых толькі багоў трымаліся. Памерлі старцы мудрыя — на іх касцях закрасаваў новы ўсёмагутны Бог, сталі легіёны алтарных служыцеляў праслаўляць яго, тысячы з медзі літых званоў хвалу яму разносіць, ды так далёка, як Зямля наша вялікая, і яшчэ далей, ажно на край свету.

А старыя багі? Яны прыціхлі, прытуліліся, але не памерлі зусім у душах свайго народу. Жывуць, як даўней жылі, — у песнях, казках, былінах...

Янка Купала

1. **Як прадсатўлены ў творы нашы продкі? Якога светапогляду яны трымаліся, якой веры?**
2. **Што здзіўляла заезджых гасцей? Як яны паводзілі сябе на зямлі нашых продкаў?**
3. **Чаму нашы продкі прынялі да сваіх старых багоў і новага Бога?**
4. **Як ты думаеш, чаму варажбіты-вешчуны старых толькі багоў трымаліся?**
5. **Якія новыя парадкі ўсталяваліся на нашай зямлі?**
6. **Што сталася са старымі багамі? Як пра гэта гаворыць аўтар?**

Вывучы словы песні

Зміцер Сасноўскі

# Літвін

Ехаў Літвін ды па Сініх Водах
Тры дні тры начы,
Тры дні тры начы
Меч крывавячы.

Ходзіў Літвін ой ды па Грунвальду
Тры дні тры начы,
Тры дні тры начы
Чэпам граючы.

Гойсаў Літвін ой ды па Крапіўне
Тры дні тры начы,
Тры дні тры начы
Дзідай джалячы.

Скокаў Літвін ой ды пад Смаленскам
Тры дні тры начы,
Тры дні тры начы
Шабляй рубячы.

Кляўся Літвін у святой Дуброве
На старым мячы,
На старым мячы
Чужынцаў сячы.



## *Тэмы:*

1. Вадзянік.
2. Пра сяброўства Вадзяніка і Лесуна.
3. Скланенне назоўнікаў.
4. Маскарад.
5. Зімой.
6. Нескланяльныя назоўнікі.
7. Валянцінкі.
8. Уцякала зіма ад вясны.
9. Песня «Залюляю, як кахаю».



# Вадзянік

Сівавусы, згорблены, я залёг між цінай
І гадамі грэюся — сплю на дне ракі.
Твар травой аблытаны, быццам павуцінай,
Засыпаюць грудзі мне жоўтыя пяскі.

Над вадой ля берага ціха спіць асока,
Ды лаза зялёная жаліцца-шуміць,
Хвалі ціха коцяцца і бягуць далёка, —
І ўсё навокала сном адвечным спіць.

Максім Багдановіч

[!]

1. **Якім паказвае Вадзяніка паэт? Зачытай адпаведныя радкі з верша.**
2. **Як аўтар малюе мясціны, дзе жыве ўяўны гаспадар ракі?**
3. **Якія ўласцівасці набываюць у вершы асака, лаза і хвалі?**
4. **Што абудзіла фантазію паэта і паўплывала на стварэнне верша?**

# Пра сяброўства Вадзяніка і Лесуна

Жыў у возеры Доўгім, што каля Глыбокага Вадзянік. Не сотню год і не трыста, а мо цэлую тысячу. Гаспадарыў спраўна: даглядаў азёрныя берагі, каб чаротам дужа не зарасталі, чысціў-выгладжваў дно, аздабляючы рознакаляровай глінай, гадаваў малькоў, лячыў жыхароў, разбіраў іх спрэчкі, час ад часу рабіў перапіс усіх насельнікаў возера, вёў улік відаў водарасцей... Працы хапала аж занадта.

Як быў маладзейшы, дык паўсюль паспяваў: і нырца на самую глыбіню даць, каб на дне прыбрацца, і ўздоўж усяго берага абярнуцца. Але пакуль быў у сваёй сіле, што яму тыя кіламетры! Нават калі-некалі знаходзіў хвілінку, каб на госці да свайго даўняга сябра Лесуна зазірнуць. Вадзянік хоць і праводзіў большую частку свайго жыцця пад вадой, але ўсё ж мог крышку і паветрам падыхаць. А вось Лясун пад вадой – ні-ні. Памеркаваўшы, знайшлі выйсце: надумалі сустрэчы ля самага возера ладзіць, бо лес якраз да вады падступаўся. Пасядзяць, пагутараць пра тое-сёе, навіны адзін аднаму перакажуць, у карты разок-другі перакінуцца. Вадзянік праз колькі хвілін акунецца, каб асвяжыцца, – і зноў як новенькі. Хоць і былі яны даўнімі дружбакамі, але кожны раз спрэчка ў іх заходзіла: дзе лепш жыць – у лесе ці ў возеры, і ў каго гаспадарка лепшая. Вядома – кожны свой куток хваліў.

Лясун, частуючы Вадзяніка ляснымі прысмакамі – мёдам, ягадамі, грыбамі, арэхамі – заўсёды першы заводзіў:

– Частуйся, суседзе. Ласуйся. На тваіх глыбінях, пэўна, няма такога.

Гэта была чыстая праўда. Але Вадзянік аж гарачыцца пачынаў, даводзячы пра вартасці і перавагі падводнага жыцця:

– Ну і няхай сабе ў мяне такога смакоцця няма. Бач, вельмі ж глыбокае ў мяне возера. На дне гарачым летам дрыжыкі прадаю. Дзе там што расці будзе! Адны водарасці! Але ж і я маю чым ганарыцца.

Вада ў мяне чыстая-празрыстая. Дно высцелена рознакаляровай глінай: і ружовай, і зеленаватай, і бурай. Самыя глыбіні аздоблены чорным і аліўкавым глеем. Не налюбавацца!

Лясун толькі пасмейваўся ў бараду:

– Лацно табе хваліцца, браце. Я ж ніколі тваёй гаспадаркі не бачыў. Ты можаш навыдумляць самых неверагодных дзівосаў – а як мне праверыць?



– Як гэта – навыдумляць? – гарачыўся Вадзянік. – Я табе за сведку найстарэйшага жыхара свайго возера прывяду – рачка Лімнакалянуса. Ужо яму якраз мусіш паверыць! Яго прадзеды нават памяталі, як нарадзілася маё возера...

Вадзянік разыходзіўся не на жарт. І кожны раз забываўся, што рачок той нізавошта не стаў бы турбавацца дзеля двух дружбакоў-спрачальнікаў, бо жыве ён на самых глыбінях і трываць не можа цёплай вады. Лясун ужо ведаў гэта, таму не прамінаў пакпіць:

– Э-э, браток, што мне твой Лімнакалянус? Сам жа казаў, што ён аднавокі, як цыклоп. Што на глыбіні адным вокам разгледзіш? Ды і байку пра раставанне ледніка, з якога тваё возера нарадзілася, я ўжо на памяць ведаю. Але калі той ляднік быў і ці быў наогул?

– Быў! Многа тысяч год таму... І гэта – чыстая праўда! – даводзіў Вадзянік.

– Дакумент маю!

– Пакажы!

– Ты ж ведаеш, захоўваецца ён у Камісіі па азёрных справах. Там і радаслоўная наша – вадзянікоў возера Доўгага – да прапрапрапрапрапра...

На гэтым бясконцым «прапрапра...» спрэчка звычайна і аціхала. Бо Вадзянік, асоба адказная, не хацеў перабольшваць заслугі свайго роду перад возерам, але і замоўчваць іх не збіраўся. А тыя прапрапрадзеды, якіх было не менш дванаццаці, заўсёды блыталіся на языку і ніяк не хацелі ў радок выстраіцца.

Калі папраўдзе, Лясун асабліва не сумняваўся ў словах Вадзяніка. Але ж вельмі хацелася на свае вочы пабачыць гаспадарку суседа. Да сур'ёзнага разладу ў іх ніколі справа не даходзіла – паспрачаюцца і адразу забудуцца на спрэчку. Вадзянік, удзячны за гасцінны прыём, запрашаў Лесуна хоць рыбу ў яго возеры павудзіць. І тады ўжо шчыраваў, падганяючы рыбак бліжэй да кручка, каб задаволіць суседа.

Час ішоў. Вадзянік і Лясун старэлі. Асабліва гаспадар возера апошнім часам здаў. Можа, не хапала яго костачкам цяпла, а можа,

сырасць даймаць стала. Ды і старэйшы ж ён быў не на адну сотню гадоў. Адным словам, ён ужо не паспяваў на сваіх старэчых нагах па ўсім возеры матляцца. То тут, то там бачыў Вадзянік свае недаробкі, кідаўся іх выпраўляць, але сіл на ўсё не ставала. Гаспадарка пачала гібець...

Добра падумаўшы, знайшоў-такі Вадзянік выйсце. Пакорпаўся сярод глею на дне, адкапаў вялікую ракавіну-жамчужніцу. Звіў з самых моцных водарасцей вупраж. А пасля дамовіўся з паўпудовым Шчупаком і метровым Вугорычам – сапраўднымі волатамі і старажыламі – каб згадзіліся сябе ў такую павозку запрэгчы. Раз'язджаючы ў ёй, Вадзянік паспяваў дагледзець кожны куточак. Справа пайшла на лад. Зноў гаспадарка Доўгага возера квітнела. Але ўжо паседжваць з Лесуном, па праўдзе кажучы, часу не хапала. Толькі гукне Вадзянік, выплыўшы на мелкаводдзе:

– Як маешся, дружа?

Лясун адразу да возера кіруецца, адгукаецца:

– Ды нішто. А ты як?

– І я нішто.

– Дык, можа, на госці завітаў бы?

– Што ты, браце! Няма калі. Бывай!

І зноў кожны па сваіх справах спяшаецца.

Наталля Бучынская

1. **Зрабі характарыстыку герояў апавядання.**
2. **Выканай партрэт аднаго з іх.**
3. **Ці гэта сапраўдная жывёліна лімнакалянус? Раскажы, што ты ведаеш пра яе.**
4. **Растлумач значэнне словазлучэнняў:**
   ***спраўна гаспадарыць, быць у сваёй сіле,***
   ***пасмейвацца ў бараду,***
   ***справа пайшла на лад,***
   ***гаспадарка квітнее.***

# Скланенне назоўнікаў

**1. Запішы сказы. Замест кропак устаў слова *ліса.***

(хто?) ... – хітры рыжы звер. Хвост у (каго?) ... прыгожы, пушысты. У пошуках ежы (каму?) ... прыходзіцца прабягаць дзясяткі кіламетраў. У лесе (каго?) ... можна ўбачыць толькі здалёк. У заапарку ж вы можаце стаяць амаль побач з (кім?) ... . Многа казак складзена аб (кім?) ... .

Змяненне назоўнікаў па пытаннях называецца **змяненнем па склонах**, або **скланеннем**.

**2. Прачытай, што расказваюць пра сябе склоны:**

**Назоўны склон**: – Я называю асобу або прадмет, які выконвае якое-небудзь дзеянне або мае прымету.
Родная (хто?) **сястра**. (хто?) **Матыль** лётае. (што?) **Сонца** свеціць.

**Родны склон**: – У сказе можна мяне пазнаць з дапамогай слова *няма* (каго? чаго?).
Няма (каго?) **сястры**. Няма (каго?) **матыля**. Няма (чаго?) **сонца**.

**Давальны склон**: – Разам са мной назоўнікі называюць асобу або прадмет, для якога нешта робяць. Пазнаць мяне дапаможа слова *даваць* (каму? чаму?).
Даваць (каму?) **сястры**. Падараваць (каму?) **матылю**. Даць (чаму?) **сонцу**.

**Вінавальны склон**: – Вы пазнаеце мяне, калі падставіце слова *бачу* (каго? што?).
Бачу (каго?) **сястру**. Бачу (каго?) **брата**. Убачыць (што?) **сонца**.

**Творны склон**: – Пазнаць мяне дапаможа слова *ганаруся* (кім? чым?).
Ганаруся (кім?) **сястрой (сястрою)**. Ганаруся (кім?) **братам**. Ганаруся (чым?) **сонцам**.

**Месны склон**: – Я завуся месным, бо з маёй дапамогай назоўнікі часта абазначаюць месца.
Шукаць (на чым?) **на сонцы**.
– Я магу называць таго, аб кім гавораць, або тое, аб чым думаюць.
Гаварыць (аб кім?) **аб сястры**. Сумаваць (па кім?) **па хлопцу**.
Думаць (аб чым?) **аб сонцы**.
– Ад сваіх сяброў-склонаў я адрозніваюся тым, што не магу ўжывацца без прыназоўнікаў.

# Маскарад

– Цяпер нават на дыскатэку не пойдзеш неапрануты! – ляментавала Гражынка, перакідаючы адзенне ў сваёй частцы шафы. Грак паварушыў усімі сваімі пёрамі, бы чалавек, узняўшы бровы ў здзіўленні: як гэта так – неапрануты? Выйсці ж трэба на вуліцу, на холад, а ў людзей няма нязменнага ўласнага адзення, такога зручнага, як пёры ці поўсць. Людзі мусяць апранаць адзенне, кожны раз іншае, і нават яго на сабе не чысцяць, а, папэцканае, укідаюць у пральную машыну ці мыюць рукамі ў вадзе. Такі вось Грак прычэшацца дзюбай, павыбірае, што не трэба між пёрак, кожнае выгладзіць – і Грак як грак, прыгожы, чысты, шыкоўны. А Гражынка ўсё ж перабольшвае! І так адзення мае найбольш у хаце, ды і маміна падбірае. Праўда, толькі боты ды шапачкі, бо ў мамінай вопратцы згубілася б. А ад бабулі пазычае хустачкі ды шалікі, бывае, нават не пытаецца. А ў прабабулінай ваўнянай хустцы-шаліноўцы таксама хадзіла...

– Ну што, не маеш зноўку што надзець? – азвалася бабуля. – Гэта ж толькі карнавальная дыскатэка. Як успомню карнавальныя балі маёй маладосці!..

– Вось! Як жа ж мне апрануцца на баль-маскарад!

– Надзень маску! – Граку прыпомнілася, што на шафе ляжыць закінутая маска Лісіцы-Хітрыцы, ужо пакрытая пылам, бо на шафу цяжка ўскараскацца; толькі ён, адзіны ў хаце, можа свабодна хадзіць па шафе.

– Я ўжо не дзіцятка! – абурылася Гражынка.

– Усе паненкі, пэўна, хочуць быць прынцэсамі ды каралеўнамі, а хлопцы – Зора, каўбоямі, Бэтмэнамі... – паківала галавой мама. – Ну, ніякай фантазіі...

– Я хачу быць... прыгожая, чароўная, каб стаць каралевай балю.

– Чароўнай? Дык пераапраніся ў... чараўніцу! – усцешыўся Грак. – За Бабу Ягу! Трэба вялікі нос кручком начапіць... Ну, прынамсі, такі, як мая дзюбка...

– Вось табе і... чароўнасць, вось табе і краса! – засмяялася бабуля. – Станеш, несумненна, каралевай балю.

– Нос як нос... – падумаў Грак. – А можа вазьмі мяне. Буду сядзець у цябе на плячы...

– Добра, вазьму. Сядзі толькі і... маўчы!

– Гэтага абяцаць табе не магу! – Грак зноў варухнуў пер’ем па ўсім гракавым целе.





# Рыжая

Грак першы раз аказаўся ў школе. Праўда не на ўроках, а меў быць у спартыўнай зале, дзе праводзілася карнавальная дыскатэка, адкуль далятала гучная музыка. І папраўдзе быў ён пакуль што ў гардэробе, яшчэ сядзеў у Гражынчынай торбачцы. Скураную сумку падарыла ўнучцы бабуля. Грак стаяў на дне, сценкі торбачкі ціснулі яму на бакі, а дыхаў ён праз расшпілены верх, закончаны залатой бубкай, якая, калі сціснуць пашчу сумкі, рабіла «клік!» і сашчамляла абодва яго бакі. Зусім як сумачка адной незямной жанчыны з аднаго фільма, з якой выскочыла незямное стварэнне – Грак бачыў той фільм і якраз тое найбольш з усяго яму спадабалася. Тут перашкаджала яму адно – збоку, засунуты ў другую кішэньку, электрамагнітна пульсаваў Гражынчын мабільнік. Добра, што хоць маўчаў ён, але хвалі Грак адчуваў вельмі моцна.

Гражынка папраўляла свой строй маладой чараўніцы-варажбіткі. Цыганская спадніца з квяцістай вялікай хусткі, на чырвонай блузцы некалькі вязак караляў, на распушчаных кудзерках – жоўтая хустачка, павязаная назад, у вушах – срэбныя колы...

– Знакаміта! – Грак вылез з сумкі, сеў на залатую бубку і залюбаваўся сяброўкай.

– Ты ціха сядзі! – замахала рукамі дзяўчынка. – Залазь назад.

– Я не прыехаў сюды, каб у торбе сядзець, – пакрыўдзіўся Грак.

– Я ж – элемент тваго касцюма, так сказаць.

– Прыйдзе Косця, пакрыўдзіць цябе яшчэ... Чаго ж я цябе ўзяла, зусім не падумала пра яго...

– А што, такі благі той Косця? Птушак крыўдзіць?

– Можа і не такі благі, ды бяздумны. Махае рукамі. Да чаго дакранецца, усё псуецца.

– А можа, гэта выпадкова? Бывае ж такое і сярод птушак!

– Рыжая, рыжая ведзьма! – у гардэроб убег беленькі хлопчык.

– Ты гэта так на маю Гражынку?! – Грак учаперыўся яму ў светлыя валасы.

– Я на баль сюды прыехаў, і такое чую?!

Косця з лямантам вырваўся з гардэробу. Грак ускочыў на залатую бубку:

– Ну, справа аформлена. Ідзем гуляць. Трэба выхоўваць маладых!

Міра Лукша



[?]

1. **Як выглядала падрыхтоўка Гражынкі да балю?**
2. **Як вырашыла апрануцца дзяўчынка?**
3. **Растлумач, чаму загаловак другога тэксту «Рыжая»?**
4. **Прыдумай іншае заканчэнне гэтага апавядання.**
5. **Падбяры сінонімы да слова «баль».**

# Зімой

Здароў, марозны, звонкі вечар!
Здароў, скрыпучы, мяккі снег!
Мяцель не вее, сціхнуў вецер,
І волен лёгкіх санак бег.

Як мары, белыя бярозы
Пад сінявой начной стаяць,
У небе зоркі, ад марозу
Пахаладзеўшыя, дрыжаць.

Вільготны месяц стуль на поле
Празрысты, светлы стоўп спусціў
І рызай срэбнаю раздолле
Снягоў сінеючых пакрыў.

Узрывайце ж іх санямі, коні!
Звіні, вясёлых бомаў медзь!
Вакол лятуць бары і гоні,
У грудзях пачала кроў кіпець.

Максім Багдановіч

[!]

1. **Якім настроем прасякнуты верш?**
2. **Чым выклікана ўзрушэнне лірычнага героя?**
3. **Як разумееш паэтычны выраз:** ***У небе зоркі, ад марозу, Пахаладзеўшыя, дрыжаць.***
4. **Чаму паэт называе вечар звонкім, а месяц вільготным?**
5. **Знайдзі ў вершы ўсе эпітэты і метафары. Запішы іх.**

# Нескланяльныя назоўнікі

Сярод назоўнікаў ёсць такія, што не змяняюць сваіх канчаткаў па склонах і ліках.

Называем іх **нескланяльнымі**.

Да іх адносяцца:

**агульныя і ўласныя назоўнікі іншамоўнага паходжання, якія канчаюцца на галосны**: журы, метро, фае, кенгуру, какаду, Сочы, Чылі;

**запазычаныя назоўнікі, якія абазначаюць асоб жаночага полу**: мадам, міс, місіс, Элізабет;

**прозвішчы на націскное О**: Гайко, Буйно, Байко;

**складанаскарочаныя словы, якія складаюцца з пачатковых літар**: МТЗ (Мінскі трактарны завод), ААН (Арганізацыя Аб'яднаных Нацый).

Большасць нескланяльных назоўнікаў адносіцца да ніякага роду.

**1. Спішы сказы, устаўляючы патрэбныя па сэнсе словы.**

Сяброўкі сустрэліся на станцыі ... .
Марыся прыгожа іграе на ... .
На Беласточчыне людзі ахвотна слухаюць перадачы ... Рацыя.
У мастака было сваё ... .
Усе гледачы сабраліся ў ... тэатра.
Яна спяшала ў ... і паехала на ... .
Сёння холадна, трэба апрануць ... .

**2. Складзі сказы з наступнымі словазлучэннямі. Вызначы род нескланяльных назоўнікаў.**

Бульбяное пюрэ, пажарнае дэпо, цікавае кіно, малое кенгуру, конкурснае журы, міс Элен, студэнт Гайко, горад Сочы.

# Валянцінкі

Пасля апошніх Валянцінак Гражынка была ціхая, як ніколі. У школу пайшла была прыгожа апранутая, рыхтавалася, што атрымае прынамсі чатыры «валянцінкі», а прынесла толькі адну і не ад таго, ад каго спадзявалася. Да таго ж, тое прызнанне ў прыязнасці пачуццяў было не вельмі прыгожае. Хтосьці крывавата вывеў на лісточку цвёрдай паперы: «Ты мая Валянцінка», побач намаляваў няроўнае сэрцайка чырвоным фламастарам...

– Ну і што, што яно крывое... – Грак, узіраючыся бачком у няўдалы малюнак, амаль не прылёг на картку. – Папраўдзе, ды сэрца



несіметрычнае, каморкі сэрца нpropos

# Уцякала зіма ад вясны

Уцякала зіма ад вясны
Па кустах вербалозаў рагатых, —
Ёй каптан абарвалі яны,
І на голлі матляецца вата.

Уцякала зіма ад вясны,
Уцякала па рэках, азёрах,
Лёд затрэскаў, закрэктаў, заныў,
Здрадзіў лёд —
і вада на прасторы.

Толькі звон крыгалому ачах —
Брод шукаюць бярозы-бяглянкі
І трымаюць на ніцых плячах,
Як дзяцей палахлівых, буслянкі.

А вясна даганяла зіму;
Заяц скочыў у лужу блакіту,
Бо на хвост наступіла яму,
І пралескі распырскаў, раскідаў.

І ўцякала зіма ад вясны,
Пад нагамі ламачча затлела,
Парастрэсла па сцежках лясных
Снег апошні свой
з ландышаў белых.
Уцякала зіма ад вясны —
Уцякала.

Рыгор Барадулін

1. **Ці ты згодны з тым, што верш «Уцякала зіма ад вясны» нагадвае казачную гісторыю? Калі так, то што казачнае ў гэтым творы?**
2. **Вызначы, які мастацкі прыём выкарыстаў паэт пры апісанні зімы і вясны.**
3. **Каго, на твой погляд, нагадвае лёд, які затрэскаў, закрэктаў, заныў?**
4. **Выпішы самыя яркія вобразы, якія табе спадабаліся. Чаму без іх верш страціў бы сваю прывабнасць і хараство?**

Вывучы словы песні

Уладзімір Някляеў

# Залюляю, як кахаю

Як неба люляе аблокі,
Як возера хвалі люляе,
Дрыготка, пяшчотна, высока
Цябе калышу-калыхаю.

Прыпеў: Я цябе закалышу,
Як калыша Бог душу,
Залюляе, залюляю,
Як кахаю, як кахаю.

Як лісце з азяблага веццяя
Ляціць, залюлянае ветрам,
Як месяц, як месяц, як месяц
Плыве, залюляны, на ветах.

Прыпеў: Я цябе закалышу...

Як неба аблокі калыша,
Як возера хвалі люляе,
Як музыка доўжыцца цішай,
Калі ўжо знікае, знікае.

Прыпеў: Я цябе закалышу...



# Тэмы:

1. Чаму?
2. Родны, давальны, вінавальны склоны назоўнікаў.
3. Са святам.
4. Жаўрук.
5. Творны, месны склоны назоўнікаў.
6. Матуля вучыла сына.
7. Правапіс «не» «ня» з назоўнікамі.
8. Мая граматыка.
9. Салодкі кляновік.
10. Песня «Пагоня».

# Чаму?

Ты прачнуўся і зірнуў у акно. А чаму назвалі **акно**? Даўным-даўно ў нашых продкаў было слова **око** (вока). Будыніна, у якой жыве чалавек, мае сваё вока – адтуліну, праз якую відаць свет. Адсюль і пайшла назва. У беларусаў – *акно, вокны*, у рускіх – *окно*, украінцы называюць па-свойму – *вікно*, палякі і чэхі – *okno*.

А вось ты ідзеш у школу. Яна, скажам, у суседняй мясцовасці. Ты выходзіш на дарогу, якую старэйшыя людзі чамусьці называюць **гасцінец**. Але спачатку падумаем, адкуль узялося слова **дарога**. Перш чым пракласці дарогу, звычайна расчышчаюць вузкую паласу ад усяго, што на ёй расце, – выдзіраюць траву, хмыз. Вось ад слова **драць** праз змену галосных і ўтварылася – **дарога**. Дарогі спачатку служылі для праезду гасцей – купцоў, якія прывозілі для абмену свае тавары. Дарогу, па якой ездзілі госці, назвалі **гасцінец**.



Ідзеш палявою дарогаю. Давай задумаемся, адкуль узніклі назвы тых раслін, што кормяць чалавека.

**Жыта** ўтворана ад слова **жыць**. Жыта – хлеб, а хлеб – галоўны харч чалавека.

**Пшаніца**. Гэтую назву даў дзеяслоў **пхаць**, што азначала таўчы, малоць. Каб атрымаць крупы, зерне таўклі.

**Грэчка**. Утворана ад слова **грэк**, бо нашы продкі даведаліся пра гэтую расліну праз грэкаў і спачатку называлі яе «грэцкая збажына» або «грэцкі хлеб».

**Бульба**. Беларуская назва пайшла ад лацінскага слова **бульбус**, што азначае цыбуліна. Тое, што бульбіна, як і цыбуліна, – гэта плады ў зямлі і на выгляд яны крыху падобныя, нарадзіла такую назву.

Алеся Станюк



[?]

1. **Адкуль пайшлі назвы слоў: акно, бульба, жыта?**
2. **Як людзі называюць «дарогу»?**
3. **Адкуль пайшло слова «жыта»?**
4. **Прыдумай, як маглі ўзнікнуць словы: «падручнік», «сшытак».**

# Родны, давальны, вінавальны склоны назоўнікаў

**1. З наступных слоў утвары словазлучэнні. Назоўнік, што ў дужках, пастаў у родным склоне. Перад назоўнікамі ў родным склоне запішы неабходныя прыназоўнікі: ад, з, каля, без, у, з-за, для, да.**

| | | |
|---|---|---|
| саскочыць (паркан) | падарунак (тата) | чакаць (сябар) |
| запытаць (настаўнік) | загараць (возера) | дрэва (лісце) |
| падысці (лес) | выйсці (аўтобус) | малако (унучка) |
| пярсцёнак (золата) | выглянуць (школа) | пастаяць (дрэва) |

**2. Назоўнікі, што ў дужках, запішы ў форме давальнага склону:**

дзякаваць (каму?) маці (бацька, дзіця)
паставіць добрую адзнаку (каму?) вучню (Ніка, Віктар)
паслаць эсэмэску (каму?) сябру (бацька, бабуля)
радавацца (чаму?) сонцу (зіма, лета, снег)

**3. Запішы па ўзоры:**

купілі для брата – купілі брату
прынеслі для бабулі – … …
далі для сяброўкі – … …
чакалі на бабулю – … … .

**4. Прачытай і запамятай:**

Н. Ніна, Аляксандр, Коля
Р. Ніны, Аляксандра, Колі
Д. Ніне, Аляксандру, Колю
В. Ніну, Аляксандра, Колю
Т. Нінай (-аю), Аляксандрам, Колем
М. аб Ніне, аб Аляксандру, аб Колю.

**5. Запішы назоўнікі ў вінавальным склоне:**

расказаць (пра што?) (сустрэча, лес, возера),
казаць (пра каго?) (сяброўка, вожык, кацяня),
унесці (у што? куды?) (кватэра, дом, памяшканне),
зайсці (за што? куды?) (дом, яблыня, ламачча),
пакласці (на што? куды?) (стол, зямля, галлё),
падпаўзці (пад што? куды?) (ровар, шафа, галлё),
пераплысці (што?) (акіян, рака, возера)

# Са святам

Яшчэ на доле снег ляжыць
І спяць у покаўках лісточкі,
Ды ўжо спяваюць капяжы,
Што зімка мусіць бегчы ўпрочкі.

Бо стукнуў-грукнуў сакавік
Вясёлым кулачком у хату,
І знае нават коця Смык,
Што веснавік прынёс нам свята.

Смяецца сонейка ў акне,
Грак па разоры шпацыруе,
І коця Смык міргае мне:
Што сёння маме падару я?

Я промнік сонца ёй злаўлю
І кветкі падару, і вершык,
Скажу, што я яе люблю,
І пацалую самай першай!

Ніна Мацяш

[!]

1. Пра якое свята гаворыцца ў вершы?
2. Якія падарункі рыхтуе маме дзяўчынка з верша?
3. Як ты адзначаеш гэтая свята?
4. Складзі пажаданні сваім блізкім жанчынам. Можаш пакарыстацца словамі і словазлучэннямі: з нагоды, плённай працы, пажаданні, шчасця, радасці, здароўя, поспехаў, шчаслівых дзён, у жыцці, усмешка, жадаю.

# Жаўрук

Жаўрукі – найпершыя пасланцы вясны. На Беларусь яны вяртаюцца з выраю ў сярэдзіне сакавіка. Сонца яшчэ не паспела злізаць снег. Раніцою і ўвечары кусаецца мароз. А жаўрукі пяюць ужо, звіняць над полем і лесам, над вёскамі і гарадамі, вітаюць прыход вясны.

Іх у дружнай жаўруковай сямейцы – чатыры родныя браты.

Палявы.

Лясны.

Чубаты.

Рагаты.

Не бойцеся, у апошняга з братоў зусім не страшныя рожкі.

Проста ў яго на галоўцы тырчаць пярынкі. Імі не надта напалохаеш драпежнага ястраба. Але жаўручок, як расказваюць старыя людзі, паднімецца з саломінкаю ў неба і спявае:

«Пайду ястраба біць! Пайду ястраба біць!..»

Ды вось бяда – саломінка выпадае, і жаўрук каменем ляціць да зямлі. А па дарозе апраўдваецца:

«Кій упаў! Кій упаў!..»

Вельмі цікавае паданне і пра тое, як з'явіліся на нашай зямлі жаўрукі.

Неяк увесну, даўным-даўно, вандраваў па Беларусі добры чараўнік. Здарожыўся ён. І есці не меў чаго. Ажно бачыць – арэ непадалёку палетак селянін. Зямля пясчаная, а сям-там камяністая. Конік ледзь цягне драўляную саху. А ў самога гаспадара кашуля на спіне – хоць выкручвай ад салёнага поту. Прывітаўся чараўнік з хлебаробам. Слова за слова – разгаварыліся. Потым араты за-



прасіў падарожніка папалуднаваць. Хоць які там полудзень. Акраец чэрствага хлеб, некалькі горкіх цыбулін ды крынічнай вады збанок.

Але не здарма людзі кажуць: не дораг абед, а дораг прывет. Падсілкаваўшы трошкі падарожнік-чарадзей, пачаў распытваць у аратага пра ягонае жыццё, якую ён хацеў бы мець палёгку.

«Ніякай мне не трэба палёгкі, – адказаў яму селянін. – Толькі слухаць абрыдла, як грукае каменне аб саху...»

Добры чараўнік счакаў, пакуль адыдзецца, налягаючы на саху, хлебароб, потым узяў у рукі маленькі камень і штосілы шпурнуў яго ў неба. І толькі ён тое зрабіў – зашчабятала, зазвінела ў паднябессі шэрая птушка. Весялей пацягнуў саху знясілены конь, упершыню за цэлы дзень усміхнуўся араты...

А жаўрукі з таго часу гняздзяцца проста на зямлі. У траве, часцей за ўсё на ўзмежку поля з хмызняком. Іхніх птушанят цяжка заўважыць, бо колерам сваіх пярынак яны падобны да шэрых каменьчыкаў.

Цяжка жаўрукам несці на малых крылах званочкі вясны. Але можна дапамагчы ім. Трэба папрасіць маму, каб яна напякла з цеста чубаценькіх пташак. Потым нядзелькаю выйсці на вуліцу, як мага вышэй падкідваць іх угору над сабою і спяваць:

– Жавароначкі, прыляціце,
Цёпла лецейка прынясіце!
Бо зімачка надаела,
Усе хлебушкі пераела!

Паспрабуй, мой маленькі сябар. І ты абавязкова, хоць на адну хвіліну, наблізіш прыход вясны-красны на родную зямлю.

Уладзімір Ягоўдзік

[?]

1. **Калі вяртаюцца да нас жаўрукі?**
2. **Пра якія віды жаўрукоў гаворыцца ў апавяданні?**
3. **Дзе ўюць свае гнёзды жаўрукі?**
4. **Як людзі гукаюць вясну?**

# Творны і месны склоны назоўнікаў

Назоўнікі мужчынскага роду на -а, (-я) у творным склоне
маюць наступныя канчаткі:

слуга – слугой, суддзя – суддзёй,
Мікола – Міколам, Коля – Колем.

З назоўнікамі ў творным склоне могуць ужывацца словы:
**над, пад, перад, за, з**.

**1. Запішы сказы. Словы ў дужках пастаў у творным склоне.**

Пад (крэсла) спіць кот. Разам з (тата) пойдзем у кіно. Над (заапарк) праляцеў бусел. Ігар вучыўся ў адным класе з (Лёва). За (поле) пачынаецца сад. Перад (бура) неба закрылі цёмныя хмары.

**2. Дапішы назоўнікі ў творным склоне.**

У час перапынкаў я гуляю (з кім?) з ... . Вечарам (перад чым?) перад ... трэба пачысціць зубы. Вучань схіліўся (над чым?) над ... . Многія стравы я запіваю (чым?) ... . Суп трэба есці (чым?) ..., а дранікі (чым?) ... . Дзядуля ганарыўся (кім?) сваім ... .

Словы для даведкі: унук, сябар, падручнік, відэлец, малако, сон, лыжка.

Да назоўнікаў у месным склоне ставяць пытанні *аб кім? аб чым?*,
а таксама *дзе? калі?*
З назоўнікамі ў месным склоне ўжываюцца словы: **аб**, **на**, **па**, **у**, **пры**.

**3. Падбяры словы, каб скласці сказы.**

Хлопец напісаў эсэмэску аб ... . Кніжка ляжала на ... . Дуб расце пры... . Дзяўчынка жыве ў ... . Яна ішла па ... .

**4. Дапішы словы, каб атрымаўся сказ.**

... алоўкам напісаў на ...
... дала кніжку ...
... прыгожа піша ў ...
... верабей скача па ...
... заехала за ...

... расказаў аб ...
... праляцеў над ...
... музыка выступае на ...
... адышоў ад ...

# Матуля вучыла сына

Матуля вучыла сына:
– Кахай дарагую айчыну!

Матуля прыгадвала словы:
– Шануй  беларускую мову!

Матуля вучыла штогод:
– Любі беларускі народ!

Пакляўся сын слова стрымаць:
Любіць, шанаваць і кахаць.

Сынок, ці стрымаць ты гатовы
Матулі дадзена слова?

Віктар Швед

[!]

1. Чаму вучыла сына маці?
2. Якія словы прыгадвала маці?
3. Ці ты ўмееш стрымаць дадзена слова?
4. Ці заўсёды гэта лёгка прыходзіцца?
5. Чаму сказы ў вершы канчаюцца клічнікам? Прачытай прыклады такіх сказаў.
6. Знайдзі ў вершы пары слоў, што рыфмуюцца.

# Не (ня)

**Не (ня) пішацца з назоўнікам**
**разам:**
**калі без не (ня) слова не ўжываецца;**
**калі слова з не (ня) можна замяніць сінонімам;**
**асобна:**
**калі ў сказе выражана супрацьпастаўленне**
**або адмаўленне чаго-небудзь.**

**1. Прачытай. Растлумач, чаму не (ня) у дадзеных словах пішацца разам:**

няшчасце, недарэчнасць, небарака, неслух, немаўля, незабудка, непарадак, няпраўда, нявернасць, нявольнік, няўклюда, неспакой, нянавісць, несправядлівасць, невад, нерад, непрыяцель, непагадзь.

**2. Складзі сказы са словамі:**

нельга, няма, неўзабаве, нехта, неяк, неахайна, некуды.



# Мая граматыка

У лесе родную вучыў я мову.
Назоўнікамі дрэвы ў ім звіняць.
Тут птушкі ўтвараюць дзеясловы –
Пяюць, шчабечуць, свішчуць і крычаць.

Прыметнікамі бор здалёк прыкметны –
Зеленачубы, статны, залаты.
Сустрэне бор займеннікам прыветным...
Як з лепшым сябрам, з кожным ён на «ты».

Звіні ж вякамі, мова, па-над краем –
На пераправе ў лесе пры сасне.
Жыццё не адмаўляе, а сцвярджае
Адмоўная часціца мовы – не.

Не знішчым мы, не страцім, не загубім
Сваіх лугоў, сваіх азёр, сваіх лясоў.
І родны край і мову не разлюбім –
У кожным сэрцы гэты дзеясловў!

Віктар Гардзей

[!]

1. Які настрой у гэтым вершы?
2. Чаму аўтар даў такі загаловак?
3. Пра якія часціны мовы гаворыцца ў вершы?
4. Чым яны характэрны?

# Салодкі кляновік

Зіма была цяжкая. Увесь час стаялі вялікія маразы. Але вясна прыйшла нечакана і такая цёплая, што ўжо ў самым пачатку красавіка нават у лесе цяжка было натрапіць на лапіну снегу. Аднойчы дзядзька Ігнась, калі наступілі выхадныя дні, сказаў мне: «Давай сходзім у лес, на Лысую гару. Паглядзім, як перазімавалі мурашкі». Я ведаў, што на Лысай гары ні многа ні мала — пятнаццаць мурашнікаў. І ўсе яны дагледжаны рупным і добрым да ўсяго жывога на зямлі чалавекам. Чалавек гэты — стары ляснік-пенсіянер дзядзька Ігнась. Ён не толькі абгарадзіў усе мурашнікі, але і старанна пафарбаваў у блакітны колер кожную абгародку.

Лес сустрэў нас дзіўнай прыгажосцю. Распусціліся каташкі арэшніку і выкінулі з сябе воблачкі залаціста-жоўтага пылку. Вось-вось распусцяцца набухлыя пупышкі ў асіны, бярозы і таполі. Прыбра-



лася ў чырвона-карычневыя завушніцы вольха, каля рэчкі скінула цёмныя лускавінкі ракіта.

Пачулі цяпло, ажылі на Лысай гары і мурашнікі. Самыя смелыя з мурашак ужо цягнулі ў норкі мушак і жучкоў, а другія, пакінуўшы сваю здабычу дома, зноў спяшаліся на паляванне.

— Ого, мурашкі! — гаворыць дзядзька Ігнась. — Гэта вялікія памочнікі лесу! Толькі за адзін год сям'я мурашак знішчае каля дзесяці мільёнаў розных шкоднікаў.

Самы вялікі мурашнік на Лысай гары ля маладога, але высокага і стройнага клёна. Мурашнік гэты таксама абнесены абгародкай, пафарбаванай у блакітны колер. Але што гэта такое? Па клёне ўверх у адным напрамку роўненькім ланцужком адна за адной паўзуць мурашкі. Другія мурашкі такім жа роўненькім ланцужком спускаюцца з дрэва.

— Вось яно што! Салодкі кляновік! — смяецца дзядзька Ігнась і гаворыць мне: — Бачыш зламаную галінку ля самага ствала?

— Ага, бачу.



— У тым месцы, дзе зламана галінка, выступаюць кропелькі соку. Вось і спяшаюцца туды мурашкі, каб паласавацца ім, вясну сустрэць...

Вечарам вярталіся дамоў. Удалечы ціха прагрымеў гром. Збіралася на дождж. Дзядзька Ігнась зноў прыпыніўся ля аднаго мурашніка, нагнуўся.

— Бачыш, ні адной мурашкі ля мурашніка. Дождж чуюць, вось і пахаваліся ў сваіх норках. Мурашкі — жывы барометр прыроды.

Я падышоў да клёна, уважліва агледзеў ствол дрэва, але ні адной мурашкі не ўбачыў.

Калі з дзядзькам Ігнасём выйшлі з лесу, сцебануў моцны дождж.

Янка Галубовіч



1. **Назаві герояў апавядання.**
2. **Куды яны пайшлі?**
3. **Навошта яны туды падаліся?**
4. **Як разумееш сказ: «Мурашкі – жывы барометр прыроды»?**
5. **Зрабі/зрабіце плакат-афішу з інфармацыямі пра мурашак.**

Вывучы словы песні

Максім Багдановіч

# Пагоня

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах –
Ўспомню Вострую Браму святую
і ваякаў на грозных канях.

Ў белай пене праносяцца коні,
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

У бязмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі – гады.
Вы за кім у пагоню спяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

Мо яны, Беларусь, панясліся
За тваімі дзяцьмі наўздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?



Біце ў сэрцы іх – біце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць...

Маці родная, Маці-Краіна!
Ня ўсцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!..

Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,
Срэбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разбіць, не спыніць, не стрымаць.

# Тэмы:

1. Народныя песні.
2. Вяснянка «Положу кладку».
3. Неазначальная форма дзеясловаў.
4. Калыханка.
5. Лік і час дзеясловаў.
6. Валачобныя песні.
7. Асоба дзеясловаў.
8. Падслуханая казка.
9. Песня «Вожык-патрыёт».

# Народная песня

Наш народ складаў песні на працягу вякоў у розныя хвіліны свайго жыцця. Ён уклаў у песні ўсе свае радасці, свой смех, сваё гора, долю і нядолю. З пакалення ў пакаленне народ ад дзеда — унуку, ад унука — праўнуку перадаваў у песні глыбокую і праўдзівую навуку. Кожнае новае пакаленне да дзедавай навукі-песні дадавала свой погляд на жыццё, свой боль, свой жаль, свой смутак і сваю радасць.

Наша песня народная гучала ўлетку пры кожнай працы — ці то на полі, ці то на лузе, ці ў лесе, ці ў садочку. А прыходзіла зіма — дзьмулі халодныя вятры і завеі — народная песня тулілася пад страхой — у цеснай беларускай хатцы, жыла ў ёй разам з людзьмі, з іх думкамі і жаданнямі.

**Песня** — вершаваны і музычны твор для выканання голасам (спявання).

**Народныя песні** ўмоўна падзяляюць на **абрадавыя** і **пазаабрадавыя**.

Надзвычай багатыя беларускія **абрадавыя песні**, якімі суправаджаліся розныя святы і падзеі ў жыцці. Сярод абрадавых песень вылучаюць сямейна-абрадавыя (хрысціны, вяселле, пахаванне) і каляндарна-абрадавыя (вяснянкі, сенакосныя, жніўныя, рэкруцкія, калядныя, валачобныя, купальскія). Абрады былі падпарадкаваны адной мэце — пры дапамозе спеваў, танцаў, загавораў і іншых дзеянняў паўплываць на сілы прыроды.

Кожная пара года мела адпаведныя абрады, звычаі, павер'і, песні. Песні выконвалі магічную ролю: людзі звярталіся з просьбамі, пажаданнямі, заклінаннямі, зваротамі да сіл прыроды. Нашы продкі ўшаноўвалі Каляду, Купалу, прасілі спрыяння ў гаспадарцы, ладу ў сям'і, добрага здароўя сваім родным, шчаслівага лёсу дзецям.

**Пазаабрадавыя беларускія песні** (лірычныя, гістарычныя, жартоўныя) не былі непасрэдна звязаныя з тымі ці іншымі святамі.







Іх спявалі ў розных жыццёвых абставінах — на працы і ў час адпачынку. Песні гэтыя не былі звязаныя з пэўнымі датамі, ні са святамі ці гульнямі. Яны перадаюць пачуцці і перажыванні, зразумелыя і блізкія ўсім людзям.

**Народныя песні** — выдатныя мастацкія творы, амаль у кожнай мы сустрэнем словы, ужытыя ў пераносным значэнні, — тропы: эпітэты, параўнанні, сімвалы, метафары, увасабленні, гіпербалы.

Часта сустракаюцца так званыя **сталыя эпітэты**, якія ўжываюцца толькі з пэўнымі словамі: *поле шырокае, зорка ясная, ночка цёмная, слёзы горкія, рукі белыя*.

У народных песнях надзвычай **паэтычныя параўнанні**, яны выразныя, трапныя: *светлая, як зорка ясная; чыстая, як сляза; прыгожы, як месячык ясны*.

**Паэтычнымі сімваламі** ў песнях выступаюць птушкі, жывёлы, дрэвы.

Характэрным мастацкім прыёмам у народных песнях з'яўляецца **ўвасабленне** — перанясенне ўласцівасцей жывых істот на прадметы і з'явы прыроды: *гаварыла поле шырокае; сярпы залатыя, прыходзьце ка мне заўтра рана*.

Сустракаюцца ў песнях і **гіпербалы**, якія ўзмацняюць уражанне, выказваюць сваё захапленне або абурэнне чым-небудзь: *Дзе каза ходзіць, Там жыта родзіць, Дзе прабягае, Там вылягае. Дзе каза рогам, Там жыта стогам, Дзе каза хвастом, Там жыта кустом, Дзе каза нагою, Там жыта капою.*

Паводле Вольгі Цітовай

[?]

1. **Калі і як узніклі народныя песні?**
2. **У якія моманты чалавечага жыцця яны выконваліся?**
3. **На якія віды падзяляюцца народныя песні?**
4. **Якія мастацкія сродкі найчасцей сустракаюцца ў песнях?**
5. **Якія народныя песні ты ведаеш?**

Вывучы словы песні

Народная песня з Малiннiк

# Положу кладку

*(Вяснянка)*

Положу кладку
Вэрбову, вербову –
Час вам, дiэвонькi
Додому, додом...

– А ты, Манiулько,
Тут зостань, тут зостань –
Прыiэдэ Йванко –
Ручку дасць, ручку.

Прывэзэ вынок
Зэ Львова, зэ Львова.
– Бувай, Манечко,
Здорова, здоров...

А як нэ зносыш –
Сэстрiэ дай, сэстрiэ дай.
Сама, молода,
Мнiэ зостань, мнiэ зостань.



# Неазначальная форма дзеясловаў

**Словы, якія адказваюць на пытанні**
**што рабіць? што зрабіць?,**
**– гэта дзеясловы ў неазначальнай форме.**

**Яны заканчваюцца**
**на -ці, -ць або -чы: *ісці, спяваць, дапамагчы.***

**1. Складзі словазлучэнні з дзеясловаў і назоўнікаў:**

дзякаваць (каму?) (бацька, настаўніца)
успомніць (пра што?) (лета, лес)
прабачыць (каму?) (сябар, сястра)
тэлефанаваць (каму?) (сяброўка, дзед)
чакаць (каго?) (дзіця, брат)
выбачыць (каму?) (сястра, хлопец)
думаць (пра што?) (надвор'е, зіма)

**2. Замяні спалучэнні слоў дзеясловамі ў неазначальнай форме. Запішы па ўзоры:**

**Узор: весці размову – размаўляць**

прымаць удзел, зрабіць прапанову, есці абед, зрабіць пераклад, займацца маляваннем, вынесці падзяку, скласці пажаданні, выконваць песню.

**3. Утвары дзеясловы ў неазначальнай форме. Запішы па ўзоры:**

**Узор: слухаю – слухаць**

берагу – ...
спяваю – ...
малюю – ...
ляжу – ...
трымаю – ...
маўчу – ...

сяджу – ...
плаваю – ...
спяваю – ...
вучу – ...
жадаю – ...
гавару – ...

# Калыханка

Спі, засні, мая дачуся,
Хай жа прыйдзе сон.
Узняла над Беларуссю
Ноч свой парасон.

Чорную надзеўшы блузку,
Ноч пайшла ў абход.
Спіць народ наш беларускі
Пасля ўсіх турбот.

Сціхлі гукі роднай мовы,
Песенны напеў.
Сціхла ў векавых дубровах
Шапаценне дрэў.

Спіць прырода, твая матка
Пачала драмаць,
Спі, засні, маё дзіцятка,
Мусім рана ўстаць.

Віктар Швед

[!]

1. Апішы настрой верша.
2. Да чаго заклікае верш?
3. Знайдзі ў вершы ўвасабленні. Прачытай іх.
4. Колькі строф у вершы?
5. Прачытай усе пары слоў з верша, якія рыфмуюцца.

# Лік і час дзеясловаў

**У адзіночным ліку дзеяслоў абазначае дзеянне аднаго прадмета ці адной асобы. У множным ліку дзеяслоў абазначае дзеянне двух і больш прадметаў ці асоб.**

**1. Змяні лік дзеясловаў:**

| *адзіночны лік* | *множны лік* | *адзіночны лік* | *множны лік* |
|---|---|---|---|
| піша | пішуць | гаворыць | гавораць |
| чытае | ... | марыць | ... |
| працуе | ... | любіць | ... |
| спявае | ... | сядзіць | ... |
| плавае | ... | | |

Дзеясловы змяняюцца па часах (**цяперашні** час, **прошлы** час, **будучы** час). Дзеясловы **цяперашняга** часу адказваюць на пытанні: *што робіць? што робяць?* Дзеясловы **прошлага** часу адказваюць на пытанні: *што рабіў, рабіла? што зрабіў, зрабіла? што рабілі? што зрабілі?* Дзеясловы **будучага** часу адказваюць на пытанні: *што зробіць? што зробяць? што будзе рабіць? што будуць рабіць?*

**2. Запішы па ўзоры дзеясловы ў прошлым, цяперашнім, будучым часе:**

Узор: ехаць – ехаў, едзе, будзе ехаць; прыехаць – прыехаў, прыедзе.
Купіць, шукаць, спяваць, бегчы, чакаць, глядзець.

**3. Вызначы час дзеясловаў:**

прыйшла, глядзелі, шпацыруюць, чытае, чакалі, плакаў, пабеглі, заблудзіўся, зачаруем, плылі, плавае, ляцяць, будзе спяваць, пішуць, будуць весяліцца.

**4. Складзі і запішы сказы з дзеясловамі:**

еў, бачылі, ідуць, апранаем, вывучыць, прынясуць.

Валачобныя песні
з Гродзеншчыны

# Валачобныя песні

Вывучы словы песні

Чырвонае кока ўжо недалёка,
Каліна-маліна, ягадзіца!
Цыбульку лупіці, яечкі хварбіці,
Каліна-маліна, ягадзіца!
Яечкі хварбіці, хлопчыкам дзяліці.
Каліна-маліна, ягадзіца!

Хадзілі блудзілі валачобнічкі
Прыпеў: Хрыстос Васкрэс, Сын Божый.
Прыблудзілі да паненачкі
Прыпеў: Хрыстос Васкрэс, Сын Божый.
Добры вечар табе паненачка
Прыпеў: Хрыстос Васкрэс, Сын Божый.
Адчыні нам акеначка
Прыпеў: Хрыстос Васкрэс, Сын Божый.
Вынясь, вынясь паненачка
Прыпеў: Хрыстос Васкрэс, Сын Божый.
Сорак яёк на палумісак
Прыпеў: Хрыстос Васкрэс, Сын Божый.
Кілбаскою абкружыўшы
Прыпеў: Хрыстос Васкрэс, Сын Божый.
Белым сырым завяршыўшы
Прыпеў: Хрыстос Васкрэс, Сын Божый.
А на верх тога з паўзалатога
Прыпеў: Хрыстос Васкрэс, Сын Божый.

Паслухай як спявае валачобную песню паэт Рыгор Барадулін:
https://ipleer.com/artist/808846-Rygor_Baradul_n/







# Асоба дзеясловаў

**Дзеясловы ў цяперашнім і будучым часе змяняюцца па асобах і ліках. Змяненне дзеясловаў па асобах і ліках называецца спражэннем.**

**Цяперашні час**

| Асоба | Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|---|
| 1-я | я малюю<br>я пішу | мы малюем<br>мы пішам |
| 2-я | ты малюеш<br>ты пішаш | вы малюеце<br>вы пішаце |
| 3-я | ён, яна, яно малюе<br>ён, яна, яно піша | яны малююць<br>яны пішуць |

**Будучы час**

| Асоба | Адзіночны лік | Множны лік |
|---|---|---|
| 1-я | я намалюю<br>я напішу | мы намалюем<br>мы напішам |
| 2-я | ты намалюеш<br>ты напішаш | вы намалюеце<br>вы напішаце |
| 3-я | ён, яна, яно намалюе<br>ён, яна, яно напіша | яны намалююць<br>яны напішуць |

1. **Праспрагай дзеясловы** *несці* **і** *стаяць* **у цяперашнім часе.**
2. **Праспрагай дзеясловы** *паведаміць* **і** *атрымаць* **у будучым часе.**
3. **Запішы дзеясловы** *жыць, стаяць, бачыць* **у 1-й асобе адзіночнага і множнага ліку цяперашняга часу.**
4. **Запішы дзеясловы** *купіць, гаварыць, сядзець* **у 2-ой асобе адзіночнага і множнага ліку цяперашняга часу.**
5. **Праспрагай дзеясловы** *спяваць, танцаваць, сустрэць* **у цяперашнім і будучым часе.**

# Падслуханая казка

Настаўнік даў вучням хатняе заданне — кожнаму намаляваць якуюсь кветку.

Марыйцы спачатку заданне падалося лёгкім. Дзяўчынка добра малявала, да таго ж ведала і любіла мноства самых розных кветак. Ранняй вясной яна любіла дзьмухаўцы і лотаць, улетку — смолкі і валошкі, увосень — вяргіні і астры... Якая ж з гэтых кветак самая прыгожая, самая любімая?

Дзяўчынка думала-выбірала ўвесь вечар і потым, у ложку, засынаючы, таксама думала. Ад гэтага ёй прысніўся сон. Прысніўся заліты сонцам, запоўнены птушыным спевам празрысты летні дзень, поплаў, які нагадваў дарагі стракаты дыван, — столькі на ім было кветак... І калі яна, босая, лёгкая, ступала па гэтым мяккім дыване, кветкі схіляліся да яе і хваліліся кожная сваёй прыгажосцю. Вядома, гэта быў сон, таму кветкі і маглі размаўляць.

Пунсавелі красуні ружы і стараліся прыхаваць пад лісцем свае шыпулькі; звінелі, бы нанізаныя на нітку парцалянавыя званочкі, бялюткія ландышы; выхваляліся адзін перад адным смешныя таўстуны цюльпаны самых розных колераў; надуваліся ад гонару таўсташчокія півоні; разбегліся і застылі па ўсім поплаве бесклапотныя рамонкі; сінелі між імі маўклівыя сціплыя незабудкі, сон-трава і «цвяток» яе, Марыйчынай радзімы — непаўторная валошка...

Дзяўчынка слухала, любавалася кветкамі і аніяк не магла выбраць лепшае. Гэтая прыгожая, а паглядзіш — другая яшчэ прыгажэйшая... Раптам яна пачула меладычныя, танюткія і чыстыя, як перазвон крышталю, галаскі. Дзяўчынка агледзелася. Ах, яна нават не заўважыла, што наступіла на цэлую сямейку непрыкметных сярод гэтай раскошы колераў і пахаў звычайных маргарытак! Цяпер яны, прымятыя, падымаліся з зямлі, атрэсваліся, распраўлялі пялёсткі і лісточкі, падстаўлялі сонцу свае бела-ружовыя вяночкі

з жаўтком пасярэдзіне. Яны гаварылі так ціха, што дзяўчынцы, каб пачуць іх, давялося прысесці і нагнуцца ледзь не да зямлі.

— Каб толькі гэтая дзяўчынка захацела паслухаць нас! — сказала адна з кветак, і Марыйка, як гэта бывае толькі ў снах, чамусьці адразу зразумела, што гэта нямецкая маргарытка. — Каб дала нам хоць крышачку ўвагі! Можа, тады яна выбрала б нас? Мы нікольки не горшыя за іншыя кветкі. Гэта ж акурат мы здавён-даўна прыносім дзецям і дарослым радасць, стараючыся прадказаць іхні лёс. Можна загадаць любое жаданне, потым абрываць па чарзе пялёсткі, і тое слова, пры якім будзе абарваны апошні пялёстак, і павінна азначаць: збудзецца ці не збудзецца жаданне.







— Гэта праўда, — азвалася другая кветка, і зноў Марыйка адразу зразумела, што гэта маргарытка-француженка. — Мы цвіцём з ранняй вясны да позняй восені, і няма ў свеце краіны, дзе нельга было б нас сустрэць, дзе не варажылі б на нашых пялёстках! Я таксама расказала б гэтай дзяўчынцы, як яшчэ ў старадаўнія часы рыцары дарылі нас сваім дамам і на стужках, якімі абвязвалі букеты, рабілі такія надпісы: «Кожная кветка мае сваю вабнасць, але калі б мне прапанавалі на выбар адразу тысячу кветак, усё адно я выбраў бы толькі маргарытку!»

— А я расказала б дзяўчынцы, — падхапіла кветка-грачанка, — што наша назва «маргарыткі» пайшла з грэчаскай мовы і азначае «жамчужыны». І гэта нас апяваў паэт, сцвярджаючы, што мы, незлічоныя белыя кветачкі, рассыпаныя па зялёным лузе, — здаемся сапраўднымі жамчужынамі!





— А я, — умяшалася кветка-італьянка, — распавяла б дзяўчынцы адну з самых прыгожых легендаў пра нашае паходжанне. Вядома, што вялікае сонца больш за ўсё на свеце любіць кветкі, клапоціцца пра іх, песціць, як дзяцей... А кветкі карыстаюцца гэтым і заўсёды аб нечым у яго просяць: адны хочуць быць больш буйнымі, другія — больш духмянымі, трэція — мець прыгажэйшыя пялёсткі... І толькі мы, маргарыткі, ніколі ні аб чым не прасілі, заўсёды адчувалі сябе шчаслівымі. І ў падзяку за нашую сціпласць сонца цалуе нас, пакідаючы свой знак — жоўтую плямку пасярэдзіне белых пялёсткаў.

— Я расказала б дзяўчынцы, — прамовіла кветка-аўстрыйка, — што выява букеціка маргарытак ёсць нават на мармуровым помніку. Ён узведзены ў памяць аўстрыйскай імператрыцы Лізаветы, якая заўчасна загінула, а маргарыткі — сімвалы яе дабрыні і сардэчнасці.

— Я, — сказала кветка-англічанка, — радуюся таму, што гэтая дзяўчынка наступіла на нас. У Англіі і цяпер існуе звычай: калі наступіш на дванаццаць маргарытак адразу, вясна надыдзе раней.

— І ў Скандынавіі мы служым прадвесніцамі вясны і аднаўлення жыцця, — падтрымала шведская кветка. — Менавіта ў Швецыі ўпершыню быў наладжаны збор ахвяраванняў для хворых на су-



хоты, а кветкай, якую даравалі кожнаму, хто рабіў грашовы ўклад, былі выбраны мы, маргарыткі!

— А я, — абазвалася апошняя кветка, — расказала б дзяўчынцы пра нашую агульную з ёю цудоўную і нешчаслівую радзіму. Я расказала б, як яшчэ са старадаўніны тапталі мяне чужацкія коні і людзі, як з веку ў век вострыя сохі і плугі падразалі разам з дзёрнам мае карані; расказала б, як прысыпала мяне смяротным радыяцыйным попелам і брудам... І ўсё ж я выжыла! Нездарма ў нашай мове я завуся стакротка. Я зноў расту паўсюль, дзе толькі могуць умацавацца карані, і я хачу, каб бегалі па мне басанож, каб зрывалі мяне і варажылі на маіх пялёстках шчаслівыя дзеці, хачу радаваць вочы і адаграваць душы дарослых...

Марыйка прачнулася. Яшчэ нейкі час у яе вушах адгалоскам звінелі ціхія крышталёвыя галасы, а перад вачыма стаялі бела-ружовыя зорачкі з жоўтымі пячаткамі пасярэдзіне.

Яна ўжо ведала, якую кветку будзе маляваць.

Андрэй Федарэнка

[?]

1. **Адшукай у тэксце назвы ўсіх кветак.**
2. **Што расказала Марыйцы нямецкая маргарытка?**
3. **Што распавяла дзяўчынцы маргарытка-француженка?**
4. **Які быў расказ кветкі-грачанкі?**
5. **Якая была легенда кветкі-італьянкі?**
6. **Што сімвалізуюць маргарыткі паводле кветкі-аўстрыйкі?**
7. **Пра які звычай расказала кветка-англічанка?**
8. **Аб чым паведаміла шведская кветка?**
9. **Дзе расла апошняя кветка і пра якія падзеі яна распавяла Марыйцы?**
10. **Раскажы пра сваю любімую кветку.**
11. **Запішы назвы кветак з тэксту ў алфавітным парадку.**

Андрэй Хадановіч

# Вожык-патрыёт

Вывучы словы песні

Не працуюць санвузлы,
Не нясуць дзяцей буслы.
Не шанцуе па жыцці,
У паход пара ісці.

Прыпеў: Бел-чырвона-белы бусел-патрыёт,
Бусел – патрыёт х 2
Разам з намі крочыць у паход,
Крочыць у паход х 2

Нават вожык на грыбы
Не раскатвае губы,
Ён выходзіць на прасцяг,
Несучы на голках сцяг.

Прыпеў: Бел-чырвона-белы вожык-патрыёт,
Вожык-патрыёт х 2
Разам з намі крочыць у паход...

Хай за намі папаўзе
Лепшы трактар МТЗе.
Ён у полі дыр-дыр-дыр,
Мы – за дружбу, мы – за мір!

Прыпеў: Бел-чырвона-белы трактар-патрыёт,
Трактар-патрыёт х 2
Разам з намі крочыць у паход...

Годзе жыць нам у дрыгве,
Зажывем, як свет жыве.
Трэба пні нам карчаваць,
Каб усіх прахарчаваць.

Прыпеў: Бел-чырвона-белы бусел патрыёт,
Вожык-патрыёт,
Трактар-патрыёт
Разам з намі крочаць у паход,
Крочаць у паход х 2

## Тэмы:

1. Як нарадзілася мышка Пік-Пік.
2. Мышка Пік-Пік прыбірае норку.
3. Рок-грак
4. Род і лік прыметнікаў.
5. У тэатры.
6. Каму нашкодзіў Вірус Шкодзя.
7. Скланенне прыметнікаў.
8. Як мы ў пяць секцый хадзілі.
9. Мы спрачаемся.
10. Касманаўт.
11. Песня «Там по маёвуй росі».

# Як нарадзілася мышка Пік-Пік

Мышка нарадзілася ў Мінску, у мураваным шматпавярховым доме па вуліцы Волаха, недалёка ад хаты, дзе жыў вялікі сябра ўсіх дзяцей, таксама і «зорчыных», дзед паэт Сяргей Новік-Пяюн. Можа, ведалі яе яшчэ раней і Валянціна Коўтун, і Васіль Зуёнак, пісьменнікі, якія раней жылі ў гэтай кватэры. Ды, мабыць, не кожнаму яна паказвалася. Трэба было толькі яе рассакрэціць. А выйшла мышка са свайго схову, калі пасялілася тут сям'я Шніпаў-Рублеўскіх. І стала расказваць баі пра ўвішную кватарантку Мама Людміла вечарамі дачушцы Веранічцы. Прыехала з Беластока ў госці Цёця Міра, і яна ўбалукалася ў салодкі сон пад цікавыя гісторыі пра мышку Пік-Пік. «Запішы іх для нашых „зорчыных" дзетак, хай таксама пацешацца!» – прыстала Цёця Міра да мамы Людмілы. «А я прозы не пішу, я пішу толькі вершы!» – баранілася вядомая паэтэса, ды аддрукавала на машынцы некалькі першых апавяданняў. Паявіліся яны ў «Зорцы» – старонцы для дзяцей тыднёніка беларусаў у Польшчы «Ніва», у 36 нумары за 1991 год і друкаваліся ўсе аж да 1995 года. Сталі пачаткам калыханак пра мышку Пік-Пік. Цяпер яна знаёмая ды сяброўка і маленькіх, і вялікіх беларусаў ва ўсім свеце!

Міра Лукша



# Мышка Пік-Пік прыбірае норку

Летам у кватэры, дзе жыла мышка адбыўся Вялікі Рамонт. Пік-Пік ледзь перажыла гэтую страшэнную навалу – цэлы тыдзень у доме пахла фарбамі, тупалі незнаёмыя людзі, мэблю перасоўвалі з месца на месца. Асабліва цяжка было прабірацца на кухню. Але ўрэшце ўсё скончылася, і кватэра зрабілася вельмі прыгожай – падлога блішчыць, столь – бялюсенькая, на сценах – новыя шпалеры.

Пахадзіла мышка па абноўленых пакоях, пазайздросціла гаспадарам. Вярнулася ў сваю норку і ледзь не заплакала: якое, аказваецца, бруднае і неўладкаванае яе жытло! Усё шэрае, пыльнае, на падлозе тоўсты слой смецця – абгрызкі, шалупінне семачак, цукерачныя абгорткі, шматкі газет. З усяе мэблі – толькі ложак – цукерачная каробка.

Нічога не зробіш, давядзецца прыбіраць!

Ніколі раней на гэты сумны занятак мышка часу не марнавала. «Здаецца, галоўнае – вымыць падлогу. Але насіць у норку ваду цераз усю кватэру... Калі мышка не ідзе па ваду, вада сама павінна прыйсці да мышкі», – мудра падумала Пік-Пік.

Усе ў доме спалі. Мышка збегала на кухню і ў лазеньку, адвярнула краны і, паназіраўшы, як вада запаўняе ванну і мыйку, пайшла спаць.

Прачнулася мышка ад холаду. Расплюшчыла вочы і ўбачыла над сабой столь, якая чамусьці хісталася. Цукерачная каробка – ложак пагойдвалася пасярод пакоя на хвалях!

– Гвалт! – прашаптала мышка, бо голас у яе знік з перапуду.

На шчасце, прачнуўся Тата і захацеў надзець пантофлі, якія даўно сплылі ў другі кут пакоя. Татавы ногі апынуліся ў халоднай вадзе... Ад Татавага ўскрыку прачнуліся ўсе – і Мама, і Вераніčка, і кошка Пепіта. Веранічка засмяялася і пачала бегаць па вадзе і ганяць з кута ў кут пантофлі, як маленькія караблі. Мама пабегла перакрываць краны, а Тата стаяў босымі нагамі ў вадзе і шаптаў:

– Гэта канец свету! Вялікі патоп!

Між тым Мама перакрыла краны і сабрала анучай з падлогі ваду. Пантофлі і мышын ложак перасталі пагойдвацца на хвалях, але кватэра не была больш такой чыстай і прыгожай: з мышынай норкі вымылася столькі смецця, што яно забрудзіла ўсю кватэру.

Мама пачала высвятляць, хто адкрыў краны, і мышка схавалася ў норку. Там было мокра, але незвычайна чыста.

Людміла Рублеўская





1. **Дзе «нарадзілася» мышка Пік-Пік?**
2. **Хто і каму пра яе расказваў?**
3. **Дзе друкаваліся гісторыі пра мышку?**
4. **Ці спадабалася табе гісторыя з прыбіраннем норкі? Абгрунтуй свой адказ.**
5. **Што можаш сказаць пра мышку Пік-Пік,**
6. **Складзі план апавядання «Мышка Пік-Пік прыбірае норку».**
7. **Калі табе цікава пачытаць іншыя гісторыі пра мышку, вазьмі ў рукі кніжку Людмілы Рублеўскай «Прыгоды мышкі Пік-Пік», 2007, выд. АБ-БА.**
8. **Якія кніжкі ты любіш чытаць?**
9. **Чаму варта чытаць кніжкі?**
10. **Падрыхтуй рэкламу сваёй любімай кніжкі.**

# Рок-грак

У гэты раз Гражынка ўрэшце паехала на «БАСовішча» ў Гарадок. Паехала з татам, і адно на другі дзень Фестывалю песні Маладой Беларусі, і зусім толькі на хвілінку. Тата крыху засумаваў па беларускім року, але ён, здаецца, трохі яму пераеўся. Калісьці і тата, і мама ездзілі ва ўрочышча Барык, паміж Гарадком і Валіламі, спачатку асобна, а пасля разам, а калі нарадзілася ў іх Гражынка, неяк не вельмі мелі час. Здаецца, прыйшла пара і Гражынцы гэтым пацікавіцца...

– Э-э-э, ужо не тое, што калісьці... – маркотна прамармытаў тата. – Неяк не так...

– Неяк не так, як... да вайны! – засмяялася бабуля. Бабуля мала памятае той час перад вайной, але цяпер яе аднагодкі і старэйшыя гэтак параўноўваюць былое і мінулае. – Калісьці было ўсё смачнейшае, прыгажэйшае...

Грак прахаджваўся моўчкі па стале. Урэшце нафуфырыўся:

– А не маглі б узяць мяне? Я ні разу не слухаў беларускі рок...

– Як не слухаў! – пстрыкнула па яго пёрах Гражынка. – А хто ўвесь час уключае «Тры чарапахі»?

– Бо там пра сланоў і чарапах. Беларускіх.

– У Беларусі ж няма ні сланоў, ні чарапах! – вырачыла вочы бабуля. Яна дасканала ведала ўсе песні гурту «Н.Р.М»! А таксама вершы таты вакаліста Лявона Вольскага, Артура, ды і ягонага дзеда Віталя! – А не кожны трапіць у твор.

– Я б хацеў... – замаркоціўся Грак. – Ёсць жа карціны, скажам, «Гракі прыляцелі», бачыў я ў «Энцыклапедыі сусветнага мастацтва». Трапілі ў сусветнае, бачыце...

– Буду бачыць Лявона, – азваўся тата, – запрапаную, каб штосьці напісаў пра гракоў. Грак і рок – гэта класна, ці вы не заўважылі?

– А мне так хочацца паехаць на «БАСовішча»! – зноў пачаў ныць Грак.

– Гэта месца, прабач, не для звяроў...

– А я бачыла адну дзяўчыну з прыручаным белым пацуком на плячы. Ён так называўся... неяк, о, Пац!

Грак схапіўся крылом за сэрца.

Міра Лукша




1. **На якія фестываль паехала Гражынка?**
2. **Дзе ён праходзіў?**
3. **Які гурт ведала бабуля?**
4. **Якую музыку ты слухаеш?**
5. **Знайдзі больш інфармацыі пра «БАСовішча».**

# Род і лік прыметнікаў

**Цяжка знайсці тэкст, у якім няма прыметнікаў – слоў, што дапамагаюць нам уявіць, якія па сваіх якасцях той чалавек ці той прадмет, што названы назоўнікам: не проста *вучаніца*, а *разумная, добрая, прыгожая*, не проста *кніжка*, а *цікавая, прыгодніцкая, новая*. Прыметнікі адказваюць на пытанні які? якая? якое?**

**1. Адзін з назоўнікаў кожнага словазлучэння замяні прыметнікам так, каб захаваць яго сэнс.**

Узор: збан з гліны – гліняны збан.

сукенка з бавоўны, дом з цэглы, самалёт з паперы, хлеб з жыта, стол з дрэва, нож са сталі, кубак са шкла, крэсла з жалеза, абутак са скуры

**2. Пастаў прыметнікі ў патрэбным родзе.**

(шырокі) акно
(смачны) суп
(сіні) сукенка
(зялёны) трава

(мяккі) трава
(добры) сяброўка
(цёмны) хмары
(высокі) дрэва

**3. Растлумач сэнс словазлучэнняў. Складзі і запішы з імі сказы.**

высокае дрэва, высокая цана, высокі голас, высокі рост

**4. Злучы назоўнікі з прыметнікамі.**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | хлеб | | рукі | | дождж |
| свежы | паветра | залаты | медаль | рэдкі | сетка |
| | газета | | | | выпадкі |

**5. Запішы словазлучэнні ў форме множнага ліку.**

высокі бераг, халодны вецер, шырокая рака, густы лес, чорнае кацяня, прыгожае дрэва, цікавая кніжка, чысты сшытак, смачны абед, вузкая дарога.

# У тэатры

Гавораць, што тэатр пачынаецца з вешалкі. І сапраўды, перш чым прайсці ў залу, трэба зняць верхнюю вопратку. У гардэробе ніхто не тоўпіцца, усе па чарзе здаюць ці атрымліваюць свае рэчы. Побач з гардэробамі люстра. Падыдзі і паглядзі на сябе: ці ў парадку прычоска, ці расшпілены дзе-небудзь гузік.

Займі сваё месца да таго, як пачынаецца спектакль. Нельга размаўляць у час спектакля, раскручваць цукеркі, есці марожанае. У цішыні залы нават шэлест паперы перашкаджае гледачам і артыстам.





Артысты заўсёды вельмі стараюцца, каб спектакль спадабаўся гледачам. І гледачы дзякуюць ім за гэта. А як правільна падзякаваць акцёру? Па-першае, – апладысментамі. Вельмі добра, калі апладысменты гучаць пасля заканчэння і ў канцы спектакля. Па-другое, – кветкамі. Калі ты падрыхтаваў іх, уручы артысту пасля заканчэння спектакля.

Артыстам будзе вельмі непрыемна, калі ты, не чакаючы заканчэння спектакля, пабяжыш у гардэроб па сваё адзенне, яны ж самі не спяшаюцца расстацца з гледачамі, дзякуючы ім за апладысменты, некалькі разоў выходзяць на сцэну і кланяюцца.

Сяргей Докіш



[?]

1. **Як павінны паводзіць сябе гледачы ў тэатры?**
2. **Ці ты любіш глядзець тэатральныя пастаноўкі?**
3. **Які спектакль табе спадабаўся?**
4. **Якія тэатры працуюць у Беластоку?**
5. **Паглядзі спектакль удзельнікаў тэатральнага гуртка «Гульня ў тэатр», які працуе ў Пачатковай школе № 4 імя Сібіракоў у Беластоку.**
   **https://youtu.be/3Ax_gLLMCXI**

# Каму нашкодзіў Вірус Шкодзя

Аднойчы вырашыў Вірус Шкодзя пабыць добранькім. Як быццам стаць добрым можна па загадзе. Проста настрой такі з'явіўся ў яго, мо надакучыла шкодзіць. Але дзе ты той дабрыні возьмеш, калі ўвесь час толькі штукарствам ды сваавольствам займаўся, з даверлівых людзей пацвельваўся?

Аднак адступаць ад свайго Шкодзя не прывык. Лазіў-блукаў ён па камп'ютарных лабірынтах – таемна, вядома, і нечакана натрапіў на звесткі, што ў аднаго багаценькага сеціўца шмат грошай захоўваецца на банкаўскім рахунку. Вырашыў Шкодзя падзяліцца чужым набыткам з кім-небудзь з менш багатых.

Узламаў ён ахоўны банкаўскі код і атрымаў доступ да рахунка. А тады ўзяў і напісаў аднаму хлапцу-сеціўцу – заядламу камп'ютаршчыку Юзеру – пісьмо, у якім павіншаваў яго з вялікім выйгрышам у міжзорнай латарэі. А да пісьма рахунак прыклаў на значную суму.

Думаў, во здзівіцца і парадуецца нечаканаму шчасцю юнак!

Пачаў назіраць за рэакцыяй шчаслівчыка.

Уключыў Юзер камп'ютар, каб праверыць пошту, і сапраўды здзівіўся. Можна сказаць, нават спалохаўся. Але не ад радасці, а ад нечаканасці. Хто гэта яму такі шчодры падарунак зрабіў? Хто і адкуль прыслаў гэтульки грошай?

Колькі ні думаў, нічога не мог прыдумаць. Розныя нядобрыя думкі лезлі ў галаву. Палічыў, што нехта проста здзекуецца з яго, падкупіць збіраецца, каб на якую-небудзь невядомую планету завезці.

Вірус жа хуценька вывеў на экран Манітора Дысплеевіча канцоўку свайго фальшывага пісьма. У ім было сказана, што Юзеру выпаў вялікі выйгрыш у міжзорнай латарэі. Шкодзя ўжо гатовы быў разам з атрымальнікам грошай задаволена засмяяцца – хлопец ад таго, што грошы вялікія, а Вірус, што так удала паспрыяў чалавеку.

Але замест смеху давялося Шкодзі сумна скрывіцца – юнак не толькі не ўзрадаваўся, ён проста абурыўся:

– Хто гэта так няўдала пажартаваў? Хто здзекуецца з мяне? Я ж ніякай латарэі не купляў, адкуль у мяне выйгрыш?..

Наважыўся Вірус пераканаць хлапца. Ужо і пісьмо сваё хлуслівае скляпаў ад імя сябра з іншай планеты. Маўляў, гэта ён купіў Юзеру латарэйны білет, але не паспеў адаслаць яго да ўсеагульнага дня смеху. А цяпер вось разам з выйгрышам і паведамляе пра шчаслівы выпадак.

Закончыў Вірус Шкодзя пісаць, засталося толькі падпісацца. Але нечакана задумаўся: не будзе ж ён сваё сапраўднае прозвішча называць, таямніцу парушаць.



Пакуль думаў-разважаў, Юзер пачаў хуценька клавішамі Клавіятуры туркатаць.

Напісаў, што ніякага сябра-дабрадзея на іншых планетах у яго няма. Значыць, падман. А таму ён патрабуе – Вірус ажно здзівіўся: нічога сабе – бач, які суровы: нават патрабуе – каб гэтыя грошы невядомы адрасат забраў назад. А то пакліча на падмогу доктара Антывіруса і тады...

“Ого, які рашучы... – здзівіўся Шкодзя. – Нічога, хутка ачахне, перадумае і забярэ грошы”.

Вірус не мог паверыць, што безграшовы юнак можа так проста адмовіцца ад вялікай сумы.

Тым часам Юзер націснуў на адну кнопку, на другую, пакруціў Мышкай, правёў іншыя маніпуляцыі, і з экрана Манітора Дысплеевіча знікла чужое паведамленне. А разам з ім паляцелі ў невядомасць і тыя грошы, што мог бы атрымаць Юзер.

Мог бы, але не захацеў. Не пажадаў незаслужана прысвойваць тое, чаго сам не зарабіў.

Грошы вярнуліся на рахунак ранейшага гаспадара.

Падзівіўся Вірус Шкодзя гэткай юнацкай сумленнасці ды ў шлях-дарогу міжзорную выправіўся, на сваю планету Вірусанія. Мо каб новы спосаб падману знайсці?

Толькі ты будзь дасведчаным і абачлівым, мой юны сябар, ніколі не забаўляйся з невядомымі пасланнямі, якія прыходзяць на твой камп’ютар.

Анатоль Бутэвіч

[?]

1. **Чым займаўся Вірус Шкодзя?**
2. **Што можаш сказаць пра Юзера?**
3. **Чаму трэба быць «дасведчаным і абачлівым» карыстаючыся інтэрнэтам і камп’ютарам?**
4. **Падрыхтуй свае парады іншым карыстальнікам камп’ютара.**

# Скланенне прыметнікаў

**Прыметнік мае той самы род, лік і склон, што і назоўнік, з якім прыметнік звязаны.**

**1. Спішы і дапішы канчаткі прыметнікаў:**

драўлян... высок... парта, пісьмов... стол, чырвон... кветкі, мал... кацяня, ільнян... бел... абрус, доўг... баваўнян... спадніца, цёпл... паліто.

**2. Надай словазлучэнням форму роднага склону адзіночнага ліку.**

дробны дождж, цёплы дзень, малады лес, каляровая сукенка, чыстая вада, зялёная трава, жоўтае качаня, белае воблака, малое дзіця.

**3. Дапішы да дзеясловаў назоўнікі з прыметнікамі ў давальным склоне:**

**Узор: *радавацца* (чаму?) *новай сустрэчы***

дзякаваць (каму?) ... ..., аддаць (каму?) ... ..., здзіўляцца (чаму?) ... ..., прысвечаны (чаму?) ... ..., расказаць (каму?) ... ..., растлумачыць (каму?) ... ... .

Словы для выкарыстання: старэйшы брат, народны паэт, чарговы юбілей, дарагая бабуля, вясёлае сабачанятка, малы хлопец.

**4. Надай словазлучэнням форму вінавальнага склону адзіночнага ліку.**

стары чалавек, густы лес, ружовая кветка, старая кніжка, добрае надвор'е.

**5. Прачытай. Дапоўні сказы словазлучэннямі (прыметнік + назоўнік).**

Заўтра пайду ў школу з ... ... . Яна глядзела за ім ... ... . У лес можна дайсці ... ... . З ... ... прыйшло да нас лета.

Словы для выкарыстання: цёплае надвор'е, новы пенал, вузкая сцежка, сумны позірк.

**6. Прачытай словазлучэнні. Устаў прапушчаныя літары:**

на пісьмов... стале, у вялік... пакоі, на сух... лістку, у глыбок... возеры, на мякк... падушцы, па вузеньк... кладцы, аб прыгож... песні, на высок... гары, па блакітн... небе, на птушын... пер'і, аб гарач... сонцы.

# Як мы ў пяць секцый хадзілі

Мы жывём з Віцем у адным доме. Дом наш прыгожы, высокі, стаіць на ўскраіне Мінска. Я жыву на дванаццатым паверсе, а Віця ажно на сямнаццатым.

Аднойчы спаткаліся мой тата і мая мама з Віцевымі бацькамі і пачалі гаварыць, што мы дужа звычайныя, як электралямпачкі пад столлю, і што не відаць у нас нейкай іскры. І рашылі яны адшукаць у нас гэтую іскру.

Купілі нам канькі, прыгожую форму і павезлі нас у дзіцячы парк імя Горкага, у секцыю фігурнага катання. Зайграла музыка, і мы пачалі вучыцца танцаваць на каньках. Мы, праўда, і раней ужо танцавалі. Але тое было ў дзіцячым садзе, і не на каньках, і не на лёдзе.

Першы я ўпаў. Потым – Віця. Потым мы ўпалі разам. Пад’ехала трэнер і кажа:

– Хлопчыкі, у вас абодвух нешта не ў парадку з раўнавагай.



Мы адказалі, што раўнавагі ў нас хапае, што ў дзіцячым садзе нас доктар правяраў, але надта слізкі тут лёд.

Не сталі мы, адным словам, фігурыстамі, хоць мая мама сказала Віцевай маме, што ў цырку нават мядзведзі на каньках катаюцца.

Потым павялі нас у басейн. Усе сцены выкладзены там бліскучай белай кафляй. Фікусы ўздоўж сцен у бочках растуць...

Дзень мы плавалі, другі, трэці... А потым Віцька шэпча мне на вуха ў раздзявальні:

– Мы хто – дэльфіны? Ці кіты? Усё плавай ды плавай. Так заместа рук могуць плаўнікі вырасці. Усе людзі толькі ўлетку плаваюць, а чаму мы яшчэ і зімой павінны?

Мой тата раззлаваўся і павёў нас у хакейную секцыю. Віцю далі шлем, канькі і клюшку, а мне тое ж самае ды яшчэ ў дадатак маску, сплеценую з дроту. Стаў я варатарам, а Віця – нападаючым.





Ён моцна шайбу кідае – я прапускаю. Ён слабей – я прапускаю. Ён зусім ціха – я зноў прапускаю!

– Ці не магнітны ты, хлопчык? – здзівіўся трэнер. – Усе шайбы так і ўцягваеш у вароты. Нам такія варатары не патрэбны. Ідзі лепей у шахматы гуляць.

Пайшоў я ў шахматны гурток, і Віця разам са мной. У шахматным гуртку – любата! Ні плаваць не трэба, ні на каньках катацца, ні шайбы адбіваць. Сядзі сабе ды думай. Пра што думаць? А гэта ўжо ад чалавека залежыць. Адзін думае, як хутчэй ход зрабіць, другі – як марожанага тры порцыі купіць ці фільм для дарослых па тэлевізары паглядзець...

Не сталі мы шахматыстамі.

Тут ужо не на жарт усхадзіўся Віцеў тата:

– Не можа быць, каб у нашых дзяцей іскры не было! Нашы дзеці таленавітыя, толькі неабходна ўбачыць у іх гэты талент. Тэхніка – вось што ім трэба!

Запісалі нас з Віцем у картынгісты. Картынгі, калі хто не ведае, гэта такія маленькія-маленькія машыны з дужа траскучым матoрам. Ездзілі мы з Віцем, аж вецер свістаў увушшу. Але аднойчы на павароце стукнуліся па-сяброўску нашы картынгі адзін аб адзін і разваліліся. Добра, трэнер не бачыў. Пабеглі да свайго дома, задыхаліся. А дом наш, трэба сказаць, зусім новы, на пустэчы стаіць, і вакол яго яшчэ ні дрэўца, ні кусціка...

Леанід Дайнека

[?]

1. **Зрабі характарыстыку герояў апавядання.**
2. **У якія секцыі запісвалі герояў гэтага апавядання бацькі ?**
3. **Што думаеш пра гэтых хлопцаў?**
4. **Ці ты займаешся спортам?**
5. **Які від спорту цябе цікавіць? Раскажы пра яго.**
6. **Чаму, на тваю думку, карысна займацца спортам.**


Прафесіі

# Мы спрачаемся

У зялёным бары
Заспрачаліся сябры.
І спрачаліся,
І злаваліся,
І смяяліся.
Чыя работа лепшая?
Чыя турбота першая?
Самая патрэбная – чыя?
– Касманаўтам быць хачу,
Я да Марса далячу!
– Пачакай яшчэ, малыш!
Без мяне не даляціш.
Для тваіх высокіх мар
Я патрэбны – сталявар.
Я збудую на зямлі
Для палётаў караблі.
– А ў мяне намер такі –
Быць прафесарам, браткі.
Скажа бабка :
 – Мой унук
З Акадэміі навук!
– А хто ж стане гарманістам?
Хто на вёсцы трактарыстам?
– Хто шафёрам-малайцом?
– Хто збудуе новы дом?
У зялёным бары
Заспрачаліся сябры.

– Футбалістам быць цікава –
Мяч ганяеш злева, справа!
Я – адважны, я – здаровы,
Варатар я адмысловы!
– Гол-гол, голы гол!
Справа добрая – футбол.
– А хто будзе скрыпачом?
– Хто дзіцячым урачом?
– Хто з нас будзе лесаводам,
Каб жыла-цвіла прырода?
У зялёным бары
Заспрачаліся сябры.
І спрачаліся,
І злаваліся,
І смяяліся.
Чыя работа лепшая?
Чыя турбота першая?
Самая патрэбная – чыя?

паводле Эдзі Агняцвет

[!]

1. Чаму спрачаліся сябры?
2. Якія прафесіі падабаліся хлопцам?
3. Кім працуюць твае бацькі? Чым яны займаюцца?
4. Як ты думаеш:
   «Чыя работа лепшая?
   Чыя турбота першая?
   Самая патрэбная – чыя?»
   Абгрунтуй свой адказ.
5. Якія твае планы на будучыню?

# Касманаўт

Аўтобус, якім мы ехалі, вельмі часта спыняўся, падбіраў усё новых пасажыраў. Час цягнуўся марудна, стаяла летняя гарачыня, і дарога здалася ўсім цяжкай і доўгай.

Нарэшце паказаліся першыя будынкі пасёлка. Пасажыры з палёгкай уздыхнулі . Але нечакана шафёр затармазіў, ды так рэзка, што людзі, якія стаялі, паваліліся адзін на другога.

– Што там такое? – пачуліся незадаволеныя галасы.

Пасярод дарогі стаяла жанчына з раскудлачанымі валасамі. Гэта яна спыніла аўтобус. Побач на абочыне дарогі сядзеў хлапчук гадоў васьмі, у нагавіцах і майцы, і толькі праз меру вялікая галава яго была абвязана хусткаю да самых вачэй. Жанчына схапіла хлапчука за руку і пацягнула да адчыненых дзвярэй аўтобуса.

– Ну, хутчэй! – груба штурхала яна малога. Але той спыніўся ля самых дзвярэй і, як сляпы, пачаў намацваць прыступку. Нехта з пасажыраў падхапіў хлопчыка за руку і памог увайсці ў аўтобус, які адразу крануўся з месца.

– Навошта яму памагаць! – замест падзякі сярдзіта сказала жанчына і пачала папраўляць валасы. Пасажыры здзіўлена пераглянуліся.

– Што гэта за маці такая? – пачулася ціхае здзіўленне. – Дзіця хворае, а яна крычыць на яго...

– Не маці, а, напэўна, мачыха, – зазначыў стары дзед і пасунуўся, каб даць месца маломў. – Ідзі, унучак, сядзь са мною... – запрасіў ён.

Але хлопчык прытуліўся галавой да жанчыны і жаласна захныкаў.

– Давай развяжу, а то задыхнешся, – лагодна сказала яна і пачала развязваць хустку на хлапчуку.

Ад цікаўнасці пасажыры нават падняліся са сваіх месц, каб лепш убачыць, што такое з малым.

Хлапчук не даваўся, трымаючыся рукамі за галаву. Але маці сцягнула хустку з сына.

На галаве малога быў круглы чорны чыгун, і толькі з выбітай шчыліны выблісквалі жывыя дзіцячыя вачаняты.

– У-у-у! – загуло ў сярэдзіне чыгуна, і хлапчук зноў уткнуўся ў матчын фартух.

– Ціха! Чуеш? Вось прыедзем у бальніцу, там табе знімуць твой шлем. Выдумаў сабе на бяду.

Пасажыры стрымана заўсміхаліся. Ніхто не адважыўся вясёлым рогатам пакрыўдзіць цярплівага пакутніка.

Аўтобус спыніўся якраз насупраць амбулаторыі. Жанчына з хлапчуком выйшлі. А за імі высыпалі і ўсе астатнія пасажыры. Праз



адчыненае акно амбулаторыі было відаць, як у прыёмным пакоі доктар пстрыкнуў пальцамі па чыгуну і сказаў, заглядаючы ў шчыліну:

– Што, браток, надзець змог, а зняць не можаш? Ну, нічога, здымем. Пацярпі...

Ён падышоў да дзвярэй і гукнуў:

– Данілавіч! Ідзі сюды. Гэта па вашай часці...

На парозе прыёмнага пакоя паявіўся вусаты санітар. Ён пакруціў галавой, пацмокаў языком, узяў хлопчыка за руку і павёў за сабой.

Пасажыры не разыходзіліся. Усе быццам забыліся пра свой клопат. Кожнаму было цікава, як жа ўсё скончыцца.

Неўзабаве на ганак выскачыў наш герой. Увесь спацелы, перамазаны сажай, ён трымаў у руках дзіравы чыгун.

Хлапчук вінавата азірнуўся. Бачачы, што ён ніяк не можа расстацца са сваім злашчасным шлемам, маці выхапіла чыгун з яго рук і шпурнула ў сметніцу.

Вусаты санітар выйшаў на ганак.

– Ну і цярплівы ж... – задаволена сказаў ён. – Гэтак я яго прыціснуў, аж самому горача стала, а ён хоць бы што – толькі сапе... Такі, напэўна, будзе гэтым... як яго...

– Касманаўтам! – у адзін голас падказалі пасажыры і пайшлі садзіцца ў аўтобус.

Клаўдзія Каліна

[?]

1. **Што думаеш пра гэту гісторыю?**
2. **Ці спадабаўся табе хлопчык? Абгрунтуй свой адказ.**
3. **Што думаеш пра маці хлопца?**
4. **Што можаш сказаць аб пасажырах аўтобуса?**
5. **Якія парады можаш даць гэтаму хлопцу? Запішы іх.**

Вывучы словы песні

*вяснянка з вёскі Кнаразы*

# Там, по маёвуй росі

Там, по маёвуой росі. х 2
Ясь конічэнька пас...(э).

Ой пасэ ж вуон, пасучы, х 2
Жалосно гукае.

Ештэ коніки травку, х 2
Зэлёную мураў... (ку)

Здроёву воду пьетэ х 2
І в дорожэньку йде... (тэ)

Поедэмо до бору х 2
Нарубаем явор... (у)

Поставімо светліцю х 2
Для Ясенька тэмніць... (ю)

Посадімо Ясенька х 2
На рочок, на чэты... (ры)

Сідіт Ясенько рочок х 2
Вжэ другі наступа... (е)

Вжэ й другі наступае х 2
Ясь Касюлі пыта... (е)

За што Касюлю, за што х 2
Чы за вянэк рутвян... (ы)

Ні за вянэк рутвяны х 2
Но за пэрстэн злоцан... (ы)

## Тэмы:

1. Змяюка пад камянюкай.
2. Выбары.
3. Лічэбнік.
4. Белае Падляшша.
5. Колеры.
6. Вадасховішча.
7. Прыслоўе.
8. Сцяжынка.
9. Песня «Аксамітны летні вечар».

# Змяюка пад камянюкай

Маёй сяброўцы Волі бацькі купілі чарапаху. Надта пацешную: яна вазіла на сабе Вольчыных лялек, кубікі, кніжкі, запаўзала пад ложак і пад шафу, і мы з Воляй выцягвалі яе адтуль. Чарапаху назвалі Марусяй.

Улетку Воля выносіла чарапаху з хаты і пускала яе пагуляць на свежым паветры. І вось аднойчы чарапаха прапала. Мы яе шукалі-шукалі ў высокай траве, але так і не знайшлі.



Каб Воля не плакала, бацькі падаравалі ёй кацяня. Таксама пацешнае: яно гуляла з паперкай, падвешанай на нітцы, качала па падлозе маленькі мячык, забіралася да нас на калені і пачынала вуркатаць.

Неяк мая мама прапалвала ў агародзе градкі і раптам закрычала:

– Вой, змяя!

Я падскочыла да мамы. Сапраўды, сярод агуркоў з-пад каменя высоўвалася змяіная галава.

– Назад! – крыкнула мама. – Укусіць!

Я стрымгалоў кінулася ў хату.

– Сашка! – закрычала брату. – Змяюка пад камянюкай!..

Брат, а за ім бацька, ужо беглі ў агарод. Сашка падхапіў з зямлі палку. Маці, раскінуўшы рукі, не пускала яго на градкі.

– Укусіць! – крычала яна немым голасам.

Але брат нырнуў ёй пад руку, палкай падхапіў камень і перавярнуў яго. Камень пракуліўся і… Мы збянтэжыліся, а брат двума пальцамі схапіў «камень» і патрос яго перад маім носам:

– Дык гэта ж наша Маруська!

Усе пачалі смяяцца, а мама, бадай, гучней за ўсіх. Ад страху.

Я ўзяла чарапаху, прыціснула да сябе і з усіх ног пабегла да Волі.

– Маруся знайшлася!

А брат потым яшчэ доўга дражніўся:

– Змяюка пад камянюкай! Змяюка пад камянюкай! Ратуйся, хто можа!..

Тамара Бунта

[?]

1. **Якія звяры былі ў Волі і як яна імі займалася?**
2. **Ці ў цябе ёсць звяры? Якія?**
3. **Сфатаграфуй свайго любімца і падрыхтуй расказ пра яго.**

# Выбары

– Ну й выбралі, – уздыхнула бабуля, што, як пару дзён таму аказалася, балаціравалася на выбарах. – Мяне не выбралі, хоць здабыла найбольш галасоў у акрузе. Прагарэў наш камітэт.

– Дык чаму вы зусім не вялі выбарчую кампанію? – здзівіўся Грак так, што аж пёры сталі вожыкам на яго чэрапе. – Перш за ўсё ў хаце маглі б яе весці.

Бабуля паглядзела ў чорнае гракова вока.

– А што, памог бы мне сваімі чарадзействамі-марачэннямі?

– У пэўным сэнсе я прадчуваў, што ў вас, бабуля, нейкія важныя справы ідуць, дык сядзеў і марачыў. Уявіў вас як вельмі важную



асобу, якая накрывае сваёй хустай аграмадную плошчу зямлі. І ад вас выпраменьвалася цёплае святло, якое абагравала тую акругу.

– Ну й ды ўява! – горка засмяялася бабуля. – Мабыць, таму і столькі галасоў аддалі за мяне людзі. Не жарты – намарачыў. Ды чаму ж ты не начараваў усяму нашаму свойскаму камітэту?

– Дык трэба было надрукаваць на лістах не ВК НСК, а канкрэтна: «Выбарчы камітэт Наш свойскі камітэт». Пэўна, людзі прачыталі «Не свая каманда», ці нешта кшталтам такога.

– Ты не здзекуйся, Грак. Дарэчы, сам трапіш паміж варон, як кажуць палякі, мусіш каркаць як яны. Я адразу гэта прыкмеціла, дык хто ж мяне, старую, паслухае.

– Бабуля, а, бабуля, а там не было надрукавана, што на пятым месцы ў спіску стаіць Міхалёва. Каб было, што на яе трэ аддаць свой голас, дык яшчэ больш галасоў атрымалі б. Вас усе ж ведаюць у акрузе як Міхалёву.

Тут бабуля ўжо поўнасцю павесялела, разрагаталася.

– Гражынка, вучыся ў нашага Грака. Праз пару гадоў сама будзеш мець выбарчыя правы. І сама выбіраць будзеш, і цябе выбраць іншыя могуць. Ва ўсеагульных, роўных і прамых выбарах – у Сейм, у органы самакіравання...

Грак закрыў вушы крыламі, зусім, як Гражынка.

– Дык ідзі з тымі, хто называецца такім, якім ёсць, – працягвала свае палітычныя развагі бабуля.

– А, можа, Гражынка, зблакіруешся з нашай бабуляй? – Грак начуўся ўсялякага ў тэлевізары і мог пахваліцца. – І мяне далучыце, як чорную меншасць.

Міра Лукша

1. **Чым займалася бабуля?**
2. **Якія парады бабулі даваў Грак?**
3. **Што значыць выраз: «мець выбарчыя правы»?**
4. **Якія ты ведаеш органы самакіравання?**

# Лічэбнік

**Лічэбнік** – часціна мовы, якая абазначае лік, колькасць прадметаў, а таксама парадак прадметаў пры лічэнні. У залежнасці ад значэння і граматычных прымет лічэбнікі падзяляюцца на **колькасныя** і **парадкавыя**. **Колькасныя лічэбнікі** абазначаюць лік або колькасць прадметаў і адказваюць на пытанне **колькі**?
*трынаццаць гадоў, дзевяць* дзеліцца на *тры.*
**Парадкавыя лічэбнікі** абазначаюць парадак прадметаў і адказваюць на пытанне **які? (каторы?)** *пяты* клас, *дзявятая* асоба.

**1. Прачытай тэкст. Назаві ўсе лічэбнікі.**

Можна напісаць, што на польскім баку мяжы яна займае плошчу каля шасціста квадратных кіламетраў, а разам з беларускім каля тысячы чатырохсот квадратных кіламетраў, але ж гэта менш чым адзін працэнт усіх польскіх лясоў. З польскага боку гэта месца жыцця не больш чым чатырох воўчых зграяў і можа пятнаццаці рысяў. У параўнанні з пушчамі, якія яшчэ тысячу гадоў назад парасталі наш кантынент, Белавежская пушча са сваімі чатырохмастамі зуброў, дзвюма тысячамі аленяў, гэта нішто.

Белавежская пушча, гэта не звычайны лес. Гэта лясны дыназаўр, мамант, які не падзяліў лёсу падобных ёй пушчаў. Па ўсіх астатніх пушчах з іх пушчанскага характару засталася толькі назва. А гэтая адна, гэтая крошачка, засталася. Не толькі з назвы. Яна яшчэ пушча як след.

Адам Вайрак

**Лічэбнік** спалучаецца толькі з назоўнікам.

**2. Прачытай словазлучэнні. Падзялі лічэбнікі на колькасныя і парадкавыя:**

Шэсць і сем будзе трынаццаць, адзін яблык, нуль цэлых дзве дзясятыя, да сямі дадаць пятнаццаць, дзевяцьсот гадоў, восьмая гадзіна, першага чэрвеня, дванаццаць месяцаў, трэцяя чвэрць, дваццатае стагоддзе, пятае качаня, трэці ўрок, мільён злотых, двухсоты вучань, пяцьдзясят два гады, трыццаць тры дні, трыста сорак сем кілаграмаў, другі паверх.

Не ўсякае слова, што выражае колькасць, адносіцца да лічэбніка.
Лікавае значэнне могуць перадаваць іншыя часціны мовы:
назоўнік *двойка, тройка*, дзеяслоў *падвоіць.*

# Белае Падляшша

Учапілася за сэрца
дзікім вінам Падляшша,
зялёнаю тугою
танцуе карагод.
Над рэчкаю за вёскай
ў далоні ліпень пляшча
і цэдзіцца праменнем
забраны сонцу мёд.

Белая, белая, белая нявіннасць,
Белая, белая, белая Русь.
Слоў крышталёвых шукаю гімнаў
і напаіць цябе імі баюсь.

Як добра мець пад сонцам
кусок зямлі ва ўласнасць,
дзе ходзіць полем бацька,
а мо ўжо толькі цень.
І сее з небасхілаў
ліпеньскі мёд і яснасць.
Здзіўляюцца анёлы,
што так яму расце.

Белае, белае, белае Падляшша,
зялёная, зялёная, зялёная Русь.
Стаіш нада мною і сэрца насцеж
адкрыла, а я ўваходзіць баюсь.

Міхась Андрасюк

[!]

1. Які настрой у вершы? Абгрунтуй свой адказ.
2. Як разумееш выразы: «учапілася за сэрца», «у далоні ліпень пляшча», «адкрыла сэрца насцеж»?
3. Якія колеры выступаюць у вершы?
4. Паспрабуй раскрыць сімволіку колераў з верша.
5. Якія адносіны паэта да зямлі, на якой ён жыве?

# Чорным па белым

Колькі існуе колераў? Насамрэч, мастакі і фізікі-оптыкі скажуць, што бязмежная колькасць (але пры гэтым вылучаюць 3 або 4 асноўныя колеры, а чорны і белы не лічаць колерамі, бо чорны – гэта адсутнасць колеру, а белы, наадварот, – змяшэнне ўсіх колераў).

Назваў колераў у мове, канешне, абмежаваная колькасць. Прычым для мовы і чорны, і белы – гэта таксама колеры. У розных мовах колькасць колераў можа не супадаць, і гэта адбываецца не таму, што нашы вочы бачаць па-рознаму. Гэта, хутчэй за ўсё, сведчанне актуальнасці тых ці іншых колераў у культуры асобных народаў.

Назвы колераў бываюць нематываваныя з сучаснага пункту гледжання (сёння цяжка вызначыць іх паходжанне) і матываваныя (маюць празрыстую форму). Нематываваныя, натуральна, з'яўляюцца ў большасці сваёй самымі старажытнымі. Да такіх назваў колераў адносяцца, напрыклад, *белы, чорны, зялёны, сіні, шэры, жоўты* і іншыя. Матываваныя назвы, адпаведна, па сваім паходжанні вытворныя і ўзніклі пазней: *карычневы* ад *карыца, салатавы* ад *салата, бэзавы* ад *бэз, ружовы* ад *ружа, валошкавы* ад *валошка* і г.д.



Сімвалічным спалучэннем колераў з’яўляецца вясёлка. Можна лёгка запомніць колеры і іх паслядоўнасць у вясёлцы, выбраўшы і завучыўшы адну з падказак на свой густ.

**Ч**ыж **а**ддаў **ж**уку **з**агад: **б**рат, **с**хавай **ф**отаапарат.

**Ч**эшскі **п**ан **ж**адае **з**ноў **б**ачыць **с**орак **ф**азаноў.

**Ч**аму **п**тах **ж**урботны **з**ранку? **Б**о **с**апсута **ф**іліжанка.

Такім чынам, першыя літары слоў адсылаюць нас да назваў колераў у вясёлцы: **ч**ырвоны – **а**ранжавы (**п**амаранчовы) – **ж**оўты – **з**ялёны – **б**лакітны – **с**іні – **ф**іялетавы.

Нельга перааценіць сімвалічную ролю колераў. У беларускай міфалогіі, фальклоры, этнаграфіі, паводле даследаванняў, існуюць тры асноўныя (белы, чырвоны, чорны – універсальная колеравая трыяда) і чатыры дадатковыя колеры (жоўты, зялёны, сіні, шэры).

У адзенні ж беларусаў пераважалі два колеры – белы і чырвоны.

У народнай культуры кожны з колераў меў некалькі значэнняў.

*Белы* – пачатак, жыццёвая сіла, а таксама пустэча, бесцялеснасць, нараджэнне новага і знікненне старога.

*Чырвоны* – жыццё, кроў, агонь, узнаўленне, здароўе, ваяўнічасць, а таксама крывавая небяспека, парушэнне гармоніі, смерць і яе пераадоленне.

*Чорны* – распад, ноч, сон, адсутнасць свядомасці, смерць.

*Жоўты* – нешта чужое, хвароба, смерць, разбурэнне.

*Зялёны* – маладосць, зменлівасць, няспеласць, актыўнасць, развіццё.

*Сіні* – аддаленасць ад чалавечага свету, чужароднасць, неба, мора.

*Шэры* – зменлівасць, няяснасць, туманнасць, змешанасць.

Мова нанова: 20 крокаў да беларускай мовы, 2 частка

**1. Раскажы пра свае любімыя колеры?**
**2. Разгледзь, паводле ўласнага выбару, карціну Лявона Тарасэвіча.**
**3. Прыдумай да карціны загаловак.**
**4. Знайдзі інфармацыю пра вядомых польскіх мастакоў беларускага паходжання.**

# Вадасховішча

*Жыхарам памёрлых вёсак прысвячаю*

Дзе дрэва старое, дзе студня –
Бясследна і без пары
Памерлі Лука і Рудня,
І Боўтрыкі, і Гарбары.

І знікнулі тут назаўсёды
Сялян гэтых вёсак сляды.
Загінуў след працы народу
У хвалях сцюдзёнай вады.

Калісь, на пытанне такое:
– Дзе нарадзіўся, дзе рос?
Пачуем: – Пад гэтай вадою
З зямелькай звязаўся мой лёс.

Памёрлым спакойна не спіцца,
Па смерці ўтапілі тут іх.
Не прыйдзе пад крыж памаліцца
Ніхто і ніколі з жывых.

Прыедуць у святы і будні
Турысты з усіх гарадоў
На могільнік Лукі і Рудні,
Ці Боўтрыкаў і Гарбароў.

Віктар Швед



[!]

1. Які настрой у вершы? Абгрунтуй свой адказ.
2. Пра якое вадасховішча піша паэт?
3. Як разумееш словазлучэнне «памерлыя вёскі»?
4. Паглядзі фільм Тамары Саланевіч «Ці чуеш як плача зямля».
   https://www.youtube.com/watch?v=7pXdUPa1X8s
5. Паслухай песні з дыску «Лука. Песні з глыбіні».

# Прыслоўе

**Неяк увесну, даўным-даўно**, вандраваў па Беларусі добры чараўнік. Здарожыўся ён. І есці не меў чаго. Ажно бачыць – арэ **непадалёку** палетак селянін. Зямля пясчаная, **а сям-там** камяністая. Конік **ледзь** цягне драўляную саху. А ў самога гаспадара кашуля на спіне – хоць выкручвай ад салёнага поту.

Прывітаўся чараўнік з хлебаробам. Слова за слова – разгаварыліся. **Потым** араты запрасіў падарожніка папалуднаваць. Хоць які там полудзень. Акраец чэрствага хлеба, некалькі горкіх цыбулін ды крынічнай вады збанок.

Але **нездарма** людзі кажуць: не дораг абед, а дораг прывет. Падсілкаваўся **трошкі** падарожнік-чарадзей, пачаў распытваць у аратага пра ягонае жыццё-быццё, якую ён хацеў бы мець палёгку.

«Ніякай мне не трэба палёгкі, – адказаў яму селянін. – Толькі слухаць абрыдла, як грукае каменне аб саху...»

Добры чараўнік счакаў, пакуль адыдзецца, налягаючы на саху, хлебароб, **потым** узяў у рукі маленькі камень і **штосілы** шпурнуў яго ў неба. І толькі ён тое зрабіў – зашчабятала, зазвінела ў паднябессі шэрая птушка. **Весялей** пацягнуў саху знясілены конь, **упершыню** за цэлы дзень усміхнуўся араты.

Уладзімір Ягоўдзік

**1. Што абазначаюць выдзеленыя словы?**

**2. З якімі часцінамі мовы яны звязаны ў сказе?**

**3. На якія пытанні адказваюць?**

**Прыслоўе** – самастойная нязменная часціна мовы, якая абазначае прымету дзеяння, прымету іншай прыметы або прадмета і адказвае на пытанні **як? дзе? куды? па якой прычыне? якім чынам? колькі? чаму? з якой мэтай? навошта? і інш.**

**як?** *уголас, знянацку, павольна, хутка, добра, нясмела, прыгожа, паасобку*
**дзе?** *уверсе, непадалёку, справа, злева, дзесьці, тут, там, дзе-небудзь, нідзе, усюды, сям-там*
**куды?** *дадому, туды, сюды, далёка, налева, куды-небудзь, уніз*
**калі?** *вечарам, сёння, заўтра, улетку, даўно, апоўдні, незадоўга, штодзень*
**якім спосабам?** *добра, прыгожа, безупынна, нячутна, паволі, моўчкі, знянацку*
**колькі?** *менш, многа, ледзь-ледзь, чуць-чуць, даволі, дастаткова, занадта*
**з якой мэтай?** *назло, напаказ, наўмысна, наперакор, знарок*

## 1. Складзі сказы з прыслоўямі:

па-людску, уголас, паціху, упару, летась, ніколі, здалёк, на памяць, неўзабаве, назаўсёды, даволі, па-беларуску.

## 2. Спішы, устаўляючы адпаведныя прыслоўі:

Дзеці бегалі ... .
Настаўнік гаварыў ... .
Мы накіраваліся ... .
... наш клас ідзе ў кіно.
Яна чытае ... .
Яны жывуць тут ... .
Коля едзе ... .
Нам трэба ... вучыцца.
Хлопец прыйшоў ... .

## 3. Складзі словазлучэнні з прыслоўямі:

сядзеў (як?) ...
спяваў (як?) ...
ідзе (куды?) ...
бяжыць (адкуль?) ...
бачыла (калі?) ...
прыходзілі (калі?) ...
чыталі (як?) ...
ляжыць (дзе?) ....

# Сцяжынка

Чым яна славутая? Ды літаральна нічым. Самая звычайная сцяжынка, якіх у кожным лесе дзясяткі. А для мяне яна самая дарагая з усіх, па якіх я калі-небудзь хадзіў.

Няма, бадай, такога часу ў сутках і дня ў годзе, калі б мне не даводзілася на ёй бываць. Быў я тут апоўдні і апоўначы, на ранішнім золку і на змярканні, у холад і летнюю спёку.

Вясной, абавязкова да надыходу мая, на ёй пачынае адлічваць гады зязюля.





Ранняя вясна ці позняя, аднолькава гучна ў галінах зазелянелых бяроз спяваюць чырванагрудыя берасцянкі, выводзяць свае флейтавыя каленцы залацістыя івалгі...

Летам каля сухіх пнёў вельмі рана наспяваюць духмяныя суніцы. У гэты час тут нярэдка можна сустрэць цэлую сям'ю жоўценькіх цецеручкоў, якія пад наглядам старой маці-цяцеркі ласуюцца салодкімі ягадамі.

Пазней сцяжынка густа зарастае фіялетава-жоўтымі кветачкамі браткаў, сінявокімі званочкамі, духмяным чаборам.

А як тут пасля першага цёплага летняга дажджу мёдам пахне! Аж галава кружыцца!..

Восенню, калі б ні ішоў сцяжынкай, абавязкова сустрэнеш на ёй вожыка з некалькімі пабурэлымі лістамі на спіне, залюбуешся крамянымі баравікамі, што, здаецца, сышліся з усяго лесу пагрэцца на скупым асеннім сонейку...

Зімой на ёй любяць гуляць зайцы-белякі. Скачуць па мяккім белым палатне пушыстыя вавёркі.

А то часам, утоптваючы снег, пройдзе цёмнай лютаўскай ноччу чарада галодных ваўкоў...

Зусім звычайная лясная сцяжынка. Для мяне ж яна самая блізкая.

Рыгор Ігнаценка

[?]

1. **Чым характэрная сцяжынка вясною, а што пабачым на ёй улетку?**
2. **Каго сустрэнеш восенню?**
3. **Якіх звяроў можна спаткаць зімой?**
4. **Знайдзі ў тэксце прыслоўі. Запішы іх.**
5. **Раскажы пра свае ўлюбёныя месцы.**
6. **Якія месцы плануеш наведаць у час канікулаў? Чым будзеш там займацца?**




LETNI
15
15



Вывучы словы песні

Сяржук Сокалаў-Воюш

# Аксамітны летні вечар

Аксамітны летні вечар ахінуў зямлю,
Я вазёрную сінечу вуснамі лаўлю.
Моўчкі слухаю ў росах песню салаўя.
Над маім лунае лёсам Беларусь мая.

А над лесам, над сусветам выпрастаў крыло
Залацісты човен ветах, зорнае вясло.
Стан дзявочы Белай вежы, подых ручая,
Я адной табе належу, Беларусь мая!

Там, дзе гойдае вятрыска залаты мурог,
Паўставалі камяніскі ля тваіх дарог.
Чырванее ранні золак, рэха ў гаях,
А ў грудзях тваіх асколак, Беларусь мая.

Мне краёў чужых ня трэба, як не варажы,
Не хачу чужога хлеба, радасцяў чужых,
Бо чужына сэрца джаліць, цісне, як змяя,
Бо гукае з дальніх даляў Беларусь мая.



# ЗМЕСТ


Тэмы ........ 5
в У нас хапае слоў такіх..., Юрась Свірка ........ 7
т Таленты ў Краснагрудзе, Мікола Ваўранюк ........ 8
г Склад і націск ........ 10
в Сустрэць можна вучня такога, Віктар Швед ........ 11
т Рыфмаванкі ........ 12
т Заўважаная памылка, Вісарыён Гарбук ........ 13
г Правапіс «ў» (нескладовага) ........ 16
т Змяніць хлопца, Міра Лукша ........ 17
в Сяброўства, Віктар Швед ........ 19
т Чырвона-буры верасень прыходзіць, Сяргей Махнач ........ 20
п Пахне чабор, Пятрусь Броўка ........ 22

Тэмы ........ 23
т Восень, Янка Галубовіч ........ 25
т Неслух, Алесь Якімовіч ........ 26
г Звонкія і глухія зычныя ........ 28
т Кастрычнік, Клаўдзія Каліна ........ 29
т Апрацоўка льну, Ганна Кандрацюк ........ 30
в Песні ткуцца, Мікола Маляўка ........ 31
т Ткацкія вырабы, Ганна Кандрацюк ........ 33
т Адзенне і абутак, Ганна Кандрацюк ........ 34
г Цвёрдыя, мяккія і зацвярдзелыя зычныя ........ 35
в Пяць пальцаў на руцэ, Віктар Швед ........ 36
п Лянок ........ 38

Тэмы ........ 39
т Дзяды – беларускі народны абрад, Алесь Барскі ........ 41
в Я нарадзіўся беларусам, Віктар Швед ........ 43
в Беласточчына, Віктар Швед ........ 44
г Падоўжаныя зычныя ........ 45
т Вывучайце гісторыю, Сяргей Тарасаў ........ 46
т Па колішніх слядах, Мікола Гайдук ........ 48
г Прыстаўныя гукі ........ 51
в Мой родны горад, Надзея Артымовіч ........ 52
т Стылістычныя сродкі, паводле Людмілы Цітовай ........ 54
в Беласток, Віктар Швед ........ 56
п Родны мой горад, Уладзімір Някляеў ........ 58

Тэмы ........ 59
т Вусная народная творчасць. Народныя казкі, паводле Людмілы Цітовай ........ 61
т Музыкі, апрацоўка Якуба Коласа ........ 63
т Не сіла, а смеласць, апрацоўка Алеся Якімовіча ........ 66
т Таямніца густога лесу, або З чаго ўсё пачалося, Надзея Ясмінская ........ 70
г Амонімы ........ 72
т Легенды, паводле Людмілы Цітовай ........ 73
т Пра камень у Валілах ........ 74
г Сінонімы ........ 76
т Загадкі, паводле Людмілы Цітовай ........ 77
г Антонімы ........ 79
т Прыказкі, паводле Людмілы Цітовай ........ 80
п Песенька палахлівага Зайца, Леанід Дранько-Майсюк ........ 81

Тэмы ........ 83
т Цацкі, Міра Лукша ........ 85
г Адушаўлёныя і не адушаўлёныя, агульныя і ўласныя назоўнікі ........ 87
в Каляда, Міхась Андрасюк ........ 88
п Коледа! ........ 89
т Міфы, паводле Людмілы Цітовай ........ 90
т Пра багоў, паводле Людмілы Цітовай ........ 92
г Род і лік назоўнікаў ........ 95
т Пра міфічных істот, паводле Людмілы Цітовай ........ 96
т Як у казцы, Янка Купала ........ 101
п Літвін, Зміцер Сасноўскі ........ 104

**Тэмы** ........ 105
в Вадзянік, Максім Багдановіч ........ 107
т Пра сяброўства вадзяніка і лесуна, Наталля Бучынская ........ 108
г Скланенне назоўнікаў ........ 112
т Маскарад, Рыжая, Міра Лукша ........ 113
т Зімой, Максім Багдановіч ........ 117
г Нескланяльныя назоўнікі ........ 118
т Валянцінкі, Міра Лукша ........ 119
в Уцякала зіма ад вясны, Рыгор Барадулін ........ 121
п Залюляю, як кахаю, Уладзімір Някляеў ........ 122

**Тэмы** ........ 123
т Чаму, Алеся Станюк ........ 125
г Родны, давальны, вінавальны склоны назоўнікаў ........ 127
в Са святам, Ніна Мацяш ........ 128
т Жаўрук, Уладзімір Ягоўдзік ........ 129
г Творны, месны склоны назоўнікаў ........ 131
в Матуля вучыла сына, Віктар Швед ........ 132
г Правапіс «не» «ня» з назоўнікам ........ 133
в Мая граматыка, Віктар Гардзей ........ 134
т Салодкі кляновік, Янка Галубовіч ........ 135
п Пагоня, Максім Багдановіч ........ 138

**Тэмы** ........ 139
т Народныя песні, паводле Людмілы Цітовай ........ 141
п Положу кладку ........ 144
г Неазначальная форма дзеясловаў ........ 145
в Калыханка, Віктар Швед ........ 146
г Лік і час дзеясловаў ........ 147
п Валачобныя песні ........ 148
г Асоба дзеясловаў ........ 150
т Падслуханая казка, Андрэй Федарэнка ........ 151
п Вожык-патрыёт, Андрэй Хадановіч ........ 156

**Тэмы** ........ 157
т Як нарадзілася Мышка Пік-Пік, Міра Лукша ........ 159
т Мышка Пік-Пік прыбірае норку, Людміла Рублеўская ........ 160
т Рок-грак, Міра Лукша ........ 162
г Род і лік прыметнікаў ........ 164
т У тэатры, Сяргей Докіш ........ 165
т Каму нашкодзіў Вірус Шкодзя, Анатоль Бутэвіч ........ 167
г Скланенне прыметнікаў ........ 170
т Як мы ў пяць секцый хадзілі, Леанід Дайнека ........ 171
в Мы спрачаемся, паводле Эдзі Агняцвет ........ 175
т Касманаўт, Клаўдзія Каліна ........ 177
п Там по маёвуй росі ........ 180

**Тэмы** ........ 181
т Змяюка пад камянюкай, Тамара Бунта ........ 183
т Выбары, Міра Лукша ........ 185
г Лічэбнік ........ 187
в Белае Падляшша, Міхась Андрасюк ........ 188
т Чорным па белым ........ 189
в Вадасховішча, Віктар Швед ........ 191
г Прыслоўе ........ 193
т Сцяжынка, Рыгор Ігнаценка ........ 195
п Аксамітны летні вечар, Сяржук Сокалаў-Воюш ........ 198